Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

26 ЛЮТАГА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 36
(26394)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Беларусь будзе пашыраць супрацоўніцтва з Кувейтам ва ўсіх сферах

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў імкненне Рэспублікі Беларусь да ўмацавання дружалюбных адносінаў і далейшага пашырэння плённага супрацоўніцтва з Дзяржавай Кувейт ва ўсіх сферах. Аб гэтым гаворыцца ў віншаванні з нагоды Нацыянальнага дня Кувейта, якое Прэзідэнт Беларусі ад імя беларускага народа і сябе асабіста накіраваў Эміру Дзяржавы Кувейт, шэйху Сабаху аль-Ахмеду аль-Джаберу аль-Сабаху і Наследнаму прынцу Дзяржавы Кувейт, шэйху Навафу аль-Ахмеду аль-Джаберу аль-Сабаху.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У Беларусі захаваецца ўзважаны падыход да цэнаў на лекі

Аб гэтым заявіў журналістам прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі ў ходзе наведвання РУП «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў».

«Цяпер цэны на беларускія лекі на ўнутраным рынку ў 4,5-5 разоў ніжэйшыя, чым на замежныя аналагі, — канстатаваў Сяргей Сідорскі. — Нейкі час мы праводзілі палітыку стрымлівання цэнаў на лякарствы, і мы прадоўжым яе па сацыяльных праграмах для насельніцтва, якое карыстаецца льготамі».

БЕЛТА.

МТС зніжае тарыфы

Кампанія МТС зніжае тарыфы да ранейшага ўзроўню, паведамілі ў прэс-службе аператара сотавай сувязі. Тарыфікацыя паслуг будзе ажыццяўляцца па ўзроўні тарыфаў, якія дзейнічалі да змяненняў, з 23.00 25 лютага гэтага года.

БЕЛТА.

Карупцыйных злачынстваў паменшала

На калегіі Генеральнай пракуратуры былі разгледжаны пытанні выканання заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй.

Паводле слоў намесніка генеральнага пракурора Віктара КОНАНА, у цэнтры ўвагі — пытанні барацьбы з карупцыяй у цэлым і хабарніцтвам у прыватнасці. Апошняе, дарэчы, у структуры карупцыйнай злачыннасці складае каля 30 працэнтаў. Значная доля падобных злачынстваў прыпадае на раскраданне шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі і на службовыя падлогі. Адзінкавыя выпадкі — перавышэнне службовых паўнамоцтваў ці атрыманне незаконнага ўзнагароджання. У адной з гучных крымінальных спраў, якая расследуецца пракуратурай Гомельскай вобласці, фігуруе хабар у памеры 160 тысяч долараў. Другая крымінальная справа мае дачыненне да Магілёўскага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры, кіраўнік якога за атрыманне хабару ў памеры 45 тысяч долараў атрымаў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 11 гадоў.

Судовая практыка па крымінальных справах паказвае, што 60 працэнтаў хабарнікаў асуджаюцца да пазбаўлення волі, каля 20-і — да абмежавання волі, іншыя асобы нясуць пакаранне ў выглядзе папраўчых работ.

Наогул летась выяўлена 2 735 карупцыйных злачынстваў, што на 11 працэнтаў менш, чым у папярэднім годзе. Такая тэндэнцыя захоўваецца і на пачатку гэтага года. Па выніках антыкарупцыйных праверак органамі пракуратуры ў мінулым годзе былі ўзбуджаны 82 крымінальныя справы. Напрыклад, пракурорам Маскоўскага раёна г. Брэста ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара Брэсцкага хакейнага клуба. У палове выпадкаў нагодай да ўзбуджэння крымінальнай справы становяцца заявы грамадзян і паведамленні службовых асобаў дзяржорганаў, прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый. У больш як 40 працэнтах выпадкаў мае месца непасрэднае выяўленне органам крымінальнага пераследавання звестак, якія ўказваюць на прыкметы злачынства.

Найбольшая колькасць карупцыйных злачынстваў выяўлена ў гандлі, прамысловасці, органах дзяржаўнага кіравання, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, ахове здароўя. Зніжэнне карупцыйнай злачыннасці ў параўнанні з 2007 годам назіраецца ў фінансава-крэдытнай галіне, сельскай гаспадарцы, гандлі. Рост зафіксаваны ў галіне культуры, навукі, адпачынку і турызму, аховы здароўя, адукацыі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Аграгурызм можа дапамагчы мінімізаваць наступствы крызісу для эканомікі краіны

Пра гэта ўчора заявіў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур на другой спецыялізаванай канферэнцыі «Аграгурызм у Рэспубліцы Беларусь — стан і перспектывы развіцця», якая прайшла ў Белаграпрамбанку. Для таго, каб развівацца незалежна ва ўмовах сусветнага крызісу, аграгурызм мае тры асноўныя перадумовы. Першая — ён забяспечвае самазанятасць насельніцтва. Другая. Як і любая турыстычная сфера, аграгурызм не патрабуе вялікіх капіталаўкладанняў. Яна зводзіць да мінімуму фінансавыя рызыкі ў крэдытаванні, і нарэшце аграгурызм у сваёй дзейнасці не патрабуе дадатковых выдаткаў. Чалавек прадстаўляе тое, што ўжо мае: прыроду, жыллё, натуральную ежу. Усе гэтыя элементы аб'ектыўна не залежаць ад наяўнасці крызісу. Увогуле краіны, якія маюць такі прыродны прадукт, як Беларусь, заўважыў намеснік міністра, пры пэўным развіцці даюць дзяржаве 7—10 працэнтаў валавога ўнутранага прадукту, дзякуючы толькі турыстычнай сферы. Турызм — гэта вельмі перспектыўны напрамак, таму дзяржава надае галоўную ўвагу яго развіццю і аграгурызму ў прыватнасці. Андрэй Тур прапанаваў удзельнікам канферэнцыі сфармуляваць асноўныя прапановы ў План першачарговых мерапрыемстваў па лібералізацыі ўмоў ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці ў 2009 годзе.

Летась у аграсядзібах беларусы пакінулі больш за 300 млрд беларускіх рублёў, а іншаземцы — больш за 100 млн долараў. Гэта грошы, якія па-сутнасці пайшлі на развіццё беларускай вёскі і павышэнне дабрабыту яе жыхароў. «Нездарма, — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Іван Бамбіза, — аграсядзібы ярка вылучаюцца сваёй прыгажосцю і эстэтыкай і падцягваюць да свайго ўзроўню іншыя сядзібы ў той мясцовасці, дзе знаходзяцца».

«Іншаземцы знаходзяць у беларускіх вёсках тое, чаго няма больш нідзе, — сказаў намеснік міністра спорту і турызму Часлаў Шульга, — звычаі, традыцыі, аўтэнтычнасць. Таму нацыянальная праграма развіцця турызму вялікую ўвагу надае аграгурызму».

Сярод значных мераў дзяржаўнай падтрымкі гэтай сферы дзейнасці — нулявая стаўка падатку на дабаўленую вартасць для экскурсійна-турыстычных паслуг і ўнутрырэспубліканскіх маршрутаў, ільготныя ўмовы дзейнасці гаспадарам аграсядзібаў.

Учора на другой спецыялізаванай канферэнцыі «Аграгурызм у Рэспубліцы Беларусь — стан і перспектывы развіцця» былі аб'яўлены вынікі першага рэспубліканскага конкурсу «Лепшая сядзіба года». Гран-пры атрымала сядзіба «Над Нёманам» (Лідскі раён). У намінацыі «Гасціннасць» перамагла сядзіба «На Зарэчнай вуліцы» (Кобрынскі раён). Лепшымі «зялёнымі» сядзібамі былі прызнаны «Кролава хата» (Расонскі раён) і «Дакудава» (Лідскі раён). У намінацыі «Стыль і гармонія» лепшай стала сядзіба «Вязынка» (Маладзечанскі раён), у намінацыі «Здаровы лад жыцця» — сядзіба «Пясчаны бераг» (Быхаўскі раён). У намінацыі «За захаванне беларускіх традыцый» бясспрэчным лідарам стала сядзіба «Прыазёрная» Лепельскага раёна.

Газета «Звязда» як інфармацыйны спонсар конкурсу сваімі дыпломамі і памятнымі падарункамі адзначыла сядзібы «Гусарская» (Расонскі раён), «Сваякі» (Астравецкі раён) і «Мічуркі» (Бялыніцкі раён).

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Адкажа і той, хто... побач?

З 2004 года ўзровень траўматызму са смяротным зыходам зменшыўся з 0,065 да 0,051 выпадка на кожную тысячу грамадзян Беларусі, якія працуюць. Разам з тым праблема аховы працы застаецца па-ранейшаму актуальнай. Як паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валяр'ян Кароль, летась у краіне не вярнуліся з працы дадому 207 чалавек.

Пры гэтым паляпшэнне сітуацыі з вытворчым траўматызмам назіраецца не паўсюль. У параўнанні з 2007 годам павялічылася колькасць няшчасных здарэнняў са смяротным зыходам у сельскай гаспадарцы, арганізацыях Беллеспаперапрама, спажывецкай кааперацыі. Аднак найбольш небяспечнай галіной застаецца будаўніцтва. На яго прыпадае трэць ад усіх смяротных інцыдэнтаў пры тым, што ў будаўніцтве занятыя ўсяго 8 працэнтаў ад агульнай колькасці работнікаў краіны. Асноўнай прычынай няшчасных выпадкаў на вытворчасці становіцца так званы «чалавечы фактар», і ў тым ліку — п'янства. Калі ў 2007 годзе «пад градусам» знаходзіліся 35,4 працэнта грамадзян, што загінулі на працоўных месцах, то летась — ужо 40 працэнтаў. Не нашмат палепшыўся гэты паказчык і ў сёлетнім студзені — 37 працэнтаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Антыкрызісная эканоміка

ТАННЕЕ ЖЫЛЛЁ Ў СТАЛІЦЫ

Рэальны кошт квадратнага метра знізіўся да 1.400-1.500 USD

Менавіта ў другой палове лютага прадаўцы кватэр на другасным рынку жылля сталіцы пачалі масава зніжаць свае стартавыя цэннікі. Смелыя прагнозы спецыялістаў рынку нерухомасці аб хуткім абвале цэнаў істотна актывізавалі гэты працэс. Дырэктар Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ адзначае, што ўжо на працягу 4 апошніх месяцаў назіраецца павелічэнне колькасці прапаноў кватэр на продаж, а рэальных пакупнікоў амаль няма.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З'явіліся аднапакаёўкі па 40 тысяч USD

Эксперты па жыллёвай нерухомасці адзначаюць, што менавіта зараз тэндэнцыя на патанненне кватэр набірае сур'ёзныя абароты. Яшчэ тры тыдні таму распрацоўшчыкі статыстыкі інфармацыйнага каталога цэнаў на кватэры адзначалі зніжэнне кошту квадратнага метра прыкладна на 30 долараў за тыдзень. Цяпер за тыдзень жыллёвы квадрат пачаў таннець з хуткасцю каля 40—45 долараў. Хутчэй за ўсё цэннікі зніжаюцца на кватэры ў старых пяціпавярховых дамах спальных раёнаў, а таксама па ўсіх відах жылля ў новых мікрараёнах на ўскрайку Мінска і ў Шабанах. Калі статыстыка вызначае сярэдні кошт аднапакаёвых кватэр на ўзроўні 60—63 тысяч долараў, то невялікія аднапакаёвыя «хрушчоўкі» з агульнай плошчай да 32 квадратных метраў ужо з'явіліся ў прадажы па 40—43 тысячы долараў. Сёння ў гарадскім каталогу жыллёвай нерухомасці пакупнікам прапануюцца кватэры ад 9 тысяч варыянтаў кватэр на продаж ці абмен.

Самая вялікая колькасць прапаноў прыпадае на невялікія па плошчы двухпакаёвыя кватэры са старой планіроўкай. На такія кватэры цэны знізіліся больш за ўсё. Цяпер самыя слабенькія па якасці двухпакаёўкі з агульнай плошчай да 44 квадратных метраў можна знайсці ўжо і за 56—58 тысяч долараў. Галоўным чынам двухпакаёвыя кватэры ў дзевяціпавярховых дамах прапануюцца пакупнікам па кошце ад 65 да 75 тысяч долараў. Існуюць на рынку і дарагія двухпакаёўкі за 80—100 тысяч долараў, дзе квадратны метр агульнай плошчы ацэньваецца амаль у дзве тысячы долараў, аднак... Багатых пакупнікоў сёння на рынку ўвогуле няма, таму кватэры па такім кошце спецыялісты лічаць упэўненымі «вісякамі», якія не будуць прададзены ніколі. Увогуле агенцтвы нерухомасці адзначаюць, што ў апошнія 2 месяцы працуюць амаль ухапістую, бо сёлета яны афармляюць не больш за 1—2 здзелкі куплі-продажу кватэр у месяц. Патэнцыйныя пакупнікі пачынаюць больш актыўна цікавіцца кватэрамі з коштам квадратнага метра, не большым за 1400—1500 долараў. Аднак і на такое жыллё пакупнікі чакаюць зніжак з боку гаспадароў кватэр у памеры не менш як 2—3 тысячы долараў.

«Надвор'е» на рынку робяць забудоўшчыкі долевага жылля

Эксперты «Звязды» яшчэ летась прагназавалі сітуацыю на жыллёвым рынку сталіцы, дзе цэнасныя тэндэнцыі на другасным рынку жылля павінны былі непасрэдна залежаць ад узроўню патаннення долевага будаўніцтва для масавага пакупніка. Сёння мы назіраем менавіта такую сітуацыю. Буйныя агенцтвы сталіцы гэтымі днямі пачалі актыўна рэкламаваць будучае жыллё ад забудоўшчыкаў, якія працуюць па долевым механізме. Напрыклад, агенцтва нерухомасці «БЕЛНТН» прапаноўвае кватэры ў 20-павярховым доме па праспекце Ракасоўскага, квадратны метр якіх каштуе 1300 долараў. У доме пабудавана ўжо 8 паверхаў, і здадзены ён будзе сёлета ў трэцім квартале. У мікраёне Лошыца-3 па долевым будаўніцтве каркасна-блочнага жылога дома кліентам прапаноўваюць заключаць дагавор, дзе квадратны метр жылля мае фіксаваны кошт у межах 3,5 мільёна рублёў. На першасным рынку жылля цяпер існуюць і больш цікавыя па цане прапановы ад забудоўшчыкаў па долевым метадзе, калі квадратны метр будзе каштаваць у межах 1100—1200 долараў, аднак... Тут гаворка ідзе пра дамы, якія будуць здадзены ў 2011 годзе.

На фоне патаннення жыллёвага квадрата ад структур долевага будаўніцтва ў Мінску існуюць і не зусім зразумелыя выключэнні наяўнай тэндэнцыі. У сталіцы стаяць каля 5 пустых шматпавярховых дамоў, дзе кватэры прапаноўваюцца па кошце квадратнага метра агульнай плошчы ад 1700 да 2100 долараў. Такімі пустымі дамамі днямі нават зацікавіўся кіраўнік нашай дзяржавы, які даручыў адпаведным структурам на працягу квартала вырашыць праблему гэтага жыллёвага парадокса. Жыллё не павінна пуставаць у горадзе, дзе на ўліку грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў стаяць больш за 250 тысяч сем'яў.

Сяргей КУРКАЧ.

(Працяг тэмы на 2-й стар.)

Самавольства начальнікаў, грашовыя пытанні, незаконнае прадпрымальніцтва

Гэтыя тэмы сталі асноўнымі на «прамой лініі», якую старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Зянон Ломаць правёў 25 лютага з жыхарамі Магілёўскай вобласці.

«Прамыя лініі» — традыцыйная форма працы КДК. Яны маюць на мэце даць магчымасць кожнаму чалавеку з глыбінкі кантактаваць з афіцыйнымі асобамі.

На «прамой лініі» ў Магілёве зарэгістраваны 3,8 тысячы спробаў датэлефанавацца: просьбы 110 заяўнікаў зафіксаваны, 45 асабіста гутарылі з Зянонам Ломацем.

— Паводле некаторых фактаў, пра якія паведамілі грамадзяне, мы правядзём аператыўныя мерапрыемствы, — паабяцаў кіраўнік КДК. — Калі інфармацыя пацвердзіцца, то, я ўпэўнены, будуць распачаты крымінальныя справы за няўплату падаткаў і незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

У адрозненне ад ранейшых «прамых ліній», стала менш скаргаў на працу камунальных службаў, з чаго Зянон Ломаць зрабіў аптымістычную выснову аб паляпшэнні іх працы. Аднак уразіла тэлефанаванне з адной вёскі: жанчына, якая 40 гадоў адпрацавала на ферме ў гаспадарцы, паскардзілася на неўладкаванасць жылля. Сялянка расказала, што жыве ў старым двухпавярховым доме з драўлянымі перакрыццямі. У ім ледзь не абваліліся драўляныя столі — дом яшчэ дзясятак гадоў таму быў зношаны амаль на 90%. Бабуля плакала, што калі ходзіць па падлозе, то адчувае сябе нібыта на арэлях. Між тым, на другім паверсе жывуць тры сям'і і штодня баяцца праваліцца.

Даволі шмат тэлефанаванняў былі прысвечаны самавольству начальнікаў: людзі скардзіліся на чыноўнікаў і яшчэ больш — на кіраўнікоў прадпрыемстваў. Работнік аднаго з невялікіх прыватных прадпрыемстваў паведаміў, што парушаюцца правы рабочых з-за блытаніны з водпускамі і грашовымі выплатамі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Аўтааматар

АЎТО Ў КРЭДЫТ.

ВЫБАР ТОЛЬКІ З ВАЛЮТНЫХ...

З пачатку года продажы новых аўтамабіляў у Беларусі скараціліся практычна на чвэрць. Пэўнае зацішша назіраецца і на рынку патрыманых іншамарак. У якасці адной з асноўных прычын гэтага эксперты называюць істотнае падаражанне крэдытаў і некаторыя цяжкасці з іх атрыманнем, бо выкласці адразу ўсю суму за аўто сваімі грашыма па-ранейшаму могуць не многія. У студзені «Звязда» праводзіла пэўны маніторынг сітуацыі, што склалася з атрыманнем крэдытаў на аўто. Днямі больш падрабязны аналіз правёў партал infobank.by

Адразу кідаецца ў вочы, што ў параўнанні з мінулым студзенем да сярэдзіны лютага адбылося пэўнае зніжэнне працэнтных ставак. Праўда, па рублёвых крэдытах зніжэнне адбылося толькі ў БПС-Банку і ўсяго на 1 працэнт. Такім чынам стаўкі ўсталяваліся на ўзроўні 27-28 працэнтаў у рублях.

Акрамя таго, прапаноў па рублёвых крэдытах на аўтамабілі засталося зусім не шмат — літаральна ў двух банках (Белінвестбанку і БПС-Банку). А вось пералік фінансавых установаў, якія даюць крэдыты ў валюце, пашыраўся. У барацьбу ўключыліся некаторыя банкі, якія летась напрыканцы года прыспынілі свае крэдытныя праграмы. Узровень ставак па валютных крэдытах таксама крыху знізіўся — у сярэднім складаюць ад трох да двух тыдняў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ГАЛАНДЫІ РАЗБІЎСЯ ТУРЭЦКІ АВІЯЛАЙНЕР: СА 134 ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛІ ДЗЕВЯЦЬ

Пры пасадцы ў аэрапорце Амстэрдама разбіўся пасажырскі самалёт «Турэцкіх авіялініі», на борце якога знаходзіліся 134 чалавекі. Як паведамляецца, лайнер Boeing 737-800 упаў на поле побач з ажыўленай аўтатрасай і разваліўся на тры часткі. У самалёце ў гэты момант было 127 пасажыраў і сем членаў экіпажа.

У выніку цвёрдай пасадкі загінулі дзевяць чалавек, сярод іх шэсць пасажыраў і тры члены экіпажа. Каля 50 чалавек атрымалі сур'ёзныя раненні. Паводле інфармацыі Медыцынскага цэнтра Амстэрдама, сем чалавек дастаўленыя ў бальніцу ў крытычным стане. Каля 50 чалавек не пацярпелі.

Нагадаем, што адразу пасля катастрофы міністр транспарту Турцыі і «Турэцкія авіялініі» запэўнівалі, што не загінуў ніхто. Большасць людзей атрымалася выратаваць дзякуючы майстэрству пілота, прыводзяць інфармагенцтвы словы намесніка міністра транспарту. Адзін з лётчыкаў, якія знаходзіліся на зямлі і былі сведкамі катастрофы, асабліва адзначыў, што гаворка ідзе не аб падзенні лайнера, а аб «кантраляванай аварыйнай пасадцы». Паводле яго меркавання, пілот накіраваў самалёт на разараное поле пасля таго, як нечакана рэзка зменшылася цяга рухавікоў.

З 127 пасажыраў 52 чалавекі не з'яўляюцца грамадзянамі Турцыі, іх грамадзянства ўдакладняецца. Паводле некаторай інфармацыі, самалёт быў у добрым стане. Прычынай катастрофы магло стаць надвор'е. Разам з тым, прадстаўнікі аэрапорта ацанілі пагодныя ўмовы ў раёне аэрапорта як «нармальныя». Таксама, паводле інфармацыі галандскага тэлебачання, улады не разглядаюць версію тэракта.

МАСАВЫЯ БЕСПАРАДКІ ВА УКРАІНЕ МОГУЦЬ ПАЧАЦЦА ЎЖО ЎВЕСНУ?

Панічныя настроі насельніцтва Украіны, выкліканыя эканамічным становішчам, якое пагаршаецца, могуць перарасці ў масавыя беспарадкі ўжо ў сярэдзіне вясны.

Такі прагноз агучыў кіраўнік камітэта Вярхоўнай Рады па пытаннях нацыянальнай бяспекі і абароны, экс-кіраўнік міністэрства абароны краіны Анатоль Грыцэнка на прэс-канферэнцыі ў Сімферопалі. Паводле яго словаў, ва Украіны застаўся «мінімальны запас трываласці», і хуткім часам, калі кіраўніцтва дзяржавы не распачне кансалідаваных дзеянняў, краіну можа накрыць хваля пратэстных акцый, паведамляе «Новы рэгіён».

САМЫМІ ЧЫСТЫМІ ГАРАДАМІ ЕЎРОПЫ ПРЫЗНАНЫЯ СТАКГОЛЬМ І ГАМБУРГ

Камісія ЕС прызнала Стакгольм і Гамбург «зялёнымі сталіцамі» Еўропы ў рамках абвешчанай ініцыятывы па абароне навакольнага асяроддзя. Так, сталіца Швецыі будзе насіць гэтае званне на працягу 2010 года, а другі па велічыні горад Германіі — у 2011 годзе. Акрамя Стакгольма і Гамбурга на атрыманне звання самага чыстага горада прэтэндавалі Амстэрдам, Брыстоль, Капенгаген, Осла, Фрайбург і Мюнстэр.

«Прамая лінія»

КАЛІ БАЛЯЦЬ СУСТАВЫ...

Захворванні суставаў сёння настолькі распаўсюджаныя, што іх можна лічыць адной з характэрных прыкмет часу. Як праяўляюцца астэаартрозы і астэапарозы, артрыт і рэўматызм? Якія метады іх лячэння і прафілактыкі існуюць сёння? Як аднаўляцца пасля перанесенай паталогіі на апорна-рухальным апараце? Пра гэта вы можаце спытаць у **доктара медыцынскіх навук, прафесара кафедры кардыялогіі і рэўматалогіі БелМАПА Тамары Дзмітрыеўны ЦЯБУТ.**

«Прамая лінія» адбудзецца **3 сакавіка з 15.00 да 16.00 па тэлефонах 8(017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8(017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).**

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ПЕНСІЯ ПА ЎЗРОСЦЕ Ў ЛЮТЫМ — 408,9 ТЫСЯЧЫ

Паводле апошніх звестак Мінэканомікі, сярэднямесячны памер пенсіі па ўзросце ў студзені гэтага года павялічыўся ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам на 18,2 працэнта, у студзені-лютым адпаведна — на 14,8 працэнта і склаў у студзені — 408,3 тысячы рублёў, у студзені-лютым — 408,6, у тым ліку ў лютым — 408,9 тысячы рублёў.

Як адзначылі ў міністэрстве, сярэднямесячны памер мінімальнай пенсіі па ўзросце павялічыўся ў студзені гэтага года ў параўнанні з адпаведным леташнім месяцам на 19,3 працэнта, у студзені-лютым адпаведна на 16,4 працэнта (па прагнозе — 14,5 працэнта) і склаў у студзені — 226,5 тысячы рублёў, у студзені-лютым — 228,3 тысячы, у тым ліку ў лютым — 230,1 тысячы рублёў. Што датычыцца сярэднямесячнага памеру дзяржаўнага сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, то ў студзені ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года ён павялічыўся на 21,1 працэнта (па прагнозе — 13,9) і склаў 179,8 тысячы рублёў; памер дзярждапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей пасля трох гадоў, таксама павялічыўся на 21,1 працэнта і склаў 67,4 тысячы рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

ХЛОПЧЫКАЎ БОЛЬШ

Маладыя бацькі з Першамайскага раёна аддаюць перавагу такім імёнам для нованароджаных, як Аляксей і Дар'я.

Аб гэтым паведаміла начальнік аддзела ЗАГСа адміністрацыі Першамайскага раёна Станіслава Макарэвіч. Паводле слоў суразмоўцы, у лік найбольш папулярных імёнаў таксама ўваходзяць Максім, Кацярына, Арцём, Марыя, Мікіта, Паліна, Дзмітрый і Ксенія.

У мінулым годзе ў гэтым раёне зарэгістравана на паўтары сотні нованароджаных больш, чым у 2007 годзе. Хлопчыкаў традыцыйна нарадзілася больш, чым дзяўчынак — 1197 і 1057 адпаведна.

Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».

НА ДРЭВА — ПА ДРОВЫ. А З ДРЭВА —?..

Жыхар пасёлка Хвоенск, што ў Жыткавіцкім раёне, днём пайшоў па дровы для гаспадаркі. Відаць, ламачча яму было недастаткова, таму мужчына забраўся на дрэва. Адкуль і зваліўся.

Добра, што ў яго быў мабільны тэлефон, па якім ён паведаміў у сям'ю, што з ім адбылося няшчасце. На дапамогу кінуліся мясцовыя жыхары і выратавальнікі. Першым няшчаснага ўдалося знайсці аднавяскоўцам. Здабытчык драўніны шпіталізаваны ў Жыткавіцкую бальніцу са шматлікімі пераломамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КУРСАНТ АЎТАШКОЛЫ ВЫЕХАЎ НА СУСТРЭЧНУЮ

У Мінску каля дзесяці гадзін раніцы на Партызанскім праспекце вучэбны аўтамабіль, якім кіраваў 24-гадовы курсант аўташколы, трапіў у дарожна-транспартнае здарэнне.

Паводле звестак аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, вучэбныя «Жыгулі» пры перастраенні з першай на другую паласу руху занесла, і аўтамабіль выехаў на сустрэчную, дзе сутыкнуўся з «Опелем». У выніку здарэння пацярпеў 55-гадовы майстар, які атрымаў чэрапна-мазгавую траўму лёгкай ступені цяжкасці і пералом касцей пальцаў на левай руцэ.

Ігар ГРЫШЫН.

ПАГОНЯ ЗА ВАЙСКОЎЦАМІ

Пры правядзенні прыродаахоўнага рэйду на тэрыторыі паляўнічых угоддзяў Валожынскага раённага таварыства паляўнічых і рыбаловаў паблізу вёскі Люціна работнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі заўважылі аўтамабіль, з якога пры дапамозе фараў вялі пошук дзікай жывёлы.

Вадзіцель на законныя патрабаванні інспектараў спыніцца належным чынам не адрэагаваў. Пакуль за аўтамабілем гналіся, з яго была выкінута самаробная наразная агнястрэльная зброя. Пасля спынення транспартнага сродку былі выяўлены асобы тых, хто знаходзіўся ў аўтамабілі. Імі былі тры вайскоўцы. Пры аглядзе машыны следча-аператыўнай групай Валожынскага РАУС былі знойдзены і канфіскаваны: прыбор начнога бачання ваеннага ўзору, два маскіровачныя халаты белага колеру і два нажы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

$150 — І ПАСВЕДЧАННЕ СТРОПАЛЬШЧЫКА!

Узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да начальніка аддзела віцебскай будаўнічай арганізацыі, які за грошы паабяцаў грамадзяніну выдаць пасведчанне стропальшчыка без праходжання адпаведнага навучання. За сваю паслугу папрасіў 150 долараў. «Зялёныя» ўзяў прама ў сваім службовым кабінеце.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЦЫГАРЭТ НА 25 МІЛЬЁНАЎ

канфіскавалі брэсцкія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі ў грамадзяніна Беларусі.

Праваахоўнікі падчас адпрацоўкі аператыўнай інфармацыі на аўтадарозе Тамашоўка—Брэст спынілі «Крайслер». У аўтамашыне аказаліся 10 тысяч пачкаў цыгарэт «LM» з акцызнымі маркамі Украіны.

Ул. інф.

ПЕНСІЯНЕР-ВАЛЮТЧЫК

На цэнтральным рынку ў Баранавічах увагу аператыўнікаў прыцягнуў пенсіянер, які займаўся продажам валюты. Калі валютчыка затрымалі, то пры ім было больш за 8 млн рублёў, пад 7 тысяч расійскіх і 200 долараў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости»

ИНФОРМИРУЕТ

В извещение о проведении 27 февраля 2009 года 83-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска (газета «Звязда» от 14.02.09 г.) по лоту № 137 во второй графе следует вместо слов «ул. Козлова» **читать — «(около д. 78)».**

УНП 190398583

ГЛХУ «Василевичский лесхоз»

РЕАЛИЗУЕТ за наличный и безналичный расчет:

- доску пола по цене 741 690 руб./м³ с НДС;
- обшивку (вагонка) по цене 817 950 руб./м³ с НДС;
- пиломатериалы твердолиственных пород (дуб, ясень) сорт 2, 3 сухой или естественной влажности.

Доставка по РБ свыше 12 м³ бесплатная.

УНП 490000883

Тел.факс: (8 02340) 6 70 74, тел. 7 44 60, 7 42 94

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.02.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 840,00
1 еўра	3 655,93
1 латвійскі лат	5 144,46
1 літоўскі літ	1 055,27
1 чэшская крона	128,93
1 польскі злоты	782,79
1 расійскі рубель	79,45
1 украінская грыўня	303,50

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	35,7442
10 UAH	38,4140
1000 BYR	12,5816
EUR	45,9670

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісьцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Парламенцкі дзённік

БЯСПЕКА ПА-НОВАМУ

На зімовай сесіі ПА АБСЕ ў Вене дыскутавалі найперш пра бяспеку. Ключавой тэмай для абмеркавання больш як 270 парламентарыяў з 56 дзяржаў стала ініцыятыва, вылучаная прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым аб новай архітэктуры еўрапейскай бяспекі. У сусветнай супольнасці яе прынята называць ініцыятывай Мядзведзева-Сарказі — французскі бок падтрымаў ідэю правядзення маштабнай дыскусіі па гэтай праблеме і арганізацыі саміту.

Беларуская дэлегацыя ў складзе віцэ-спікера Палаты прадстаўнікоў Валерыя Іванова і старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ніны Мазай ініцыятыву па мадэрнізацыі сістэмы еўрапейскай бяспекі падтрымала.

— Існуючая сёння сістэма бяспекі, тыя механізмы і інструменты, якія закліканыя яе забяспечваць, даюць сур'ёзныя збоі. Прыкладам таму з'яўляецца і сітуацыя з дагаворам аб звычайных узброеных сілах у Еўропе, і шэраг канфліктаў на прасторы АБСЕ, якія не ўдалося папярэдзіць ці ўрэгуляваць мірнымі сродкамі. Ініцыятыва зыходзіць з таго, што дзейныя арганізацыі, механізмы руйнавацца не будуць. Размова ідзе пра тое, каб прааналізаваць, чаму яны не спрацоўваюць у цяперашніх умовах і што неабходна зрабіць, каб сфарміраваць юрыдычна абавязальныя для ўсіх дзяржаў-удзельніц інструменты і механізмы, якія б дазвалялі папярэджваць канфлікты, знаходзіць спосабы іх мірнага ўрэгулявання, забяспечваць пастаянны кантроль над узбраеннямі, роўную бяспеку ўсім членам арганізацыі не за кошт бяспекі іншых, што прынцыпова важна, — падкрэсліла Ніна Мазай, знаёмячы журналістаў з вынікамі зімовай сесіі ПА АБСЕ. — Адзін з важных матываў і аднаўленне даверу сярод краін-удзельніц. Таму што адсутнасць даверу — гэта таксама адна з пагроз таго, што мы будзем не ў стане вырашаць ці папярэджваць канфлікты мірнымі сродкамі.

Не абышлося і без тэмы сусветнага фінансавага крызісу. «У выступленнях дэлегацый выказвалася заклапочанасць яго наступствамі, у тым ліку і для сістэмы бяспекі», — узгадала спадарыня Мазай. Аднак глыбокая дыскусія па гэтай праблематыцы чакаецца ў маі — на гэты час запланавана чарговая эканамічная канферэнцыя ПА АБСЕ, якая пройдзе ў Дубліне.

Традыцыйны для парламенцкай асамблеі і разгляд праблем у эканамічнай плоскасці. Падчас работы камітэта па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі беларуская дэлегацыя выступіла па двух тэмах. Па-першае, яна акрэсліла сваё бачанне выканання рэзалюцыі ПА АБСЕ па Чарнобылю. «Як нам уяўляецца, мы знайшлі разуменне ў краін-удзельніц. Тыя, хто браў удзел у дыскусіі ў гэтым камітэце, застаюцца прыхільнікамі рэзалюцыі і гатовыя весці практычную работу», — адзначыла Ніна Мазай. Па-другое, звярнулася да ролі парламента ў выкананні абавязкаў у рамках Канвенцыі па змяненні клімату і Кіёцкага пратакола. «Нам было важна даць поўную інфармацыю аб ходзе ратыфікацыі ў парламентах беларускай папраўкі да Кіёцкага пратакола», — падкрэсліла сенатар. «Наша зацікаўленасць і, я думаю, усіх краін — удзельніц пратакола, у тым, каб гэта папраўка была хутчэй ратыфікавана і мы маглі працаваць разам па дасягненні тых мэтаў, якія ставіў перад сабой пратакол». Палітык нагадала пра заяўлены Беларуссю высокі ўзровень скарачэння выкідаў, які можа быць выкарыстаны ў эканамічных інтарэсах.

Сярод членаў ПА АБСЕ адназначна прасочваецца меркаванне, што ініцыятыва Усходняга партнёрства цікавая і дазваляе пачаць у новай якасці супрацоўніцтва дзяржаў, якія не ўваходзяць у ЕС, з краінамі-ўдзельніцамі — канстатавала Ніна Мазай. «Фармат усходняга партнёрства для нас цікавы, мы спадзяёмся, што ён захаваецца такім, якім яго прадставілі. Мы абазначылі накірункі і тэмы, па якіх гатовыя супрацоўнічаць. І шэраг практычных кансультацый ужо адбыўся — у сферах сельскай гаспадаркі, транспарту, энергетыкі, фінансаў, аховы здароўя». Сенатар нагадала, што пакуль што ініцыятыва абмяркоўваецца і на ўзроўні дзяржаў, і на ўзроўні структур ЕС. Канчатковае рашэнне аб тым, якім будзе Усходняе партнёрства, з якімі ўдзельнікамі — вырашыцца на саміце ў Празе, запланаваным на пачатак мая.

Падчас сесіі парламенцкай асамблеі беларуская дэлегацыя мела магчымасць сустрэцца са старшынёй ПА АБСЕ Жаау Саарэшам, а таксама з Генеральным сакратаром асамблеі Спэнсэрам Оліверам. Праведзеныя і двухбаковыя перамовы з дэлегацыямі Ірландыі, Італіі, Нарвегіі, Польшчы. А сустрэча з рабочай групай ПА АБСЕ па Беларусі дала магчымасць абмеркаваць праграму сумеснага семінару па інвестыцыйнай тэматыцы, які адбудзецца ў беларускай сталіцы 11 сакавіка. Зацікаўленыя асобы абмяркуюць, у прыватнасці, аспекты фарміравання спрыяльнага інвестыцыйнага клімату ў нашай краіне.

Ала МАЧАЛАВА.

Як нас дураць

Асцярожна: аферысты!

У нядзелю нам патэлефанавала жанчына: «Дапамажыце, калі ласка, мяне падманулі нейкія аферысты!». Як высветлілася, у суботні вечар са словамі «мы праводзім акцыю «Шчаслівая сям'я» ў кватэру да пенсіянеркі зайшлі двое: малады мужчына сярэдняга росту ды высокая жанчына з валасамі светлага колеру. Тое, што было далей, можна было аднесці да драматычнай гісторыі пра цыганоў...

— Яны ўдваіх увайшлі ў нашу хату, маўляў, праводзіць акцыю, паводле якой выпадкова выбіраем шэсць кватэраў у выпадковым доме раёна ды прэзентуем іхнім гаспадарам чатыры наборы рознага кшталту тавараў, — распавядае Алена Казіміраўна (імёны зменены — **аўт.**). — Так, гэтая жанчына настолькі хутка распавядала аб гэтых імбрычках, нажах ды прасах, што мы з дзедам ды суседкай, якая была ў нас у гасцях, проста не паспявалі асэнсаваць сказанае.

«Агенты» патлумачылі правядзенне гэтай «бясплатнай» акцыі тым, што нейкая нямецкая фірма, якая толькі-толькі пачынае дзейнічаць на Беларусі, не мае грошай для рэкламавання праз мас-медыйныя сродкі, а таму спадзяецца на «спаднічнае радыё»: жыхары, атрымаўшы «падарункі», самі будуць рэкламаваць прадукцыю сваім суседзям ды знаёмым. Варта сказаць, што ўсе псіхалагічныя прыёмы былі вельмі ўдала выкарыстаны групай аферыстаў, бо сям'я пенсіянераў не проста паабяцала выканаць апошнюю просьбу «агентаў», але і фактычна набыла прапанаваную прадукцыю.

— Яны сказалі, што ў краіне дзейнічае нейкі новы закон, згодна з якім спажыўцы павінны самі выплачваць падаткі з тавару, — працягвае Алена Казіміраўна. — А таму, паколькі сума, якую яны называлі, была крыху большай за 1 мільён рублёў, дык нам трэба было ў гэты самы момант заплаціць ім 20 % ад яе — 207 тысяч. Узамен грошай, якія мы аддалі, яны прапанавалі нам 50-працэнтную зніжку на ўсе тавары іхняй фірмы, якія мы зможам атрымаць на прэзентацыі апошняй на Ракаўскім кірмашы ў панядзелак. Мы нават і не заўважылі, як яны выйшлі за дзверы з нашымі грашыма — усё адбывалася, як у сне.

Калі ж гаспадары пачалі разгортваць «падарункі», дык сон імгненна растаў, бо высветлілася, што большасць з іх былі пашкоджаныя: з драпінамі ды іншым бракам. Мала таго, высветлілася, што і аніякай прэзентацыі на Ракаўскім кірмашы не было, таму Алена Казіміраўна і зрабіла выснову наконт сутнасці «прадстаўнікоў» фальшывай фірмы. Мы вырашылі праверыць, хто і як дурыць даверлівых грамадзян. А для гэтага перш-наперш варта было даведацца аб сапраўдных коштах прадукцыі. Так, абышоўшы тры мінскія кірмашы і не знайшоўшы ніякіх падобных тавараў, давялося адно пачуць ад гандляроў: «Такім ужо даўно ніхто не займаецца»... Але ўсё ж праз некаторы час адпаведныя кошты знайшліся. Так, паводле версіі «агентаў», чайнік «Эўрыка» RR-999 каштаваў 350 тысяч рублёў, а сапраўдны яго кошт быў 47 тысяч рублёў; калі ж, з іх словаў, тузін нажоў «KaiserHoff» KH-180 каштаваў 50 долараў, дык рыначны кошт (улічваючы, што нажы гэтай маркі на Беларусі не прадаюць увогуле) быў у пераліку 19.920 рублёў. Інфармацыю па астатніх двух таварах з-за даўняй даты вытворчасці знайсці так і не ўдалося, але, паколькі значна навейшыя мадэлі каштуюць таксама ў гэтым жа дыяпазоне, дык і тыя былі б яшчэ таннейшыя.

Гэтыя несумленныя людзі падманулі пенсіянераў на 100 тысяч у лепшым выпадку:

— Мы аддалі палову нашай з дзедам пенсіі... На што нам цяпер жыць?

Будзьце пільнымі і не трапляйце ў рукі аферыстаў!

Мікола ТАМАШЭВІЧ.

ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло»

220073, г. Минск, ул. Пинская, 18

ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 9 марта 2009 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.30 до 15.45.

Повестка дня:

«Об уменьшении уставного фонда ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» путем снижения номинальной стоимости акций Общества».

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 3 марта 2009 г. в приемной Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

УНП 100010116. Наблюдательный совет ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».

ДРУГАСНАЕ ЖЫЛЛЁ Ў РЭГІЁНАХ ДА ЛЕТА МОЖА ПАТАННЕЦЬ ЯШЧЭ НА 20 ПРАЦЭНТАЎ

Усе знакавыя тэндэнцыі па змяненні цэнаў жыллёвай нерухомасці спачатку пачынаюць дзейнічаць у сталіцы. На гэты раз паслянавагодняя дэвальвацыя і маштабныя наступствы сусветнага фінансавага крызісу закранулі другасны рынак жылля заходняга рэгіёна краіны ўжо ў другой палове студзеня. Праўда, патаннене кватэр там цяпер неяк прыпынілася, а вось рынак другаснага жылля ўсходняга рэгіёна сапраўды абваліўся менавіта ў трэцяй дэкадзе лютага.

Віцебскія кватэры за месяц патаннелі мінімум на 5—6 тысяч долараў

Яшчэ месяц таму ўладальнікі кватэр гэтага абласнога цэнтра выстаўлялі сваё жыллё на продаж па леташнім цэнніку і былі ўпэўненыя, што пакупнікі адшукаюцца. Аднак пасля таго, як кватэры пачалі даволі шпарка таннець на другасным рынку сталіцы, то і тутэйшыя гаспадары «лішніх» кватэр знізілі стартавы кошт сваіх жыллёвых квадратаў.

Паводле інфармацыі **дырэктара Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Дзяржаўнае агенцтва нерухомасці г. Віцебска» Уладзіміра КАБАНАВА,** за апошні месяц істотна знізіліся нават стартавыя цэны ў ліквіднай цэнтральнай частцы гэтага абласнога цэнтра. Калі яшчэ ў студзені стандартныя якасныя аднапакаёвыя кватэры ў Віцебску па максімуме прапаноўваліся за 36—35 тысяч долараў, то цяпер адносна новыя аднапакаёўкі з новай планіроўкай выстаўляюцца на продаж за 28—30 тысяч долараў. У старых дамах вялікая колькасць прапаноў па аднапакаёвых «хрушчоўках», якія маюць стартавы кошт ад 23 да 25 тысяч долараў. Невялікія «слабенькія» аднапакаёўкі ў аддаленых мікрараёнах цяпер магчыма адшукаць і танней чым за 19—20 тысяч долараў. Агульная тэндэнцыя на патанненне закранула і сярэднія цэны на двухпакаёвыя кватэры, цэннікі на якія з 43 тысяч долараў знізіліся да 40—38 тысяч. У далёкіх мікрараёнах па дамах старой забудовы невялікія двухпакаёвыя «хрушчоўкі» з агульнай плошчай да 45 квадратных метраў часам прапануюцца прадаўцамі і за 20—25 тысяч долараў. Добрыя па якасці і прасторныя трохпакаёвыя кватэры, што ў студзені каштавалі 55—60 тысяч долараў, сёння прапануюцца максімум за 45—50 тысяч долараў.

Нягледзячы на такое істотнае патанненне жылля, попыт на кватэры з пачатку года застаецца на нулявым узроўні. Галоўным чынам гэта тлумачыцца істотным змяненнем на паніжэнне цэнаснай прапановы дольвалі звыш 200 тысяч долараў, сёння патаннелі адразу на 30—50 тысяч долараў. Тут трэба адразу дадаць, што ўладальнікі сапраўды элітных і якасных катэджаў у ліквідных мікрараёнах індывідуальнай забудовы, пасля таго, як нерухомасць дасягнула свайго мінімальнага кошту, пачалі здымаць аб'екты з продажу. Па сутнасці, з пачатку года попыт на катэджы ў Віцебску і побач з гэтым абласным цэнтрам застыў на ўпэўненым нулявым узроўні.

Зніжкі па брэсцкіх кватэрах дасягаюць 10 тыс. USD

Мінімальны попыт на кватэры на другасным рынку жылля сёння назіраецца і ў Брэсце. Паводле інфармацыі **кіраўніка дзяржаўнай рыэлтарскай канторы Брэста Анатоля ВАЙТОВІЧА,** за амаль два месяцы года ў гэтым агенцтве нерухомасці было прададзена толькі 5 кватэр. Прадаўцы яшчэ спрабуюць трымаць цэны, але... Пры стартавым кошце стандартных даволі якасных аднапакаёвых кватэр у межах 35—37 тысяч долараў, падчас рэальных перамоваў з пакупнікамі цэннік зніжаецца ўжо да 30—31 тысячы долараў. Кошт слабых аднапакаёвак маласямейнага тыпу ў старых дамах дасягае ўжо 26—27 тысяч долараў. Амаль самыя моцныя і масава распаўсюджаныя зніжкі назіраюцца па двухпакаёвых кватэрах. Сярэдні кошт двухпакаёвак агульнай плошчай каля 50 квадратных метраў у дзевяціпавярховых дамах вагаецца ў межах ад 56 да 46 тысяч долараў. Аднак рэальна такія кватэры прадаюцца сёння не дарэжэй за 40—42 тысячы долараў.

Па сегменце аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр прадаўцы звычайна прапануюць жыллё на продаж, дзе квадратны метр каштуе ад абласных цэнтраў пасля 1 мая без аўкцыёнаў зямельныя ўчасткі будуць даваць і тым, хто стаіць у жыллёвай чарзе гарвыканкамаў. Участкі будуць прапаноўвацца ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну, ці ў прыватную ўласнасць па кадастравым кошце.

Што датычыцца самых слабенькіх індывідуальных дамоў, то яны за першы месяц года патаннелі прыкладна на 4—5 тысяч долараў. Крыху лепшыя па якасці прыватныя дамы патаннелі на 10—15 працэнтаў і каштуюць цяпер каля 80 тысяч долараў. Сапраўды элітныя дарагія катэджы, што да новага года каштавалі звыш 300 тысяч долараў, сёння патаннелі адразу на 50—70 тысяч долараў. Аднак рэальна такія катэджы ў ліквідных мікрараёнах індывідуальнай забудовы, пасля таго, як нерухомасць дасягнула свайго мінімальнага кошту, пачалі здымаць аб'екты з продажу. Па сутнасці, з пачатку года попыт на катэджы ў Віцебску і побач з гэтым абласным цэнтрам застыў на ўпэўненым нулявым узроўні.

Рынак зямельных участкаў і катэджаў часова не працуе

Калі ў снежні ў Віцебску існаваў сур'ёзны дэфіцыт на ўчасткі зямлі пад індывідуальнае будаўніцтва ў ліквідных месцах горада, то сёння попыт на такую зямлю ўвогуле адсутнічае. Будучыя забудоўшчыкі ўласных дамоў чакаюць першых дзён мая, калі пачне дзейнічаць Указ кіраўніка дзяржавы ад 6 лютага 2009 года № 64, дзе прадугледжаны змяненні нормаў па прадастаўленні і адабранні зямельных участкаў для будаўніцтва жылля. Згодна з гэтым дакументам, у абласных цэнтрах пасля 1 мая без аўкцыёнаў зямельныя ўчасткі будуць даваць і тым, хто стаіць у жыллёвай чарзе гарвыканкамаў. Участкі будуць прапаноўвацца ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну, ці ў прыватную ўласнасць па кадастравым кошце.

Што датычыцца самых слабенькіх індывідуальных дамоў, то яны за першы месяц года патаннелі прыкладна на 4—5 тысяч долараў. Крыху лепшыя па якасці прыватныя дамы патаннелі на 10—15 працэнтаў і каштуюць цяпер каля 80 тысяч долараў. Сапраўды элітныя дарагія катэджы, што да новага года каштавалі звыш 300 тысяч долараў, сёння патаннелі адразу на 50—70 тысяч долараў. Аднак рэальна такія катэджы ў ліквідных мікрараёнах індывідуальнай забудовы, пасля таго, як нерухомасць дасягнула свайго мінімальнага кошту, пачалі здымаць аб'екты з продажу. Па сутнасці, з пачатку года попыт на катэджы ў Віцебску і побач з гэтым абласным цэнтрам застыў на ўпэўненым нулявым узроўні.

Зніжкі па брэсцкіх кватэрах дасягаюць 10 тыс. USD

Мінімальны попыт на кватэры на другасным рынку жылля сёння назіраецца і ў Брэсце. Паводле інфармацыі **кіраўніка дзяржаўнай рыэлтарскай канторы Брэста Анатоля ВАЙТОВІЧА,** за амаль два месяцы года ў гэтым агенцтве нерухомасці было прададзена толькі 5 кватэр. Прадаўцы яшчэ спрабуюць трымаць цэны, але... Пры стартавым кошце стандартных даволі якасных аднапакаёвых кватэр у межах 35—37 тысяч долараў, падчас рэальных перамоваў з пакупнікамі цэннік зніжаецца ўжо да 30—31 тысячы долараў. Кошт слабых аднапакаёвак маласямейнага тыпу ў старых дамах дасягае ўжо 26—27 тысяч долараў. Амаль самыя моцныя і масава распаўсюджаныя зніжкі назіраюцца па двухпакаёвых кватэрах. Сярэдні кошт двухпакаёвак агульнай плошчай каля 50 квадратных метраў у дзевяціпавярховых дамах вагаецца ў межах ад 56 да 46 тысяч долараў. Аднак рэальна такія кватэры прадаюцца сёння не дарэжэй за 40—42 тысячы долараў.

Па сегменце аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр прадаўцы звычайна прапануюць жыллё на продаж, дзе квадратны метр каштуе ад абласных цэнтраў

Радавыя Перамогі

...ЧЫМ ВАЯВАЛІ, НА ЧЫМ ВАЯВАЛІ, У ЧЫМ ВАЯВАЛІ...

Бездарожжа кастрычніка сорак першага, адступленне Чырвонай Арміі... «Дэзерціры ў споднім, самі — бялей за палатно, расстраляныя перад строем таварышаў. Цягачы артылерыйскіх гармат, кінутыя без паліва ў непралазнай гразі. Кіпы, нейкія неймаверныя штабялі грошай з армейскай казны, якія нельга пакінуць ворагу, а трэба спаліць, але сырыя, туга збітыя, з асобай паперы, яны супраціўляюцца агню, не гараць, а чадзяць, і языкі полымя толькі аблізваюць іх...»



Гэта цытата з кнігі літаратуразнаўцы і пісьменніка з Гомеля Івана Афанасьева «Настаўнік гісторыі. Вайна і школа Івана Гарунова». Усё надзвычай проста: унук расказвае пра свайго роднага дзеда, ветэрана Вялікай Айчыннай. Знойдзецца не шмат сем'яў, дзе так карпатліва захоўваюць гісторыю рода. Але ж, трэба адзначыць, і сям'я не зусім звычайная. Іван Гаруноў — у вайну спачатку франтавік, пасля выхаду з акружэння — начальнік штаба атрада імя Чкалава Гомельскай партызанскай брыгады «Бальшавік». Пасля вайны — настаўнік гісторыі і кіраўнік вячэрняй школы. Яго блізкія сваякі — вядомыя на ўвесь былы Саюз браты Лізюковы, два з якіх — Героі Савецкага Саюза.

Фотаздымкі, дакументы, успаміны аб вайне... Аўтар, даследчык творчасці вядомых беларускіх пісьменнікаў Іван Афанасьеў праводзіць паралелі лёсаў людзей і сюжэтаў вядомых кніг Алеся Адамовіча і Васіля Быкава. Аповесць апошняга «Падоранае жыццё» — быццам бы калька асабістай гісторыі Івана Гарунова, пра якую пісьменнік не мог ведаць. Тым не менш лёс аднойчы, у 1988 годзе, звёў ветэрана вайны, лепшага ваеннага беларускага празаіка і маладога літаратуразнаўцу.

Потым сустрэчы ў кватэры Васіля Быкава на вуліцы Танкавай у Мінску (звычайна ў чэрвені, калі пісьменнік святкаваў свой дзень нараджэння) сталі традыцыйнымі. А гэты фотаздымак быў зроблены 16 чэрвеня 1994 года. Іван Афанасьеў расказвае, што ў той дзень яны з дзедам і сябрам з Германіі Андрэасам Людзвігам блукалі па Мінску, шукаючы дарогу на Хатынь. Васіль Быкаў узяў карту і сам прачарціў па ёй маршрут. Гэтая карта і сёння захоўваецца ў сям'і.

— Гэта былі незабыўныя сустрэчы, сагрэтыя неверагодным абаяннем, сардэчнасцю і гасціннасцю Васіля Уладзіміравіча. Ім, франтавікам, было вельмі цікава разам, і гаварылі яны ў асноўным пра непарадны, цяжкі бок свайго ваеннага лёсу: чым ваявалі, на чым ваявалі, у чым ваявалі, як ваявалі. Васіль Быкаў бачыў у асобе дзеда працаўніка вайны, у якога, магчыма, узнагарод менш, чым у кагосьці, званне ніжэйшае, а на плячах — увесь цяжар і ўся рызыка франтавых будняў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота з архіва І. АФАНАСЬЕВА.

БАЦЬКІ-АДЗІНОЧНІКІ

Ці лёгка мужчынам самім гадаваць дзяцей?

Антон Емяльянаў — малады бацька, яму толькі 24 гады. Побач з ім — маленькая прыгажуня Варвара, якая лічыць свайго любімага татку самым добрым чалавекам у свеце. Дзяўчынка ніколі не бачыла сваю маці, якая кінула яе ў радзільным доме пяць гадоў таму і сышла ў невядомым накірунку.

— У нас ёсць усё: кватэра ў Магілёве, падтрымка маёй маці, урэшце і грошай збольшага хапае, — запэўнівае Антон. — А самае цяжкае было — вырашыцца забраць дзіця з раддома. Мне тады было 19 гадоў, і гэта быў самы адказны выбар у маім жыцці. Вось тады было страшна, а цяпер гадаваць — гэта ўжо не праблема, справімся.

Антон — адзін са шматлікіх бацькоў, якія ў выніку розных, але нязменна цяжкіх жыццёвых абставінаў вырашылі рушыць у «адзіночнае плаванне» па выхаванні сваіх дзяцей. У Магілёўскай вобласці жывуць 700 бацькоў, якія самі, без жонак, выхоўваюць больш за тысячу дзяцей.

Камітэт па працы і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама і дабрачынная арганізацыя «Табея» правялі сустрэчу з бацькамі-адзіночкамі.

Асобнага Дня бацькі ў Беларусі пакуль няма. У Амерыцы такое свята з'явілася яшчэ на пачатку XX стагоддзя паводле ініцыятывы Саноры Смарт. Гэту жанчыну і яе пяць братоў і сясцёр выгадаваў бацька пасля смерці маці. З цягам часу Дзень бацькі сталі адзначаць і ў іншых краінах свету. Праўда, у Беларусі традыцыйна, ад савецкіх часоў усеагульным мужчынскім святам лічыцца Дзень абаронцаў Айчыны 23 лютага.

Да яго і былі прымеркаваныя сустрэча і святочны абед у сацыяльнай сталоўцы «Табеі», куды прыехалі са сваімі дзецьмі 17 бацькоў з Магілёўскага раёна і абласнога цэнтра. Яны выхоўваюць самі ад аднаго да трох малых.

Алег ПАЗНЯКОЎ і сын Саша: «Мы ж мужыкі! Усё вытрываем. Галоўнае — дзеці!».

У кожнага бацькі-адзіночкі — свая гісторыя, часцей трагічная. Васіль Саладкоў з вёскі Кадзіна Магілёўскага раёна два гады таму ў дрэннае восеньскае надвор'е трапіў у аўтааварыю: ён, вадзіцель, выжыў, а жонка, якая была пасажыркай, памерла.

Мужчына вырашыў сам выхоўваць дзяцей і, акрамя сваіх дзвюх дачок, узяў апеку над двума пасынкамі і прыёмнай дачкой. Дзеці памерлай жонкі ўжо дарослыя, і прыёмная дачка Юлія, якой 23 гады, дапамагае Васілю гадаваць маленькіх дзяўчатак. Аліне 10 гадоў, а Насі — толькі 5.

Уся сям'я Саладковых жыве ў інтэрнаце. Васіль працуе жывёлаводам у аграфірме «Днепр». Нешматслоўны бацька накрываў сваёй курткай плечы дзяўчатак, якія прыйшлі на свята ў рынцэсавых строях. На пытанне аб цяжкасцях ён проста адказаў: «Усе мы імкнёмся і працуем, але сродкаў не хапае на ўсё. А маці малым не хапае яшчэ болей».

У Артура Дзецюка 8 гадоў таму памерла ад анкалагічнага захворвання жонка. Ён сам гадуе дачку Настассю.

— Я тады вырашыў, што трэба думаць не пра сябе і асабістае жыццё, а пра дзіця клапаціцца, — кажа адказны мужчына. — Спачатку трэба дачку на ногі паставіць, а потым сваё жыццё ўладкоўваць.

Па яго словах, самае цяжкае ў жыцці бацькі-адзіночкі — гэта знайсці прыдатнае месца працы. Артур і Настасся жывуць адны, а бацька хоча больш быць з дачкой, якой споўнілася 16 гадоў, каб падтрымаць у адказны жыццёвы перыяд і абараніць ад расчараванняў юнацтва. Таму Артуру даводзіцца выбіраць працу ў начную змену.

Антон ЕМЯЛЬЯНАЎ у 19 гадоў забраў дачку Варвару з радзільнага дома, дзе яе пакінула маці.

Бацькі-адзіночкі мала звяртаюцца па дапамогу — і ў дзяржаўныя органы, і ў грамадскія арганізацыі. Падаецца, што яны лічаць сорамам просьбу аб падтрымцы. Таму супрацоўнікі сацыяльнай службы і дабрачыннікі пераконвалі мужчын прыходзіць і атрымліваць на карысць сваіх дзяцей адрасную дзяржаўную дапамогу і гуманітарныя адзенне і харчы. У адказ адзін з татаў радасна прапанаваў перадаць у гуманітарную дапамогу цэлую шафу адзення, з якога выраслі яго дзеці.

Некаторых дзяцей бацькоў-адзіночак прывезлі сваякі. «Нашы таткі працуюць, зарабляюць грошыкі», — сур'ёзна тлумачылі малыя.

Траіх дзяцей Міхаіла Пракоп'ева суправаджала бабуля Святлана Уладзіміраўна. Сам бацька, які працуе слесарам на буйным

Жывёлавод з Магілёўскага раёна Васіль САЛАДКОЎ і дзве яго дачкі. Малым найбольш не хапае маці, якая загінула ў аўтааварыі.

прадпрыемстве, не мае магчымасці кінуць змену. Затое малыя — Міша, Лера і Карына (старэйшаму дзіцяці толькі 8 гадоў) — замілаванымі галасамі спявалі і чыталі вершы, а потым пяшчотна прыціскалі да сябе мяккія цацкі-падарункі.

Сям'я Пракоп'ева цяпер у цяжкай жыццёвай сітуацыі. Яго жонка летась памерла, а Міхаіл са сваімі дзецьмі цяпер жыве ў сваіх бацькоў. Шматдзетны бацька і ўсе блізкія сваякі з усіх сілаў змагаюцца за тое, каб дзеці выраслі здаровымі і шчаслівымі.

— Гэта і ёсць цікі, але сапраўды жыццёвы гераізм, — казалі пра бацькоў-адзіночак на сустрэчы. — Трэба мець вялікую гаспадарчую мудрасць, смеласць і цярплівасць, каб гадаваць дзяцей. Мужчыны не аддалі сваіх дзяцей у дамы-інтэрнаты, а выконваюць свой бацькоўскі абавязак.

І яшчэ адна гісторыя жыцця напрыканцы. Магіляўчанін Алег Пазнякоў даўным-даўно не бачыў сваю жонку і маці сына Сашы. Кажа, што яна як увайшла ў алкагольны штопар, так дасюль з яго і не выйшла. Клопаты па выхаванні дзіцяці ўзяў на сябе рашучы бацька.

— Мы ж мужыкі! — гучна казаў Алег на сустрэчы бацькоў-адзіночак. — Мы ўсё вынесем і вытрываем. Галоўнае — дзеці!

Саша, якому споўнілася ўжо 14 гадоў, гуляе ў хакей і, верагодна, стане прафесійным спартсменам. А Алег з цягам часу ўладкаваў і сваё жыццё: у яго з'явіліся грамадзянская жонка і маленькая дачка.

Вось у гэтым і было самае вялікае пажаданне бацькам-адзіночкам арганізатараў сустрэчы ў мужчынскі дзень: выгадаваць дзяцей і знайсці сабе верную спадарожніцу жыцця, каб раздзяліць дастойную старасць не толькі з удзячнымі нашчадкамі, але і з любімай жанчынай.

Ілона ІВАНОВА.

Зварот у карпункт

Надзея застаецца

Наша газета атрымала ліст ад Антаніны Сычэўскай з Баранавічаў, у якім яна паведамляе, што згубіла давер да Дзяржстраха. Жанчына ў свой час заключыла дагавор па страхаванні дзяцей — сына і дачкі. Тры тысячы савецкіх рублёў, якія былі ўнесены па тым дагаворы, зніклі разам з распадам Саюза.

«Зрабіце запыт і давядзіце да ведама... можа ўсе забылі, але факт меў месца. Прашу пасадзейнічаць... І ўсё ў «Звяздзе» напішыце, таму што газету я выпісваю, люблю і з ёю раюся», — піша аўтарка ліста.

Праблема, узнятая нашай чытачкай, даўняя і набалелая. Мала якая сям'я не згубіла ў той перыяд свае грошы. Людзі верылі ў тагачасную банкаўскую сістэму і не маглі нават уявіць, што магчымы такія фінансавыя абвалы.

Можна зразумець чалавека, які адкладваў грошы з кожнай зарплаты, але вярнуць тыя ўклады і страхоўкі сёння нерэальна. Ужо няма той дзяржавы, як і тых грошай, але давялося пайсці ў прадстаўніцтва Белдзяржстраха з пісьмом А. Сычэўскай.

— А колькі да нас прыходзіць людзей па аналагічных пытаннях... Пішуць ва ўсе інстанцыі, а чым мы можам дапамагчы? — уздыхнула дырэктар гарадскога Белдзяржстраха Е. Кузьміна, прачытаўшы пісьмо. — Вось і рассылаем усім пакрыўджаным лісты з адным і тым жа тэкстам.

Адказ, які надрукаваны ніжэй, ужо атрымалі тыя, хто звяртаўся па тлумачэнне ў Белдзяржстрах, а нехта можа пазнаёміцца з ім праз газету.

Паважаная Антаніна Сцяпанаўна!

Прадстаўніцтва Белдзяржстраха па г. Баранавічы на Ваша пісьмо наконт страхавых выплат па доўгатэрміновых дагаворах паведамляе наступнае.

Абвостраныя на пачатку 90-х гадоў інфляцыйныя працэсы, па незалежным ад Белдзяржстраха прычынах, у вельмі вялікай ступені абясцэнілі, а дэнамінацыя 1994 і 2000 гадоў зменшыла адпаведна ў 10 і 1000 разоў накапленні грамадзян па доўгатэрміновых дагаворах страхавання.

Грашовыя рэзервы Белдзяржстраха, прызначаныя для выплаты страхавых сум па заканчэнні тэрміну дзеяння дагавораў страхавання, у той жа ступені падпалі пад уздзеянне інфляцыйных працэсаў, таксама былі зменшаны ў 10 і 1000 разоў у выніку дзвюх дэнамінацый.

Таму на сёння ў Белдзяржстраха няма такіх сродкаў, і неабходна сур'ёзная дапамога і падтрымка дзяржавы.

У мэтах абароны матэрыяльных інтарэсаў грамадзян, Урадам і Белдзяржстрахам разглядаецца гэтае пытанне. Пры канчатковым рашэнні кіраўніком дзяржавы і Урадам Рэспублікі Беларусь гэтага пытання будзе паведамлена ў сродках масавай інфармацыі.

Дырэктар прадстаўніцтва Е.В. Кузьміна.

Ведаючы, якім будзе адказ, я спытаў: усё ж колькі грошай на дзіцячых страхавых дагаворах? На сёння там няма і рубля, але ўсе дакументы захоўваюцца, усе сумы ўкладаў зафіксаваныя. Надзея застаецца...

Вяртаць неабходна каласальныя грошы, а ці ёсць такая магчымасць у нашай дзяржавы? Склалася парадаксальная сітуацыя: людзі свае, а грошы ў іх прапалі другой краіны, якая знікла з карты свету. І як тут быць? Дарэчы, мяне турбуе адна думка. А мо людзі звяртаюцца не па адрасе? Хто з'яўляецца пераемнікам Савецкага Саюза? Знешнія даўгі выплачаны, а што, абавязацельстваў перад сваімі былымі грамадзянамі няма?

Разам з гэтым нам неабходна браць адказнасць за свае фінансавыя справы на сябе. Чамусьці ні разу не давялося пачуць, каб чалавек за згарэлыя ўклады папракнуў сябе. Вінавата дзяржава, палітыкі, але не ён. У пераважнай большасці грамадзян грошы прапалі, але ж не ва ўсіх. Нехта правільна ацаніў сітуацыю і збыў з рук савецкія рублі, якія неўзабаве расталі, як снег.

Вось і сёння даводзіцца бачыць, як людзі кідаюцца з адной крайнасці ў іншую. Адны пераводзяць беларускія рублі ў долары, другія — у еўра, а многія лічаць, што найлепш трымаць у рублях, пад працэнтамі. Чалавек сам прымае рашэнне і тым самым ускладвае на сябе адказнасць.

У савецкага чалавека не было выбару. Дзяржава за яго вырашала, як яму жыць: банк быў адзін, эканоміка планавая, прадпрыемствы дзяржаўныя... А сёння, калі наша грамадства апынулася ў рынкавых адносінах, каб выжыць, чалавеку патрэбна спадзявацца на свае сілы, і многае залежыць ад правільна прынятага рашэння. А гэта, бадай, самае складанае.

Старэйшаму пакаленню цяжка прымірыцца са стратай тых укладаў — вярнуць мінулае немагчыма, але надзея памірае апошняй... А маладым застаецца адно — глядзець у будучыню: вучыцца, набываць запатрабаваную прафесію — быць больш прагматычным. Банальна, але гэта так.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Нефармат

ДЗЕНЬ НАРОДЗІНАЎ

Здзівіла не вельмі блізкая знаёмая. Запрасіла на свой юбілей. Я, напрыклад, 45-годдзе юбілеем не называла б. Але ж у кожнага свой падыход. Тым болей, што ў дзень народзінаў была арганізавана вечарына-прэзентацыя. Акрамя традыцыйных выступленняў наконт таго, якая віноўніца прыгожая, разумная і сціплая, сама яна, віноўніца, вынесла на суд публікі ўласныя вершы. Паэзіяй назваць тую творчасць ніяк немагчыма, рыфмаваныя радкі падыходзілі для выканання ну ў вельмі вузкай, хіба толькі сямейнай кампаніі. Мне ж успомнілася выказванне адной дасціпнай маскоўскай журналісткі: «Калі чалавеку няма чаго святкаваць, ён святкуе ўзрост».

А ўзрост святкаваць цікава хіба толькі ў дзяцей. Можна зразумець бацькоў, якія адзначаюць годзік доўгачаканага першынца. Цікавай бывае і другая гадавіна, калі чалавечак пачаў хадзіць, размаўляць, і забаўна надзімае шчочкі, каб затушыць дзве свечкі ў торце. Але дзіця ідзе ў садок, а там ёсць традыцыя прыносіць цукеркі на дзень народзінаў для ўсёй групы. Многія бацькі, відаць, па прастаце душы стараюцца вызначыцца, грузяць прысмакі пакетамі, хоць у дашкольным узросце варта абмяжоўваць ужыванне вугляводаў, асабліва розных там чупсаў сумнеўнай вытворчасці. Далей болей, у школу нясуць не толькі цукеркі, але запрашаюць пасля ўрокаў кампанію аднакласнікаў, якую бацькі павінны накарміць-напаіць і пазабаўляць. Упэўнена, што ва ўсіх гэтых традыцый ногі растуць ад старанняў гандлю. Толькі яму выгадныя багатыя і шчодрыя святы. Але ж святы бываюць розныя, а тут нагода пасвяткаваць сябе, любімага.

Мы ўпарыемся за гэту адзіную нагоду, бо самі сталі бяднейшыя ў эпоху інфарматызацыі і глабалізацыі. Памятаю, як гадоў пятнаццаць таму адзін вельмі сталы калега запрашаў сваіх равеснікаў-калег дадому на дранікі. Так было прынята ў яго сям'і. А часта мы запрашаем цяпер сяброў і знаёмых на чай, на пірагі, на вячоркі, як рабілі нашы бабулі? У нас засталася адна нагода, акрамя прывычных карпаратываў на Новы год, на 23-га — 8-га. Апошнія таксама вельмі ўмела ўсталявалі, нават зрэжысіравалі гандляры. Ім, чым болей мы святкуем, тым лепей: тым больш мы купім аўтаручак, парфумы, сурвэтак, посуду, а таксама тэлефонаў, электрапрыбораў і рознага іншага шырспажыву. Ледзь не забылася: віна, гарэлкі, прадуктаў — гэта трэба было б паставіць на першае месца. Нядаўняя мая гераіня казала: настаюць гарачыя для мяне дні, я ж усю Жабінку да мужчынскага і жаночага дня «адорваю». Яна гандлюе касметыкай.

Сваімі святамі мы падтрымліваем не толькі гандаль. Кінь мы ўсё гэта рабіць, цяжка ўявіць, эканомікі колькіх краін рухнуць. Ну калі не краін, дык асобныя прадпрыемствы і холдынгі дакладна давядзецца зачыняць на замок. «Калі чалавек дасягае пэўнага ўзроўню матэрыяльнага дастатку, перад ім паўстае пытанне: хто я? У чым сэнс усяго? Адказ атрымліваецца такім: сэнс — ён вісіць на вешалцы ў краме гатовага адзення. На ім этыкетка прэстыжнай фірмы, выкананы ён па найноўшай модзе...» — гэта напісаў М. Брэдбэры. Далей болей: «У эпоху, калі эротыка сэксу вычарпана, шопінг — апошні ацалелы від эратычнага перажывання... Палова чалавецтва альбо галадае, альбо ваюе, а чым займаецца другая палова? Сноўдаецца па крамах. З аднаго боку, пакуты і смерць, з другога — захапленне мясцога прылаўка і расчараванні секцыі карункавай бялізны».

Ці не з той жа оперы ўсе гэтыя шумна-бліскучыя дні народзінаў бізнэс-шоу і іншых зорак, якія, захлёбваючыся, асвятляюць тэлеканалы і свецкія хронікі? Нядаўна чытала, як адзначыў 48-ы дзень народзінаў мастак, маскоўскі сцэнограф-глабаліст, злёгку пісьменнік Барыс Красноў. Ну вядома, лепшая зала, тысяча гасцей з фінансава-палітычнага карагода сталіцы. І галоўная падзея вечара: сама прымадонна песні з новым юным мужам заехала павіншаваць імяніннika. А ён, імяніннік, — казалі ў кулуарах, — кожны свой дзень народзінаў гуляе як апошні раз. А чаму б не гуляць, калі ёсць грошы і нагода сабраць патрэбных людзей ды яшчэ з дапамогай «вясельнай генералышы» паказаць патрэбным сваю значнасць і ўплывовасць? Ну а за імі, героямі свецкіх хронік, пакрысе цягнуцца іншыя, па меры магчымасцяў сваіх фантазіі і кашалька.

Не, я не супраць нармальных чалавечых стасункаў. Адна мая аднакласніца ў свой дзень народзінаў збірае старых школьных сяброў. І гэта бывае цікава, бо нарэшце ці яшчэ ўдалося ўбачыць таварышаў па парце, згадаць любімых настаўнікаў. Я пра тое, што ў мяне нязменна выклікае смех, калі іншыя з апошняга духу высільваюцца, каб сабрацъ людзей свайго, як яны лічаць, кола і пахваліцца сваім дастаткам, новым рамонтам і замежнымі строямі. Ну і заадно паслухаць няшчырыя, але прыемныя словы ў свой адрас. Асабіста я заўсёды хацела адзначыць свой дзень народзінаў у зімовым лесе ля вогнішча ў кампаніі аднаго-двух прыемных мне людзей. Не выходзіць, абавязкова надараецца тэрміновая работа. А можа гэта і да лепшага, калі няма часу ўспамінаць узрост, тым больш яго святкаваць.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Здарэнні, крымінал

ЗА СЛУЖБОВАЙ ХАЛАТНАСЦІ ДОКТАРА ЎТОЕНА ЗЛАЧЫНСТВА

Суд Пінска і Пінскага раёна вынес прыгавор загадчыку Ласіцкай амбулаторыі, які прызнаны вінаватым у службовай халатнасці, паведамілі ў пракуратуры Брэсцкай вобласці.

17 лістапада мінулага года медык па просьбе вадзіцеля амбулаторыі выдаў медыцынскае пасведчанне аб смерці яго маці. Пры гэтым ён не агледзеў належным чынам труп і беспадстаўна назваў у якасці прычыны смерці жанчыны «раптоўную сардэчную смерць». Пазней пасля эксгумацыі трупа судова-медыцынскай экспертызай на целе былі выяўлены шматлікія цялесныя пашкоджанні, у выніку якіх і надышла яе смерць.

Цяпер завяршаецца расследаванне забойства жанчыны, ва ўчыненні якога абвінавачваецца яе муж. Такім чынам, з-за халатных адносінаў доктара да выканання службовых абавязкаў, было ўтоена злачынства.

Улічваючы, што асуджаны пакаяўся ва ўчыненым і раней да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся, суд назначыў яму пакаранне ў выглядзе штрафу ў памеры 30 базавых велічынь — Br1 млн 50 тыс.

Уладзімір МАЦВЕЕЎ, *БЕЛТА.*

БЫВАЙЦЕ, «ДНЕПР» І ГРОШЫ...

За незаконную здабычу пяці дзікоў з выкарыстаннем транспартнага сродку і нанясенне прыродным рэсурсам урону ў асабліва буйным памеры судом Веткаўскага раёна вынесены прысуд у дачыненні да двух браканьераў.

Кожнаму з іх прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на два гады ўмоўна з пакрыццём у салідарным парадку нанесенага ўрону. У прыватнасці, у даход дзяржавы парушальнікі павінны будуць выплаціць 5,1 мільёна рублёў, на карысць Гомельскай абласной арганізацыйнай структуры Таварыства паляўнічых і рыбаловаў — 4 мільёны рублёў. Канфіскаваныя матацыкл «Днепр-11» і паляўнічая стрэльба звернуты ў даход дзяржавы ў лік пагашэння ўрону.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАНУЙЦЕ ЖЫВЫХ

Меркаванне

На мінулым тыдні ў Брэсце прайшло пасяджэнне аблвыканкама, на якім сярод іншых пытанняў старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар прыцягнуў увагу прысутных да факта, які сёння стаў праблемай. Уздоўж аўтамагістраляў, у населеных пунктах людзі ўсталёўваюць на месцы гібелі блізкіх крыжы, агароджы, вешаюць вянкі, а гэта, на думку кіраўніка вобласці, з'ява ненармальная.

Артыкулы па гэтай праблеме друкаваліся ў раённай і абласной прэсе і раней, але на іх мала хто звяртаў увагу, бо колькасць памятных знакаў пры дарогах толькі павялічвалася. Але не хацелася б усю праблему зводзіць да юрыдычна-прававых нарматываў.

Зразумець людзей, якія хочуць неяк адзначыць месца, на якім загінулі іх блізкія, можна, асабліва калі боль страты яшчэ не сціх. Вось і ставяць невысокі металічны крыж, невялікую агароджу, запальваюць свечку...

У Баранавічах на перакрыжаванні вуліц Тэльмана і Перушкевіча на працягу некалькіх гадоў каля плата стаяў крыж, на якім пастаянна абнаўляліся вянкі — тут загінуў чалавек.

Балела родным, а астатніх усё гэта мала турбавала. Зімой з-пад колаў аўтамашын на тыя вянкі ляцеў брудны снег, а летам асядаў пыл... І было бачна, што гэтае месца не лепшае для памінання. Тым больш што ёсць магіла, дзе чалавек пахаваны. Сёння ў горадзе пачалі наводзіць парадак у гэтым плане, і такія знакі памяці ўжо сустракаюцца рэдка.

Але часам даходзіць да абсурду. На аўтамагістралі Баранавічы — Нясвіж даводзілася бачыць дрэва з прывязаным вянком. Прыцягнула ўвагу тое, што ад зямлі на вышыню ў метр са ствала была зрэзана кара. Вадзіцель не справіўся з кіраваннем, і машына наляцела на тое дрэва. Не ведаю, хто ў той аварыі загінуў, але навошта вінаваціць дрэва і знішчаць яго? Цікава, што дрэва (клён ці каштан), не засохла — змарнела, але за жыццё змагаецца.

Даволі часта ў няшчасці вінаватыя тыя, хто сеў за руль. Насупраць вёскі Новы Свет год таму загінулі трое маладых хлопцаў. Былі п'яныя і ўдарыліся ў дрэва, а раней на гэтым месцы адышлі ў нябыт чацвёра — іх аўтамашына перавярнулася. Цяпер на абочыне дарогі памятныя знакі, а на дрэве вянкі.

Адны, найперш супрацоўнікі ДАІ, сцвярджаюць, што ўсе гэтыя вянкі ды крыжы адцягваюць увагу вадзіцеляў і могуць спрыяць стварэнню на гэтым месцы чарговай аварыйнай сітуацыі. Другія ж прытрымліваюцца адваротнай думкі. Маўляў, убачыўшы пры дарозе вянок, вадзіцель будзе больш асцярожным і ўважлівым, бо гэта напамін аб трагедыі.

Прыдарожныя вянкі прыцягваюць увагу, але не скажу, што на мяне яны неяк уплываюць. Едзеш ды і ўсё.

Не ведаю, пра што думаюць на месцы трагедыі людзі праз некалькі гадоў пасля той бяды. Магчыма, вяртаюцца ў мінулае, уздыхаюць ці выціраюць слязу, але для самоты лепшае месца — могілкі, а не гарадская вуліца ці аўтамагістраль. Не толькі ў хрысціянстве, але і іншых рэлігіях астанкі чалавека ўспрымаюцца як прах і пыл. З зямлі чалавек прыйшоў — у зямлю і адышоў. Іншая справа — яго душа. І па законах прыроды жыццё цікавае, і не толькі чалавека, але і кожнай жывой істоты. Смерць жа — толькі завяршэнне жыццёвага цыкла, і не болей за гэта.

А прыдарожныя памінальныя знакі — гэта, найперш, даніна модзе. У традыцыі беларусаў нікалі такога не было. Нават на магілах ставілі драўляныя крыжы, якія праз дзясятак гадоў падалі і на гэтым аплакванне заканчвалася. Мураваныя помнікі ў нас — з'ява больш позняя.

Дзесяцігоддзямі на прыдарожныя памятныя знакі ў нас глядзелі скрозь пальцы, а калі ад тых вянкоў і крыжоў замітусілася ў вачах, то даводзіцца рабіць адпаведныя захады... Ды ў гэтым прысутнічае маральны аспект. Чалавек той знак паставіў, паклаў вянок, а рабочы дарожна-эксплуатацыйнай службы ўсё гэта выкідвае...

Неабходна растлумачваць людзям і праз сродкі масавай інфармацыі ўсе бакі гэтай праблемы — маральны і прававы. Ды і царква павінна сказаць тут сваё слова.

Бывае, на месца гібелі людзей прывозяць святара і для гэтага, быццам бы, ёсць падстава — пралілася чалавечая кроў.

А вось што сказаў архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфан («Заря», 21.02.2009):

— Безумоўна, праваслаўная царква не можа быць праціўнікам праваслаўнай сімволікі. Але зыходзячы з рэалій сённяшняга дня, вядома, установіць любога помніка ці крыжа ў грамадскім месцы ці то на гарадской вуліцы альбо дарозе, неабходна ўзгадняць з уладамі, міліцыяй, дарожнымі службамі.

А галоўнае, трэба памятаць, што самае важнае не вянок на дрэве пры дарозе, а шанаванне чалавека пры жыцці, добразычлівыя адносіны ў сям'і, павага.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»
(індэкс выдання) | Колькасць камплектаў
на 2009 год па месяцах
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Каму
Куды (прозвішча, ініцыялы)
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
(індэкс выдання)
ПВ | месца | літар
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»
Кошт | падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў
на 2009 год па месяцах
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Каму
Куды (прозвішча, ініцыялы)
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Антыкрызісная эканоміка

БУДЗЕМ ЗНІЖАЦЬ ВЫДАТКІ

70 % прадукцыі, якую вырабляюць у ААТ «Светлагорскі завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый», рэалізоўваецца на замежным рынку. Зборныя канструкцыі для энергабудаўніцтва, а гэта апоры ліній электраперадач, фундаменты, элементы падстанцый, палі і іншыя вырабы знаходзяць свайго пакупніка ў Расіі, рэспубліках Прыбалтыкі і Казахстане. Намеснік дырэктара Віктар Молчан параўноўвае сітуацыю на прадпрыемстве з іншымі ў сваім рэгіёне і адзначае, што на іх вытворчасці ў крызісных умовах яна далёка не горшая.

— У нас некалькі вытворчых падраздзяленняў. У адных з іх партфель замоваў сфарміраваны на год наперад і яны працуюць у ранейшым рэжыме. У другіх дакладна ёсць работа на найбліжэйшы месяц. Мы цяпер часткова працуем на склад, аднак правялі аналіз на рынку і ўпэўненыя, што попыт на прадукцыю сёлета будзе не ніжэйшы за мінулагодні. У снежні-студзені заўсёды назіраецца зніжэнне попыту. Тут ёсць свая спецыфіка: спачатку трэба правесці земляныя работы, а гэта, зразумела, звязана з умовамі надвор'я. І другое — гэта фінансаванне. Большасць энергетычных праграм, у тым ліку ў Расіі, вядуцца за кошт бюджэтнага фінансавання. Спачатку закрываецца бюджэт мінулага года, потым распрацоўваецца праграма, адкрываецца фінансаванне новага года — праходзіць пэўны час. Практычна ўся прадукцыя, якую мы пастаўляем на расійскі рынак, адгружаецца па папярэдняй аплаце. Як адзін з варыянтаў працы ў крызісных умовах, мы прадугледжваем магчымасць адгрузкі прадукцыі з адтэрміноўкай плацяжу. Але на сёння ў нас няма пратэрмінаванай запазычанасці па адгружанай прадукцыі.

Паколькі даходная частка бюджэту прадпрыемства памяншаецца, мы разглядаем магчымасць скарачэння тых выдаткаў, працэнт якіх у кошце прадукцыі самы вышэйшы. Паколькі ў нашай прадукцыі большую долю выдаткаў складаюць сыравіна і матэрыялы, мы зрабілі захады для зніжэння кошту матэрыялаў, якія набываем. Вы ведаеце, што цэны на цэмент і шчэбень яшчэ летась былі зніжаныя. Мы правялі перамовы з пастаўшчыкамі па-за межамі Беларусі аб зніжэнні цаны: яшчэ ніжэй, чым у нашай краіне. Тым самым мы паменшылі адзін са складнікаў выдаткаў. Акрамя таго, у гэтых умовах трэба думаць не толькі пра скарачэнне расходаў, але і пра павелічэнне даходаў. У тэорыі мы можам іх павялічыць за кошт павелічэння аб'ёмаў вытворчасці або цаны пры рэалізацыі сваёй прадукцыі. Тым не менш рэальна кошт прадукцыі мы павялічыць не можам, таму што на гэтым жа рынку існуюць аналагічныя расійскія і ўкраінскія прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў складанай сітуацыі. Тым больш, што яны маюць шэраг канкурэнтных пераваг перад намі. Таму мы вымушаны падпарадкоўвацца законам рынку. Разглядаем пытанне выхаду на рынкі, якія раней займалі нашы канкурэнты.

Скарачэнне колькасці рабочых праводзіць на прадпрыемстве не плануем. На сёння затрымак па выплаце заработнай платы няма.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

САМЫ ГАЛОЎНЫ КАПІТАЛ — ЛЮДЗІ!

Як выцягнуць эканоміку краіны падчас сусветнага фінансавага крызісу? Як пазбегнуць фармалізму пры разглядзе зваротаў грамадзян? Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўвалі ў Віцебску члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, выбраныя ад Віцебскай і Мінскай абласцей і сталіцы краіны, а таксама прадстаўнікі органаў мясцовай улады. Адпаведны семінар адбыўся на сумесным беларуска-германскім прадпрыемстве «Марко», якое ўзначальвае сенатар Мікалай Мартынаў.

— Наш галоўны капітал — людзі, — кажа Мікалай Мартынаў. Ён ужо мае добры вопыт сенатарскай работы і шчыра дзеліцца ім з навічкамі. — У сувязі з павелічэннем аб'ёмаў вытворчасці нам патрабуюцца рабочыя. Вядома ж, стаяць людзі на ўліку ў цэнтры занятасці. Ды не ўсе захочуць і змогуць працаваць на канвеерах...

Распавядаючы пра прадпрыемства, сенатар адзначыў, што розныя ведамствы, на яго погляд, павінны даць большую волю ў дзейнасці кіраўнікоў. Напрыклад, каб працаваў медпункт на фабрыцы, трэба атрымаць адпаведны дазвол. А навошта нешта ўзгадняць, весці перапіску, калі заводскі медык проста аказвае мінімальныя медыцынскія паслугі? Ну змерыць ціск, дасць таблетку. У цяжкім выпадку выкліча «хуткую дапамогу». А каб, напрыклад, простыя работы па электрыфікацыі ажыццявіць, таксама даводзіцца траціць час на ўзгадненні... Перыядычна з-за розных нюансаў прыходзіцца ўносіць папраўкі ў дакументацыю, што рагулюе дзейнасць прадпрыемства, хоць па логіцы гэтага можна было б і пазбегнуць.

— З улікам таго, што наша краіна таксама знаходзіцца ў рамках сусветнага эканамічнага крызісу, трэба абмеркаваць, якія ўмовы і заканадаўчыя акты павінны прымацца, каб праблемныя пытанні маглі вырашацца аператыўна, — распавядае Вадзім Папоў, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах. — Урад разам з адміністрацыяй Прэзідэнта распрацаваў план антыкрызісных мераў, які ўключае 52 напрамкі. Каб усё ажыццявіць, трэба прыняць больш за 80 дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта, законаў, пастаноў Урада... Ужо ў першым паўгоддзі павіны быць вырашаны праблемныя блокі. Самы цяжкі дакумент, які даўно распэў і патрабуе прыняцця — Спецыяльная частка Падатковага кодэкса. Гэта дазволіць звесці падатковае рэгуляванне ад мноства заканадаўчых актаў і падзаконных рашэнняў да аднаго дакумента — Падатковага кодэкса. Яго распрацоўка ў стадыі завяршэння. Хутка члены нашай камісіі і Палаты прадстаўнікоў — па падатках і банкаўскай дзейнасці ў рабочым парадку разгледзяць напрацоўкі па гэтым дакументе. Лічу, што прыняцце яго паздымае не толькі шмат пытанняў унутры нашай дзяржавы, але і значна палепшыць прывабнасць рэспублікі для замежных інвестараў, якіх пужае наша падатковае заканадаўства ў сувязі з вялікай колькасцю законаў, дэкрэтаў...

Абмеркавалі сенатары і работу са зваротамі грамадзян. Галоўная выснова — пры разглядзе зваротаў не дапускаць фармалізму.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДОЛЯ ПРАМЫСЛАВІКА: ПРАЦАВАЦЬ, ГАНДЛЯВАЦЬ, КРУЦІЦЦА

Дырэктар **«Магілёўдругмета»** Міхаіл Бондараў сваю антыкрызісную праграму вызначае кароткa і трапна: «Араць трэба!» Задача гэтага прадпрыемства — нарыхтаваць металалом, перапрацаваць і адгрузіць металашыхту для металургічных вытворчасцяў краіны.

У студзені «Магілёўдругмет» павялічыў аб'ём вытворчасці больш як на 20 %, у параўнанні з адпаведным месяцам мінулага года. У лютым, паводле прагнозаў, захавае паказчык, не ніжэйшы за леташні.

— Сёння цяжка прагназаваць, як складзецца год далей, — прызнае Міхаіл Бондараў. — Але я мяркую, што самае галоўнае ў час крызісу — гэта працаваць, працаваць і яшчэ раз працаваць. Так, амаль што па-ленінску. Не «загінацца», не плакаць і не чакаць, што нехта будзе падціраць слёзы. Трэба варушыцца і круціцца.

Горацкае ААТ «Малочныя горкі» выставіла сваю прадукцыю на нядаўняй міжнароднай выставе харчоў і напояў у Маскве. Паводле дырэктара Аляксандра Крываносава, расійскія аптовыя пакупнікі праявілі цікавасць да горацкіх малочных прадуктаў.

— І як вынік — падпісаны цэлы шэраг кантрактаў на пастаўку прадукцыі «Малочных горак» на расійскі рынак, — паведаміў дырэктар.

У межах выставы Міністэрства сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі праводзіла традыцыйны дэгустацыйны конкурс на лепшую прадукцыю, дзе з 1500 узораў аўтарытэтнае журы выбрала 30 лепшых. У іх ліку апынуліся і горацкія масла, ражанка і смятана.

— Цяпер важна не марнаваць час, а паспрабаваць заняць новыя нішы на айчынных і замежных рынках, — лічыць Аляксандр Крываносаў. — Наперадзе ў нашага прадпрыемства яшчэ вялікая праца на мадэрнізацыі вытворчасці, паляпшэнні спажывецкіх якасцяў і асваенні новых відаў прадукцыі. Усё гэта будзе рухаць нашы тавары на новыя рынкі.

Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў у першым месяцы гэтага года вырабіў прадукцыі на 15 % больш у параўнанні з паказчыкамі леташняга студзеня. Прагназуецца, што прадукцыі ў лютым будзе выраблена як мінімум не менш, чым за адпаведны месяц мінулага года.

Дырэктар Аляксандр Аграновіч гаворыць, што яго прадпрыемства адчувае негатыўны ўплыў крызісу — падзенне продажу выраблennай прадукцыі, але шукае выйсце.

— Каб павялічыць аб'ёмы рэалізацыі, мы паслалі ў Расію нашых прадстаўнікоў, — расказаў Аляксандр Аграновіч. — Там ёсць тавараправодная сетка, але калі на месцы працуе і трымае сітуацыю пад кантролем свой чалавек — завадчанін, зацікаўлены ў продажы прадукцыі, — то гандаль ідзе больш спрытна.

Цяпер у Расіі працуюць прадстаўнікі Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў у 4-х гандлёвых дамах: у Чарапаўцы, Елабузе, Стаўрапалі і Краснадары.

Што да далейшых планаў і прагнозаў, то дырэктар прапануе дачакацца хаця б завяршэння першага квартала гэтага складанага для прамысловасці года. Пакуль жа на прадпрыемстве працуе 3,5 тысячы чалавек, якія атрымліваюць сярэдні заробак прыкладна мільён рублёў. Ніякіх скарачэнняў людзей альбо працоўнага тыдня тут не прадбачыцца.

Як ні круці, а скарачэнні — гэта актуальнае пытанне. Пакуль не працаўнікоў, але працоўнага часу. Паводле афіцыйнай інфармацыі, у студзені ў Магілёўскай вобласці ў вымушаных адпачынках знаходзіліся альбо былі заняты няпоўны тыдзень 12 тысяч чалавек.

Негатыўны ўплыў сусветнага фінансавага крызісу адчувае прамысловасць Магілёўскай вобласці. Амаль траціна прадпрыемстваў знізіла ў студзені аб'ёмы вырабу прадукцыі. Увогуле ўзровень вытворчасці ў першым месяцы гэтага года ў параўнанні з леташнім студзенем склаў толькі 95,2 %.

Складанае становішча, напрыклад, на ААТ «Тэхнаприбор» і ААТ «Магілёўскі металургічны завод», якія ў студзені не дацягнулі і да 40 % у параўнанні з леташнім паказчыкам.

Запасы гатовай прадукцыі на прадпрыемствах вобласці склалі 578 мільярдаў рублёў, толькі ў студзені яны павялічыліся на 22 мільярды. Гэта складае 90 % сярэднямесячнага аб'ёму. Таму лозунг «Усім гандляваць!» застаецца вельмі актуальным.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік прызнаў работу прамысловасці ў сёлетнім студзені недастатковай. Па яго словах, невыкананне прагнозаў зніжае паступленні ў бюджэт, а гэта цягне за сабой праблемы сацыяльныя.

Натуральна, што на вытворчую праграму студзеня ўплываюць і традыцыйныя фактары — пачатак года, працяглыя калядныя вакацыі і гэтак далей. Аднак, па прагнозах Камітэта па эканоміцы Магілёўскага аблвыканкама, і ў лютым будуць падобныя паказчыкі. І толькі па выніках першага квартала, прагназуюць спецыялісты, для магілёўскай эканомікі будзе рэальна выйсці на ўзровень вытворчасці мінулага года.

Ілона ІВАНОВА.

Карозію спыняць «на гарачым»

Першы ў Беларусі завод па ахове металаканструкцый ад карозіі метадам гарачага ацынкоўвання будзе пабудаваны ў гродзенскай прамысловай зоне «Аўльс».

Такая дамоўленасць дасягнута паміж кіраўніцтвам Гродзенскага аблвыканкама, СЭЗ «Гроднаінвест» і прадстаўнікамі групы кампаніі RAM Engineering + Anlagenbau GmbH (Германія). Паводле інфармацыі генеральнага дырэктара RAM Engineering Russia Штэфана Фіткау, гэта будзе прадпрыемства з самым сучасным узроўнем тэхналагічнага забеспячэння, у тым ліку і што датычыцца прыродаахоўных мераў. Тэхналогія прадугледжвае замкнуты цыкл вытворчасці з ачысткай атмасферных выкідаў унутры завода, без утварэння сцёкавых водаў і кіслотных адходаў.

У будаўніцтва завода, які намечана ўвесці ў эксплуатацыю ўжо налета, RAM інвестуе больш за 20 мільёнаў еўра.

Разглядаюцца і яшчэ два магчымыя праекты гэтага холдынга на Гродзеншчыне — будаўніцтва завода па перапрацоўцы бытавых адходаў і ветраных энергаўстановак.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Крызіс супрацоўніцтву не перашкода

— Наша фірма дастаткова ўпэўнена трымаецца, і ўвогуле мы не адчуваем уплыву сусветнага фінансавага крызісу. Мы ўваходзім у сістэму абараназдольнасці Расіі, адпаведна, дзяржава дапамагае нам, і гэта дазваляе нават ва ўмовах сусветнай нестабільнасці выплачваць стыпендыі лепшым студэнтам Гомельскага тэхнічнага ўніверсітэта, — адзначыў вядучы спецыяліст Маскоўскага ААТ доследна-канструктарскага бюро імя Паўла Сухога Ігар Строкаў.

Акрамя таго што ўніверсітэт, як і вядомае на ўвесь свет канструктарскае бюро, носяць імя нашага славутага земляка Паўла Сухога, аднаго са стваральнікаў рэактыўнай і звышгукавой авіяцыі, установы звязваюць цесныя сяброўскія сувязі. У гэты дзень іх маральна і матэрыяльна адчулі 8 студэнтаў і 2 аспіранты ВНУ. Памер атрыманай стыпендыі, між іншым, складае каля 10 тысяч расійскіх рублёў. У гэты ж дзень сваякі легендарнага авіяканструктара перадалі для ўніверсітэцкага музея акуляры, партфель, лагарыфмічную лінейку і некаторыя іншыя асабістыя рэчы Паўла Восіпавіча Сухога.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

На здымку: «Лагарыфмічная лінейка авіяканструктара Паўла Сухога цяпер стане экспанатам музея», — кажа вядучы спецыяліст Маскоўскага ААТ доследна-канструктарскага бюро імя Паўла Сухога Ігар СТРОКАЎ.

Фота аўтара.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2009 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Беларусь: Чарнобыль

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
СВАЯ СПРАВА
ЖЫЗНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	10 120 рублёў на месяц 30 360 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	9 570 рублёў на месяц 28 710 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	16 170 рублёў на месяц 48 510 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	14 740 рублёў на месяц 44 220 рублёў на квартал

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8 690 рублёў на месяц 26 070 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8 180 рублёў на месяц 24 540 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	11 640 рублёў на месяц 34 920 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	11 010 рублёў на месяц 33 030 рублёў на квартал

Свая кішэня

ЯК ВЫРВАЦЦА З «ФІНАНСАВАЙ БЛАКАДЫ»,

альбо Законныя спосабы здабычы грошай у цяжкую хвіліну

(Працяг. Пачатак у нумары за 25 лютага.)

У мінулы раз пры даследаванні выбранай тэмы мы спыніліся на такіх шляхах здабычы грашовых сродкаў, як атрыманне пазыкі або крэдыту, дывідэндаў ад акцый ААТ ці продажу гэтых каштоўных папер, пошуку падпрацоўкі. Сёння раскажам пра іншыя магчымыя спосабы — тэрмінова або не вельмі — зарабіць пэўную суму.

Донарства — не бізнэс

Такую высакародную, без перабольшвання, місію, як донарства, нельга проста назваць адным з магчымых спосабаў атрымання грошай. Людзі здаюць сваю кроў і плазму, кіруючыся зусім іншымі — не матэрыяльнымі найперш — памкненнямі. Сродкі, што яны атрымліваюць, гэта не заробак у звычайным разуменні, а толькі кампенсацыя за магчымыя нязручнасці. І тым не менш у некага можа ўзнікнуць у жыцці сітуацыя, калі менавіта праз донарства чалавек можа атрымаць пэўную суму грошай. Пра ўсе нюансы гэтай працэдуры мы папрасілі расказаць **загадчыка аддзялення камплектавання і медыцынскага засведчання донарскіх кадраў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гематалогіі і трансфузіялогіі Тамару НІКАНЧЫК**.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Донарам, згодна з заканадаўствам, можа быць толькі грамадзянін Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 18 да 60 гадоў. Гэта па-першае. Па-другое, у кожнай службы крыві свой рэгіён, які яна абслугоўвае. Скажам, мы — Мінск і Мінскі раён. Гэта значыць, што ў службу крыві грамадзянін павінен звяртацца па месцы сваёй прапіскі (рэгістрацыі), — патлумачыла Тамара Аляксандраўна.

Патрабаванні да здароўя патэнцыяльнага донара надзвычай жорсткія. Катэгарычна забараняецца здаваць кроў людзям, якія перахварэлі на вірусныя гепатыты, туберкулёз, сіфіліс, людзям з наркатычнай залежнасцю, хворым на алкагалізм, ВІЧ-інфіцыраваным, з іншымі захворваннямі. Перад здачай крыві ці яе кампанентаў трэба прайсці медагляд і мець на руках даведку аб усіх перанесеных хваробах, праходжанні флюараграфіі, жанчынам — заключэнне гінеколага. Увогуле, служба крыві валодае нават больш поўнай інфармацыяй пра стан здароўя донара, чым паліклініка па месцы яго жыхарства. За адзін раз у донара бярэцца доза крыві ў 450 мілілітраў. Наступны раз яе можна здаць толькі праз 60 дзён, але ў донара-мужчыны за год можа быць пяць крывааддачаў, а ў донара-жанчыны — не больш за чатыры. Плазму і клеткі крыві можна здаваць праз кожныя 14 дзён, пасля пяці такіх працэдур — месяц перапынку. Выходзіць, за квартал можа быць не больш за пяць плазмаздачаў.

— Здачы крыві — бясплатная. Донарам выплачваецца грашовая кампенсацыя за харчаванне з разліку 45 працэнтаў ад базавай велічыні (15 750 рублёў) плюс выплачваецца 1,5 базавыя велічыні (52 500 рублёў) за два працоўныя дні, калі грамадзянін вызваляецца ад выканання сваіх працоўных абавязкаў: у дзень здачы плюс даецца яшчэ адзін дадатковы вольны дзень, які чалавек можа выкарыстаць у любы зручны для яго час (адразу, далучыць да водпуску), — сказала далей Тамара Ніканчык. — У гэтыя дні за грамадзянінам захоўваецца выплата сярэдняга заробку: 26 250 рублёў за дзень. Калі ў донара гэты сярэднядзённы заробак большы, напрыклад, складае 50 тысяч рублёў, ён бярэ даведку са сваёй бухгалтэрыі за апошнія тры месяцы. Такім чынам, донар крыві атрымлівае кампенсацыю ў памеры 68 250 рублёў плюс 52 тысячы рублёў за два дні (або большая сума ў залежнасці ад сярэдняга заробку).

Пры здачы плазмы крыві грашовая кампенсацыя налічваецца аналагічным шляхам: памянёныя 68 250 рублёў плюс 0,75 працэнта ад базавай велічыні за адну дозу плазмы ці 1,5 базавыя — за двайную. Пры здачы двайной дозы выходзіць 120 750 рублёў плюс выплата сярэдняга заробку з разліку 26 250 рублёў за адзін дзень або большай сумы згодна з пададнай даведкай аб сярэднім заробку грамадзяніна за апошнія тры месяцы. Усе сродкі выплачваюцца за кошт службы крыві.

Як адзначыла напрыканцы размовы Тамара Аляксандраўна, колькасць донараў застаецца стабільная. На працягу года адзначаюцца толькі сезонныя ваганні, скажам, летам, асабліва ў ліпені-жніўні, калі распачынаецца час масавых водпускаў, колькасць донараў крыху змяншаецца. І яшчэ. Хоць запасаў крыві з рэдкім адмоўным рэзусфактарам дастаткова, Тамара Ніканчык выказала пажаданне, каб такія людзі звярталіся ў службу крыві і станавіліся донарамі.

Плюсы: высакародная місія, прыстойная грашовая кампенсацыя.

Мінусы: падыходзіць толькі для абсалютна здаровага чалавека.

Кошт друкаванага слова

Некалі кніга, як прынята было гаварыць, з'яўлялася лепшым падарункам. Цяпер жа нярэдка падчас рамонту хатнія бібліятэкі, што ранейшыя пакаленні збіралі дзесяцігоддзямі, больш маладыя проста выносяць на сметнік. Не падымаецца рука так зрабіць цяпер хіба толькі ў пенсіянераў. Кнігі яны паранейшаму нясуць у букіністычныя магазіны з надзеяй зарабіць дадатковую капейчыну. У сталіцы сёння працуюць дзве букіністычныя секцыі і дзве такія ж кнігарні. Мы патэлефанавалі ў адну з іх, што на праспекце Незалежнасці.

— Чэргі пераважна з пенсіянераў у нас кожны дзень. І крызіс тут, думаецца, ні пры чым — яны былі і раней, — зазначылі нам.

Як усё адбываецца? Таваразнаўца, які дакладна ведае, якая літаратура можа карыстацца попытам у пакупнікоў, адбірае кнігі і выстаўляе разам з клієнтам цану. Камісія гандлёвай арганізацыі складае 30 працэнтаў. Калі літаратуру на працягу пэўнага часу не купілі, здатчык можа яе забраць. У гэтым выпадку некалі ён мусіў заплаціць кнігарні суму ў 3 працэнты ад кошту кнігі, але цяпер гэтая норма адмененая.

Што сёння карыстаецца попытам і можа быць з карысцю для здатчыка рэалізавацца праз букіністычныя магазіны? На якую суму грошай (і за якую літаратуру) можа разлічваць такі чалавек?

Мастацкая літаратура прымаецца выбарачна. Некаторыя аўтары (напрыклад, Дзюма, Друён) у савецкія часы выдаваліся мільённымі накладамі, кнігі гэтых і іншых аўтараў былі практычна ў кожнай хатняй бібліятэцы. Адпаведна, цяпер яны каштуюць зусім няшмат. У кнігарні «Злачынства і кара» можна купіць за 3 тысячы рублёў, гэтак жа як і «Пятра Першага». Перавага аддаецца класіцы, найперш той, што раней выдавалася ў невялікай колькасці. У кожнага аддзела ці магазіна свая пэўная спецыялізацыя.

— Мы прымаем ад насельніцтва літаратуру на эканамічныя тэмы, падручнікі (зразумела, не для школы), манаграфіі. Безумоўна, і тут ёсць свае нюансы. Вучэбная літаратура, што карыстаецца найбольшым попытам, гэта падручнікі па матэматыцы, фізіцы. Яны павінны быць максімум 20-гадовай даўніны па выпуску. Манаграфіі — любых гадоў выдання. Добра разыходзіцца перакладзеная з нямецкай, англійскай моваў такая літаратура — у савецкія часы існавалі вельмі добрыя выдавецтвы «Свет», «Прагрэс», — расказалі работнікі букіністычнага магазіна. — За здадзеную вучэбную літаратуру здатчык можа атрымаць 5—10, 20 тысяч рублёў. Перакладзеная манаграфія прынясе грамадзяніну 15—20—25 тысяч. За падпісныя выданні (у залежнасці ад аўтара твора, колькасці перавыданняў) можна атрымаць 70—100 і нават 150 тысяч рублёў.

Плюсы: адзін з простых спосабаў; можна за грошы пазбавіцца ад літаратуры, якая вам не спатрэбіцца, а некаму прынясе карысць.

Мінусы: на вялікія сумы разлічваць асабліва не даводзіцца; ёсць, на мой погляд, і пэўны маральны момант...

Здаць тавар на камісію

Калі мы «ўзяліся» распрадаваць кнігі, дык чаму б не рэалізаваць і шафу з-пад іх? Гэта не жарт — сёння ў Мінску працуюць 6 магазінаў і 2 секцыі камісійнага гандлю (іх колькасць застаецца нязменнай ужо працяглы час). Тым больш што, паводле слоў **начальніка аддзела арганізацыі гандлю галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Аляксея РАМАНАВА**, найбольшым попытам у наведвальнікаў «камісіёнак» карыстаецца сёння менавіта корпусная мэбля рознага прызначэння.

Праўда, трэба ведаць, што пералік рэчаў, якія ў вас не прымуць на камісію, дастаткова вялікі. Увесь яго прыводзіць не будзем, назавём, у прыватнасці, парфумерна-касметычныя тавары; тавары бытавой хіміі; бялізну; тавары для нованароджаных (бялізна, цацкі, бутэлечкі); цацкі для дзяцей да трох гадоў, мяккія цацкі; лекавыя сродкі і вырабы медыцынскага прызначэння, за выключэннем тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі для перамяшчэння (кійкі, мыліцы), інвалідныя крэслы-каляскі, хадункі спецыяльныя для перамяшчэння хворых з парушэннем функцый ніжніх канечнасцяў і іншыя); газавая апаратура без засведчання адпаведнымі службамі газавай гаспадаркі на прыдатнасць да далейшага выкарыстання і інш.

Цэны на здадзеныя на камісію рэчы — дагаворныя, яны вызначаюцца сумесна з гандлёвымі работнікамі. Звыш вызначанай сумы магазін накідвае «свае» 30 працэнтаў. Зразумела, тавар хоць і быў у карыстанні, але павінен мець добры стан. Рэчы прымаюцца на камісію па прад'яўленні дакумента, што сведчыць асобу.

Пераацэнка тавару, калі яго не купіць, праводзіцца не больш за тры разы (пры згодзе камісіянера іх колькасць можа быць павялічана). Першая праводзіцца праз 20 дзён з даты заключэння дагавора камісіі, другая і трэцяя — не менш чым праз 14 дзён з часу папярэдняй пераацэнкі. Трэцяя пераацэнка прынятага на камісію тавару праводзіцца з выклікам здатчыка-камітэнта. Пры адмове апошняга ад трэцяй пераацэнкі яму вяртаецца прыняты на камісію тавар з пакрыццём камісіянеру (магазіну) выдаткаў па яго захоўванні, памер якіх вызначаецца дагаворам камісіі. Калі камітэнт без уважлівай прычыны не з'явіцца па выкліку, дык магазін мае права знізіць цану продажу прынятага на камісію тавару да цаны яго рэалізацыі. Калі здадзеныя магазінам рэчы знойдуць свайго пакупніка, грашовыя сродкі павінны быць выплачаны яму не пазней, чым на трэці працоўны дзень пасля рэалізацыі тавару.

Плюсы: можна пазбавіцца ад непатрэбных у гаспадарцы рэчаў за грошы; нехта зможа набыць патрэбнае за лепшыя, чым у звычайным гандлі, сродкі.

Мінусы: дастаўка; пры нізкім попыце на тавар — не хуткае атрыманне сродкаў або ўвогуле вяртанне яго назад.

Сяргей РАСОЛЬКА.

(Працяг будзе.)

Кантроль за цэнамі на платныя медыцынскія паслугі

Рост у 2009 годзе тарыфаў на платныя медыцынскія паслугі не можа перавышаць у сярэднім 0,8—0,9 працэнта ў месяц — менавіта такое абмежаванне ўтрымліваецца ў інфармацыйным лісце Міністэрства аховы здароўя, адрасаваным начальнікам абласных упраўленняў аховы здароўя, старшыні Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, кіраўнікам арганізацый аховы здароўя, установ адукацыі, падпарадкаваных Міністэрству аховы здароўя, і кіраўнікам арганізацый як дзяржаўнай, так і недзяржаўнай формы ўласнасці, якія аказваюць насельніцтву платныя медыцынскія паслугі.

Разам з тым, у выпадку магчымай стратнасці платных медыцынскіх паслуг, цэны (тарыфы), сфарміраваныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі дзейных нарматыўных прававых актаў, могуць быць павялічаны і больш чым на 0,8-0,9 працэнта ў месяц — **пасля разгляду гэтага пытання ў Міністэрстве аховы здароўя з выдачай экспертнага заключэння**.

Адпускныя тарыфы на новыя віды платных медыцынскіх паслуг, якія аказваюцца ўсімі суб'ектамі гаспадарання, незалежна ад формы ўласнасці абавязкова рэгіструюцца ў Міністэрстве аховы здароўя ў выпадку атрымання суб'ектам гаспадарання ліцэнзіі на медыцынскую дзейнасць і ажыццяўлення гэтай дзейнасці, аказання медыцынскіх паслуг іншага кшталту, акрамя тых, што аказваюцца і зарэгістраваныя ў Міністэрстве аховы здароўя, аказання платных медыцынскіх паслуг, якія не ўвайшлі ў прэйскуранты з максімальна гранічным узроўнем цэнаў (тарыфаў), зацверджаныя пастановамі Міністэрства аховы здароўя.

Рашэнне аб змяненні цэнаў (тарыфаў) на тавары (работы, паслугі) прымаецца кіраўніком арганізацыі аховы здароўя самастойна. Загадам па арганізацыі аховы здароўя павінна быць прызначана асоба пры пасадзе, адказная за парадак фарміравання і зацвярджэння ў 2009 годзе цэнаў (тарыфаў) на тавары (работы, паслугі). Пасля кожнага праведзенага перагляду цэнаў (тарыфаў) у дзесяцідзённы тэрмін у Міністэрства аховы здароўя павінны падавацца загады аб зацвярджэнні цэнаў (тарыфаў), іх узроўню і працэнта змянення з прыкладаннем кароткай тлумачальнай запіскі аб прычынах павелічэння.

Трэба дадаць, што платныя медыцынскія паслугі аказваюцца насельніцтву па жаданні звыш тых аб'ёмаў бясплатнай медыцынскай дапамогі, якія вызначаны дзяржаўнымі мінімальнымі сацыяльнымі стандартамі ў галіне аховы здароўя. З 20 лютага ў Беларусі пачаў дзейнічаць новы Пералік платных медыцынскіх паслуг, якія аказваюцца грамадзянам Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі ўстановамі аховы здароўя. У новы пералік, напрыклад, быў уключаны ўвесь спектр лабараторна-дыягнастычных даследаванняў, прамянёвая дыягностыка (ультрагукавыя метады даследавання, магнітна-рэзанансная тамаграфія, рэнтгеналагічныя метады, уключаючы рэнтгенакантрасныя, рэнтгенаўская камп'ютарная тамаграфія), фібраэндаскапія, пастаноўка скурных алергапробаў, дыягнастычная каранараангіяграфія. Але па медыцынскіх паказаннях усе гэтыя даследаванні паранейшаму будуць ажыццяўляцца бясплатна.

Надзея НІКАЛАЕВА.

70 айчынных прадпрыемстваў могуць атрымаць дзяржзаказ на камплектныя часткі для АЭС

Пра гэта паведаміў журналістам генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны» Вячаслаў Куўшынаў. Прыклад кітайцаў сведчыць, што задзейнічанне ўласнага вытворчага патэнцыялу можа зрабіць праект будаўніцтва АЭС таннейшым на 30 працэнтаў. А гэта каласальная эканомія.

Спецыялісты сцвярджаюць, што атамны праект можна разглядаць не толькі як энергетычны, але і як інавацыйны для нашай краіны: паколькі мы ўпершыню будзем выконваць у такім маштабе новыя для нас задачы. І тут (з дазволу генеральнага заказчыка) у беларускай прамысловасці з'яўляюцца шанцы актыўна ўключыцца ў гэтую работу. Ужо вызначаны спіс прадпрыемстваў, якія маюць адпаведныя магчымасці, а таксама пералік абсталявання, якое гэтыя прадпрыемствы могуць вырабіць, і яго неабходныя аб'ёмы. Пакуль што размова ідзе аб трубаправоднай арматуры, помпах, цеплаабменніках, трубаправодах і іншым. Зараз разглядаецца магчымасць уласнай вытворчасці неабходных будаўнічых матэрыялаў і канструкцый. Пакуль што адабрана 70 прадпрыемстваў, аднак спіс удзельнікаў можа быць пашыраны.

Навуковае суправаджэнне праекта атамнай станцыі і развіцця атамнай энергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь — адна з самых важных задач інстытута. Асноўнымі кірункамі праграмы навуковага суправаджэння будаўніцтва АЭС генеральны дырэктар назваў стварэнне нарматыўнай базы, мадэляванне працэсаў, якія могуць адбывацца ў ядзерным рэактары, міжнароднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва, экспертызу абсталявання і распрацоўку метадаў ацэнкі якасці абсталявання, інфармацыйнае забеспячэнне кіраўніцтва і насельніцтва, падрыхтоўку кадраў. Што тычыцца апошняга кірунку, асноўны аб'ём задач ускладзены на Міністэрства адукацыі. Канкрэтная задача інстытута «Сосны» — падрыхтоўка кадраў вышэйшай адукацыі (аспірантаў і дактароў навук) і забеспячэнне абсталяваннем для лабараторных работ. Зараз тут ствараюцца вучэбны і вылічальны цэнтры, дзе мяркуецца ўстаноўка супер-камп'ютара СКИФ-500. У галоўных ВНУ арганізоўваецца чытанне лекцый па тых тэмах, якія спатрэбяцца на АЭС.

Галоўная мэта праграмы навуковага забеспячэння праекта АЭС — аптымізацыя надзейнасці, бяспекі і эфектыўнасці работы атамнай станцыі, мінімізацыя ўплыву на навакольнае асяроддзе і насельніцтва. Заказчык

Пытальнік

Хачу купіць трактар у прыватніка. Як правільна аформіць здзелку?

Я хачу купіць трактар МТЗ. Гаспадар трактара мае на яго дакументы, сельгасмашына зарэгістравана ў Дзяржсельтэхнаглядзе, ёсць тэхнічны пашпарт і дзяржаўны нумар. Патлумачце, які парадак куплі-продажу гэтай тэхнікі на сённяшні дзень?

Віктар СВІГЛА, *г. Косава*

Наколькі можна зразумець з кантэксту ліста чытача, гаворка ідзе пра магчымую здзелку паміж фізічнымі асобамі. Тады цалкам зразумелы зварот заяўніка ў рэдакцыю: параўнальна нядаўна ў парадак куплі-продажу колавых трактароў і самаходных машын менавіта для грамадзян-прыватнікаў былі ўнесены пэўныя змяненні. Верагодна, не ўсе грамадзяне пра гэта маюць дакладную падрабязную інфармацыю. Калі коратка: працэдура куплі-продажу вышэйназванай тэхнікі была значна спрошчана.

— Уладальнікаў колавых трактароў і іншых самаходных машын ураўнавалі ў правах з уладальнікамі аўтатранспарту. Скажам, куплю-продаж аўтамабіля грамадзянін афармляў у ДАІ бясплатна. А вось уладальнік трактара праходзіў больш складаны шлях, — патлумачыў *галоўны інжынер-дзяржінспектар галоўнай дзяржаўнай інспекцыі па наглядзе за тэхнічным станам машын і абсталяваннем Мінсельгасхарча Пётр ВОЛЬСКІ.* — Прадаць раней той жа трактар можна было праз камісійную краму, альбо засведчыць здзелку куплі-продажу ў натарыуса. Пры гэтым грамадзянін павінен быў заплаціць за паслугі камісійнай краме 70—75 тысяч рублёў, а пры звароце да натарыуса — аплаціць дзяржпошліну ў памеры 175 тысяч рублёў (5 базавых велічынь). Безумоўна, і зараз ніхто не перашкаджае грамадзянам звяртацца да паслугаў камісійнага гандлю (дарэчы, не ў кожным раёне ёсць такія крамы), аднак цяпер ёсць і больш простыя шляхі. З гэтай мэтай былі ўнесены змяненні і дапаўненні ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 504 ад 15 кастрычніка 2007 года і ў пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь №1459 ад 5 лістапада 2007 года. Гэтымі дакументамі вызначана, што дагавор куплі-продажу таго ж трактара цяпер рэгіструецца толькі ў інспекцыях Дзяржнагляду.

Як патлумачыў далей Пётр Уладзіміравіч, адказваючы на пытанне нашага чытача, месца рэгістрацыі дагавора куплі-продажу трактара найперш залежыць ад таго, зняў ці не зняў з уліку ў інспекцыі Дзяржнагляду гэтую тэхніку яе прадавец. Калі трактар не зняты з уліку, для афармлення дагавора куплі-продажу неабходна звяртацца ў інспекцыю Дзяржтэхнагляду па месцы рэгістрацыі тэхнікі. Працэдура гэта зараз бясплатная — як і пры рэгістрацыі аўтамабіля. Усю неабходную інфармацыю можна будзе атрымаць непасрэдна ў дзяржінспектараў.

Калі ж колішні гаспадар трактара ўжо зняў тэхніку з рэгістрацыі, дык дагавор куплі-продажу можна будзе аформіць як па месцы знаходжання пакупніка, так і ўвогуле ў любой іншай інспекцыі Дзяржтэхнагляду. Усе яны, як правіла, знаходзяцца ў складзе ўпраўленняў сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкамаў (ёсць 8 гарадскіх інспекцый).

РАЗАМ І ПААСОБКУ

Кватэрнае пытанне

Сем гадоў таму я ўзяў крэдыт, разам з жонкай пабудавалі кватэру. Але жыцця ў ёй няма, усё ідзе да разводу. Падкажыце, як у гэтым выпадку будзе дзяліцца кватэра і хто павінен выплачваць атрыманы крэдыт?

Я.К., *г. Брэст*

Пабудаванае мужам і жонкай у перыяд шлюбу жылое памяшканне (незалежна ад таго, на каго з іх яно аформлена або на каго ці кім з іх унесены грашовыя сродкі) з'яўляецца іх агульнай сумеснай уласнасцю, калі іншае не вызначана законам або дагаворам. Правілы вызначэння частак мужа і жонкі ў агульнай маёмасці пры яе падзеле і парадак такога падзелу вызначаны заканадаўствам аб шлюбе і сям'і.

Пры падзеле жылога памяшкання, якое з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю мужа і жонкі, іх долі ў адпаведнасці з арт. 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і прызнаюцца роўнымі, калі іншае не прадугледжана Шлюбным дагаворам. Суд мае права адступіць ад прызнання частак роўнымі, улічваючы інтарэсы няпоўнагадовых дзяцей або інтарэсы мужа ці жонкі, якія заслугоўваюць увагі.

Роўнымі правамі на сумесна нажытую маёмасць муж і жонка карыстаюцца і ў тым выпадку, калі адзін з іх у перыяд шлюбу быў заняты вядзеннем хатняй гаспадаркі, доглядам дзяцей або па іншых уважлівых прычынах не меў самастойнага заробку (даходу).

Што датычыцца пагашэння крэдыту, то ў адпаведнасці з п. 14 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 2003 г. № 2, калі жылое памяшканне будавалася, набывалася мужам і жонкай не толькі за кошт сумесных сродкаў, але і за кошт сродкаў, атрыманых імі ў крэдыт у перыяд сумеснага пражывання і вядзення хатняй гаспадаркі, суд мае права падзяліць жылое памяшканне паміж мужам і жонкай са згоды крэдытора, усклаўшы на кожнага з іх абавязак па далейшым пагашэнні крэдыту ў адпаведных частках.

Калі ж разлік за крэдыт і па іншых грашовых абавязацельствах за жылое памяшканне зрабіў муж або жонка пасля распаду сям'і з уласных сродкаў, суд мае права задаволіць яго патрабаванні аб павелічэнні часткі ў праве ўласнасці на жылое памяшканне, толькі пры наяўнасці доказаў аб тым, што хтосьці з іх наўмысна ўхіляўся ад разлікаў па гэтых абавязацельствах. Спрэчкі, звязаныя з правам уласнасці на жылыя памяшканні, разглядаюцца судамі ў парадку іскавай вытворчасці.

Віктар САВІЦКІ.

КАЛІ Ў ДАГАВОРЫ ЗАПІСАНА...

У мяне два месцы працы, і па асноўным — улік грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў не вядзецца. Ці магу я ў гэтым выпадку стаць на чаргу ў арганізацыі, дзе працую па сумяшчальніцтве?

А.Г., *г. Гомель*

Дзейнае жыллёвае заканадаўства не ўтрымлівае спецыяльных дазваляльных або забараняльных нормаў па рэгуляванні гэтага пытання.

Пунктам 8 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) вызначана, што ўлік грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, працуюць (праходзяць службу) у дзяржаўных органах, іншых арганізацыях, якія маюць ва ўладанні, карыстанні жылыя памяшканні і (або) ажыццяўляюць жыллёвае будаўніцтва або прымаюць у ім долевы ўдзел, вядзецца па месцы працы (службы) гэтых грамадзян, а па іх жаданні — таксама і па іх пастаянным месцы жыхарства.

У пункце 5 названага Палажэння вызначана таксама, што арганізацыі, якія маюць ва ўласнасці, на праве гаспадарчага вядзення або аператыўнага кіравання жылыя памяшканні, у вызначаным парадку могуць прадугледжваць (па ўзгадненні з уласнікам або ўпаўнаважанай ім асобай) у калектыўных дагаворах дадатковыя падставы для прызнання ў сваіх работнікаў патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Пры гэтым паляпшэнне жыллёвых умоў такіх работнікаў ажыццяўляецца толькі па месцы іх працы.

Таму ўяўляецца, што калі па асноўным месцы працы грамадзяніна кватэрны ўлік не вядзецца з-за адсутнасці жыллёвага фонду і (або) магчымасці ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве (што павінна быць афіцыйна пацверджана), а праца па сумяшчальніцтве ў іншай арганізацыі мае пастаянны характар, то работнік-сумяшчальнік можа быць прыняты на ўлік асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, у выпадку, калі гэта будзе ў вызначаным парадку прадугледжана ў калектыўным дагаворы.

Віктар САВІЦКІ.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Ці можна пераабсталяваць машыну на ручное кіраванне для інваліда?

У рэдакцыю па «гарачай лініі» звярнулася мінчанка (адрас жыхарства і прозвішча ёсць, але заяўніца прасіла іх не ўказваць) з пытаннем, што мела дачыненне да яе мужа.

— Ён у мяне інвалід III групы, у яго праблемы з левай нагой. Папярэдні аўтамабіль з аўтаматычнай каробкай перадач, які ў нас быў дагэтуль, трапіў у аварыю. Зараз мы хацелі б набыць новую машыну з механічнай каробкай перадач, скажам, «Фальксваген Гольф» ці «Фальксваген Джэта», а потым перарабіць яе на ручное кіраванне для інваліда. У нас пытанне: калі ўсё так і зрабіць, ці не ўзнікнуць потым з пераабсталяваным аўтамабілем праблемы пры праходжанні тэхнічнага агляду? — пыталася жанчына.

На гэтае пытанне мы папрасілі даць адказ *старшага інспектара па асаблівых даручэннях аддзела рэгістрацыйна-экзаменацыйнай дзейнасці і тэхнічнага нагляду ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі маёра міліцыі Андрэя ШАРАНДУ.*

— Такое права на пераабсталяванне аўтамабіля пад ручное кіраванне для інваліда ў грамадзян ёсць. Для гэтага вашым заяўнікам трэба найперш звярнуцца з адпаведнай заявай-просьбай у наша рэгістрацыйнае падраздзяленне па месцы жыхарства. Да яе трэба будзе прыкласці і медыцынскія дакументы, што сведчаць факт інваліднасці, — патлумачыў Андрэй Мікалаевіч. — Потым ім трэба самастойна шукаць арганізацыю, якая магла б выканаць патрэбнае пераабсталяванне. Праўда, я такіх арганізацый, шчыра скажу, не ведаю. Наколькі магу меркаваць, грамадзяне або самастойна праводзяць патрэбныя ім работы, або звяртаюцца да спецыялістаў-прыватнікаў.

Адначасова з атрыманнем дазволу на пераабсталяванне аўтамабіля з механічнай каробкай перадач пад ручное кіраванне для інваліда, грамадзяне атрымаюць у ДАІ і накіраванне ў адну з акрэдытаваных лабараторый, дзе будзе праведзена экспертыза на адпаведнасць гэтага транспартнага сродку патрабаванням прававых тэхнічных актаў і патрабаванням бяспекі дарожнага руху. Калі вынікі экспертызы будуць станоўчымі, аўтамабіль зарэгіструюць. Але найлепшае выйсце ў такой сітуацыі набыццё для інваліда транспартнага сродку з аўтаматычнай каробкай перадач.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МІЁРСКІЯ НАВІНЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У МІНСКУ НА ПАЧАТАК ГОДА ПРАЖЫВАЛІ 1 МІЛЬЁН 828,9 ТЫСЯЧЫ ЧАЛАВЕК

Колькасць насельніцтва сталіцы ўзрасла за 2008 год на 14,1 тысячы чалавек — як за кошт міграцыйнага, так і натуральнага прыросту, паведамілі ў Галоўным статыстычным управленні Мінска.

Міграцыйны прырост склаў 11 056 чалавек і адбываўся ў асноўным за кошт прыезду жыхароў з абласцей Рэспублікі Беларусь. Што да краін СНД і Балтыі, то найбольшая колькасць мігрантаў прыбыла ў Мінск з Расіі і Украіны. Натуральны прырост насельніцтва за мінулы год у цэлым па горадзе склаў 3059 чалавек. У 2008 годзе нарадзілася 20 806 малых (у 2007-м — 19 483). Усяго за 2008 год памерлі 17 747 жыхароў сталіцы (у 2007-м — 17 176).

Святлана ФРАЛЯНКОВА, *«Мінск—Навіны».*

У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **ЦЕРАХАВА Дзмітрыя Анатольевіча,** 29 верасня 1942 года нараджэння, ураджэнца г. Гомеля, апошняе месца жыхарства — г. Гомель, вул. Катоўскага, д. 24. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Церахава Дз. А., паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна на адрас: г. Рэчыца, вул. К. Маркса, 30 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Прамая лінія

УСЁ ЛЕПШАЕ — СЭРЦУ

Карысныя падказкі падчас «прамой лініі» далі загадчык інфарктнага аддзялення № 2 10-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы Наталля ПАЛЯЎКОВА і ўрач-кардыёлаг блока інтэнсіўнай тэрапіі таго ж аддзялення Ірына ГРЫШЫНА.

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 21, 24, 25 лютага.)

☎ — Валянціна Пятроўна, Касцюковічы. Мне 57 гадоў. Дыягназ — стэнакардыя напружання. Што гэта такое? Чым пагражае? Прызначылі дыласідом. Можа, ёсць найноўшыя прэпараты?

— Стэнакардыя напружання — дастаткова сур'ёзны дыягназ. Гэта неадпаведнасць паміж патрэбай і магчымасцю атрымання сардэчнай мышцай кісларoду з-за атэрасклерозу. З узростам у сасудах адкладваецца халестэрын і ўтвараюцца атэрасклератычныя бляшкі, якія могуць разрастацца і перакрываць прасвет сасудаў. Калі нічога не рабіць, то крайняя ступень ускладнення такой стэнакардыі — гэта інфаркт міякарда. Каб не дапусціць такога развіцця падзей, вы павінны прымаць маленькія дозы інгібітараў АПФ. І, зразумела, абавязкова назіравацца ва ўчастковага тэрапеўта і кардыёлага.

☎ — Алена Васільеўна з Гродна. Мне 54 гады. Якой павінна быць норма халестэрыну ў такім узросце?

— Норма халестэрыну і ў мужчыны, і ў жанчыны павінна быць менш за 5,2 ммол/л. У людзей з цукровым дыябетам, асобаў, якія перанеслі інфаркт міякарда або якія маюць высокую рызыку яго развіцця — не больш за 4,5 ммол/л.

☎ — Мінскі раён, Іна Рыгораўна. Летась у жніўні ў мяне быў гіпертанічны крыз, трапіла ў бальніцу. Там зрабілі ўльтрагукавое даследаванне сэрца і высветлілася, што павялічаны жалудачак. Наколькі гэта небяспечна?

— Пры артэрыяльнай гіпертэнзіі, як правіла, назіраецца гіпертрафія левага жалудачка. Калі не прымаць гіпатэнзіўных прэпаратаў, гэта небяспечна развіццём сардэчнай недастатковасці ажно да гіпертрафічнай кардыяміпатыі або, наадварот, дэлітацыйнай кардыяміпатыі. Каб гэтага не адбылося, трэба весці правільны лад жыцця: прытрымлівацца гіпахалестэрынавай дыеты, зніжаць вагу, кантраляваць узровень халестэрыну, абмяжоўваць фізічныя нагрузкі. Таксама трэба прымаць прэпараты і ў першую чаргу — групы інгібітараў АПФ. І, зразумела, абавязкова назіравацца ва ўчастковага тэрапеўта і кардыёлага.

☎ — Узда, Георгій Канстанцінавіч. З высокім ціскам змагаюся з 1986 года. Апошнім часам ціск, асабліва вечарам, павышаецца, пачашчаецца пульс. Прыма́ў эналапрыл, амладыпін. Што можна параіць мне яшчэ?

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— У першую чаргу весці здаровы лад жыцця, мець умераныя нагрузкі, зніжаць вагу. Дарэчы, паводле некаторых звестак медыцынскай літаратуры, зніжэнне вагі на 1 кг — гэта мінус 10 адзінак ртутнага слупа артэрыяльнага ціску. Варта ўжываць ежу без солі або маласалёную. Яшчэ я параіла б вам прэпараты групы бэта-блакатараў. Але рабіць гэта трэба пад кантролем участковага доктара ці кардыёлага.

☎ — Анастасія, Магілёў. Якія сімптомы могуць сведчыць пра набліжэнне інсульту?

— Пра набліжэнне інсульту можа сведчыць рэзкі галаўны боль, галавакружэнне, зніжэнне зроку, слабасць у нагах і руках. Як правіла, гэта адбываецца на фоне высокага ціску. Можа быць страта арыентацыі, памяці, выпадзенне асобных слоў ці ўвогуле адсутнасць маўлення. Пры такіх сімптомах трэба абавязкова выклікаць «хуткую дапамогу».

☎ — Дзяржынск, Мікалай. Чуў, што прыём біялагічна актыўных дабавак з селенам дапаможа трэніраваць сардэчную мышцу. Ці так гэта? Калі так, то якія БАДы вы маглі б парэкамендаваць?

— БАДы мы не рэкамендуем. А вось полівітаміны з утрыманнем селену, якія прадаюцца ў аптэках, прымаць можна пад назіраннем доктара. Але іх прыём можа быць у якасці дадатковай тэрапіі, а ні ў якім разе замест асноўных прэпаратаў.

☎ — Святлана, званю з Міёраў. Ці можа працяглая дэпрэсія прывесці да развіцця артэрыяльнай гіпертэнзіі?

— Працяглая дэпрэсія, а таксама сімптом хранічнай стомленасці — адны з асноўных фактараў рызыкі па развіцці артэрыяльнай гіпертэнзіі і інфаркту міякарда. Пры хранічных стрэсах выдзяляецца адрэналін, так званы гармон страху, які можа прывесці да пашкоджання сардэчнай мышцы, да інфаркту міякарда і інсульту. Калі вы адчуваеце, што самі не спраўляецеся са сваім псіхічным станам, то неабходна звярнуцца да спецыяліста, у дадзеным выпадку да псіхатэрапеўта.

☎ — Мікалай з Мінска. Скажыце, які артэрыяльны ціск лічыцца нармальным у чалавека 60 гадоў?

— Артэрыяльны ціск у гэтых людзей лічыцца нармальным пры такіх паказчыках — не вышэй за 140/90. Калі вышэй, гэта ўжо артэрыяльная гіпертэнзія. У людзей, якія маюць цукровы дыябет, узровень ціску — 130/80.

☎ — Салігорск, Галіна Іванаўна. Мая маці перанесла востры каранарны сіндром. Ці трэба ёй захоўваць нейкія асобыя правілы пасля выпіскі з бальніцы?

— Здаровае харчаванне, рэгулярны прыём прэпаратаў, умераныя фізічныя нагрузкі, трэба сачыць за ўзроўнем халестэрыну і назіравацца ў кардыёлага па месцы жыхарства. Вельмі важнымі з'яўляюцца станоўчыя эмоцыі і добры настрой.

☎ — Антаніна, Віцебск. Ужо наступіў час прастуды і грыпу. Наколькі небяспечныя гэтыя хваробы для людзей, якія маюць хранічныя захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы?

— Грып і ангіну катэгарычна забаронена пераносіць на нагах. Гэта можа прывесці да міякардытаў, кардыяміпатый, абвастрэння сардэчна-сасудзістых захворванняў і г.д., што далей можа пагражаць інваліднасцю. Таму падчас прастудных і вірусных інфекцый, ангіны, грыпу лепей адлежацца 6—7 дзён, каб потым не мець ускладненняў.

☎ — Андрэй, Мінск. Мне за 40 гадоў. Бывае такая сітуацыя, што быццам «заходзіцца» сэрца. Цяжка дыхаць, коле пад лапаткай. З чым гэта можа быць звязана?

— Мужчынскі пол — адзін з фактараў рызыкі па развіцці ішэмічнай хваробы сэрца. Усім мужчынам пасля 40 гадоў трэба рабіць кардыяграму, ведаць свой узровень халестэрыну, кантраляваць ціск.Такія сімптомы, як «цяжка дыхаць», «коле пад лапаткай», могуць сведчыць пра тое, што ў вас або павышаны ціск, або гэта задышка з'яўляецца праявай стэнакардыі. Таму вам неабходна звярнуцца да доктара, здаць біяхімічны аналіз крыві на ліпідаграму, зрабіць электракардыяграму і правесці нагрузачныя тэсты. Яшчэ звярніце ўвагу на шкодныя звычкі: курэнне, лішак алкаголю.

☎ — Мінск, Міхаіл Іванавіч. Мне 67 гадоў, выстаўлены дыягназ — пачатковая ішэмія. Прапісаны наступныя прэпараты: верапаміл гідрахларыд 80 мл, эналапрыл. Якія яшчэ меры прафілактыкі могуць быць супраць хваробы? Магчыма, трэба дадаць яшчэ нейкія лекі?

— Меры прафілактыкі такія: здаровы лад жыцця, адмова ад шкодных звычак, кантроль за ўзроўнем ціску і халестэрыну, зніжэнне фізічных нагрузак. Трэба звярнуць увагу на спадчыннасць, бо артэрыяльная гіпертэнзія і ішэмічная хвароба сэрца могуць перадавацца ў спадчыну. Дадатковыя лекі можна прымаць толькі пад кантролем кардыёлага, у якога неабходна рэгулярна назірацца.

Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

ЗЯМЕЛЬНАЕ ПЫТАННЕ ПАТРАБУЕ ЗРАЗУМЕЛАСЦІ І ДАКЛАДНАСЦІ

На пытанні чытачам выдання адказваў на «прамой лініі» старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Георгій Іванавіч КУЗНЯЦОЎ.

(Працяг. Пачатак у нумары за 25 лютага.)

☎ — Напрыканцы мінулага года мы з мужам як маладая сям'я сталі ў чаргу асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Зараз мы збіраемся пабудаваць уласны дом у прыгарадзе свайго горада. Куды нам звяртацца, каб нас паставілі ў чаргу на зямельны ўчастак? Ці маем мы на гэта права?

Ганна Васільеўна, *г. Салігорск.*

— Так, вы маеце права на атрыманне зямельнага ўчастка. З 1 мая ўступае ў сілу Указ кіраўніка дзяржавы № 64 ад 6 лютага 2009 года, дзе прадугледжаны змяненні нормаў па выдзяленні і адбіранні зямельных участкаў для будаўніцтва жылля. У гэтым дакументе аблвыканкамам даручана разабрацца, якім чынам будзе рэгулявацца чарга на атрыманне зямельных участкаў. Ужо ў маі ў гарвыканкаме вам паведамяць, дзе ёсць свабодныя зямельныя ўчасткі. Тады, разам з дакументамі аб тым, што вы маеце патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у горадзе, наведваеце вызначаны сельскі Савет і падаяце заяву аб выдзяленні зямельнага ўчастка для будаўніцтва індывідуальнага жылля. Зараз, згодна з указам № 64, усе грамадзяне, нават тыя, хто не мае патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, могуць атрымаць зямельны ўчастак для будаўніцтва жылля без аўкцыёнаў. Зямельныя ўчасткі па аўкцыёнах будуць прапаноўвацца толькі ў сталіцы і абласных цэнтрах. Для розных катэгорый грамадзян існуюць неаднолькавыя ўмовы атрымання зямельных участкаў. Для тых, хто стаіць у чарзе грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, магчыма атрымаць зямельны ўчастак бясплатна ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну. Калі ў вас ёсць шмат грошай, то вы можаце набыць участак у прыватную ўласнасць па кадастравым кошце. Тыя грамадзяне, якія не з'яўляюцца маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, павінны будуць толькі выкупляць зямельныя ўчасткі ў прыватную ўласнасць па кадастравым кошце.

Упэўнены, што ўжо ў маі зямельныя ўчасткі будуць выдзяляцца. Ва ўказе асобным радком вызначаецца, што вінаватыя службовыя асобы, што не выдзяляюць зямельныя ўчасткі грамадзянам, у пэўных выпадках могуць прыцягвацца да адказнасці.

☎ — Я побач са сваёй вёскай нагледзела адзін зямельны ўчастак, які жадала б узяць для будаўніцтва жылля. Ці змагу я яго аформіць?

Юніцкая Марыя,
Мазырскі раён, вёска Прудок.

— А вы стаіце ў чарзе асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў?

— Не, не стаю.

— Тады вы будзеце вымушаны выкупляць гэты ўчастак ва ўласнасць па кадастравым кошце.

— Выкупляць на аўкцыёне?

— Так, да 1 мая 2009 г., а потым участак выкупляецца па фіксаваным кадастравым кошце.

— Без аўкцыёнаў выкупляць я згодная, але гэты «мой» участак ужо абмералі, а дакументы накіравалі ў вобласць, каб потым прадаваць праз аўкцыён.

— Такое становішча можа быць да 1 мая. Хутчэй за ўсё гэты ўчастак праз аўкцыён прададзены не будзе. З 1 мая ўсе аўкцыёны па продажы зямельных участкаў паўсюль, акрамя Мінска і абласных цэнтраў, адмяняюцца. У Гомелі яшчэ будуць прадаваць зямельныя ўчасткі на аўкцыёнах для тых, хто не мае патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У астатніх населеных пунктах зямельных аўкцыёнаў больш не будзе.

☎ — Маю зямельны ўчастак для вырошчвання агародніны. Ці дазволена мне на гэтым участку пабудаваць невялікую нежылую пабудову?

Леанід Яцук, *г. Кобрын.*

— У якасці часовай гаспадарчай пабудовы вы маеце права пабудаваць хлеў для ўласных мэтаў толькі на зямельным участку, выдзеленым для ўласнай падсобнай гаспадаркі. У вашым выпадку — не.

☎ — Маю ўласны дом. Зямля пад ім была прыватызавана ў 1994 годзе. Зямля і дом афармлены і зарэгістраваны, аднак... Так адбылося, што мы карыстаемся зямлёй прыкладна на 2—2,5 соткі больш, чым афармлена ў дакументах. Ці магчыма нам гэты кавалачак зямлі дапрыватызаваць, але ўжо не ў прыватную ўласнасць, а, напрыклад, у пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну?

Святлана Фурс, *Шчомысліцы.*

— Не, так зрабіць немагчыма, бо ўчастак даецца на адным праве. Гэты маленькі ўчастак нікому не замінае?

— Не. З суседзямі спрэчак няма.

— Вам трэба звярнуцца ў сельскі Савет і аформіць гэты кавалачак зямлі ў пажыццёвае валоданне пад агарод або ў арэнду для сельскагаспадарчых патрэб. Нешта пабудаваць там будзе нельга.

— На колькі гадоў такая арэнда даецца і які памер арэнды?

— Арэнда афармляецца да 99 гадоў, але не менш чым на 10. Арэндная плата сельскагаспадарчай зямлі ў вёсках невялікая, аплачваецца раз у год і прыкладна адпавядае памеру зямельнага падатку.

☎ — У нас з былым мужам ёсць зямельны ўчастак у садаводчым таварыстве. Цяпер з гэтым чалавекам мы ў разводзе. Зямельны ўчастак плошчай 15 сотак знаходзіцца ў Дзяржынскім раёне. Участак мы вырашылі падзяліць так, каб кожнаму было па 7,5 сотак. Аднак побач з маёй паловай зямлі ёсць нібыта лішні невялікі кавалачак зямлі. Можна мне яго прыплюсаваць да сваіх сотак?

Спадарыня Шыловіч, *г. Мінск.*

— Зямельны ўчастак знаходзіцца ў прыватнай уласнасці?

— Так.

— Зараз гэты ўчастак вы можаце падзяліць. Калі будуць якія-небудзь спрэчкі, то толькі праз суд. Інакш у тэрытарыяльным агенцтве яго не зарэгіструюць як аб'ект нерухомасці. Прыплюсоўваць да вашай долі зямельнага ўчастка дадатковыя землі ў судзе ніхто не будзе.

☎ — Недзе чуў, што зараз ужо не дзейнічае норма ў заканадаўстве, па якой жыллё на зямельным участку неабходна было пабудаваць за 3 гады...

Міхаіл Маслакоў,
Мінскі раён, вёска Вішнёўка.

— Так, адпаведным указам кіраўніка дзяржавы прыпынена дзеянне нормы аб абавязковым будаўніцтве жылых аб'ектаў на зямельным участку на працягу максімум 3 гадоў. Цяпер, з 10 лютага, ва ўмовах фінансавай нестабільнасці, уласнікі такіх зямельных участкаў змогуць завяршыць пачатае будаўніцтва і ў больш позні тэрмін.

— Ці вызначаны новы тэрмін магчымага будаўніцтва?

— Не, пакуль новых тэрмінаў няма. Разам з тым, калі вы наўмысна пачняце зацягваць будаўніцтва, калі на ўчастку будзе створаны сметнік будматэрыялаў, то... Мясцовыя службы зробяць адно, а потым другое папярэджанне і адбяруць участак.

☎ — Маю дом у вёсцы, у якім зараз жыву. Зямля была выдзелена мне ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну. Зараз вырашыла аформіць зямлю і дом. Да каго мне цяпер звяртацца і колькі гэта будзе каштаваць?

Спадарыня Новік,
Клічаўскі раён.

— Спачатку вам трэба заказаць у землеўпарадкавальнікаў абмер участка і падрыхтаваць дакументы для дзяржаўнай рэгістрацыі зямлі.

— За гэта многа грошай трэба плаціць?

— Не, не вельмі. Летам за абмер участка плошчай да 25 сотак трэба заплаціць крыху больш за 100 тысяч рублёў, а зімой такая паслуга каштуе прыкладна 160 тысяч рублёў.

☎ — Зямельны ўчастак з домам у спадчыну атрымалі адразу некалькі ўладальнікаў. Адзін з іх зараз з'яўляецца грамадзянінам Расіі, але адмаўляцца ад сваёй долі не збіраецца. Як нам правільна аформіць зямлю?

Спадарыня Ярмаліцкая,
Мінская вобласць.

— На якой падставе вашым бацькам у свой час была выдзелена зямля?

— Мы адшукалі дакументы, па якіх зямля дадзена бацькам у бестэрміновае карыстанне. Мы разлічвалі, што расіяніну дадуць зямлю ў арэнду, а нам, беларусам, у пажыццёвае валоданне.

— Не. Зараз вы маеце права атрымаць зямлю толькі ў арэнду. Калі б бацькі пасля 1991 года пераафармілі зямлю ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну або ў прыватную ўласнасць, тады з пачатку гэтага года і вы, і расіянін маглі б афарміць участак у пажыццёвае валоданне ці нават ва ўласнасць. Зараз гэты зямельны ўчастак не дзеліцца, а кожнаму спадчынніку даецца яго доля. Вы самастойна вырашаеце парадак карыстання зямельным участкам. Увесь участак даецца толькі ў арэнду. Не хвалюйцеся, гэта не такія вялікія грошы. Памер арэнды прыкладна адпавядае зямельнаму падатку на ўчастак.

☎ — Жыву ў двухкватэрным блакаваным доме. Я жыву на першым паверсе, а сусед займае другі паверх. Як мне прыватызаваць зямельны ўчастак побач з домам?

Спадарыня Кіндыш,
вёска Атоліна.

— Зараз вы маеце магчымасць афармліць зямлю ў далевую ўласнасць, згодна з доляй сваёй кватэры ў доме, або ў долевае пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну, ці ў долевую арэнду.

— Што мне рабіць, калі сусед не жадае разам са мной займацца афармленнем зямельнага ўчастка па долевым прынцыпе?

— Ваша кватэра ў доме прыватызавана?

— Так. Дом быў дзяржаўным, але мы выкупілі кватэру ва ўласнасць.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Калі сусед не хоча займацца афармленнем зямлі, то вам трэба афармліць увесь зямельны ўчастак. Летам гэта паслуга па абмярэнні і афармленні зямельнага ўчастка будзе каштаваць прыкладна 105 тысяч рублёў. Потым, згодна з адпаведнай доляй вашай кватэры ў доме, вам вызначаць долю зямельнага ўчастка, афармяць і зарэгіструюць.

— Аднак мне казалі, што сусед мне павінен даць дазвол на афармленне маёй долі зямлі...

— Не. Сёння па заканадаўстве ўжо не трэба прасіць суседа афармляцца разам, калі ён не жадае. Вы самі падаяце заяву, вымяраюць увесь участак. Пасля гэтага вам рэгіструюць толькі вашу долю зямельнага ўчастка. А вось яго доля зямлі застанецца не зарэгістраванай. Але вы будзеце плаціць за афармленне ўсяго ўчастка. Калі сусед вырашыць рэгістраваць сваю долю, то вы можаце прапанаваць яму выкупіць ужо падрыхтаваную землеўпарадкавальную справу за палову цаны, што вамі была выплачана за абмярэнне і афармленне ўсяго ўчастка.

☎ — Жыву ў прыватным доме, маю 6 сотак зямлі, дзе вырошчваю пладова-ягадныя расліны, і, у прыватнасці, вінаград. Хутка выходжу на пенсію. Маю намер за горадам узяць у арэнду да гектара зямлі для вырошчвання вінограду. Як гэта зрабіць?

Георгій Шокель, *г. Міёры.*

— Звяртайцеся ў любы мясцовы сельскі Савет, дзе ў вёсках хапае пустых сядзібаў.

— А ці магчыма мне пабудаваць там летні дамок для абслугоўвання зямельнага ўчастка?

— Не. Летні дамок для абслугоўвання ўчастка не робяць. Закон дазваляе паставіць там часовае збудаванне, дзе будзеце захоўваць інвентар. Калі будуць узнікаць праблемы пры выдзяленні зямлі з боку землеўпарадкавальнай службы, то хай звяртаюцца па кансультацыю непасрэдна да спецыялістаў камітэта.

☎ — Ці можа выканкам з маёй згоды перадаць зямельны ўчастак, які выдзелены мне ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну, іншаму чалавеку, які мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў? Я згодная перадаць яму зямлю пры ўмове, што ён заплаціць мне за пабудаваны там хлеў і гараж.

Марыя Мікалаеўна,
г. Кобрын.

— Гэтыя пабудовы на ўчастку вамі зарэгістраваны?

— Не.

— Тады гэтыя пабудовы не з'яўляюцца аб'ектам нерухомай маёмасці. Вы можаце разам з гэтым чалавекам пайсці на прыём да мясцовых уладаў і вырашыць усе пытанні аб выкарыстанні гэтага ўчастка. Калі магчыма перадаць участак менавіта гэтаму чалавеку, то вы павінны напісаць заяву аб адмове ад участка, а ваш кліент падаць заяву аб выдзяленні яму зямельнага ўчастка. Новы гаспадар можа заплаціць за пабудовы як за будматэрыялы. Дамовіцца аб гэтым можна толькі «палюбоўна», бо заканадаўства гэтыя пытанні не рэгулюе.

☎ — У Мінскай вобласці маем жылы дом, які атрымалі ў спадчыну. Сярод спадчыннікаў адзін грамадзянін Расіі. Да гэтага часу дом і зямля афармлены не былі. Зараз нам прапануюць афармліць зямлю ў арэнду, аднак, па новым Кодэксе аб зямлі цяпер дазваляецца перадаваць зямлю ў пажыццёвае валоданне і грамадзянам іншых дзяржаў...

Ніна Паўлаўна, *г. Мінск.*

— Паводле новай рэдакцыі Кодэкса аб зямлі, калі на былога ўласніка ўчастка была афармлена зямля ці ў пажыццёвае вал

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.05	17.41	10.36
Віцебск —	6.57	17.29	10.32
Магілёў —	6.55	17.31	10.36
Гомель —	6.49	17.30	10.41
Брэст —	7.20	17.56	10.41
Гродна —	7.18	17.59	10.36

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Ганны, Зоі, Святланы, Васіля, Мікалая.*
К. *Эльвіры, Аляксандра, Міраслава.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дзве даты

26 лютага

1918 год — нарадзіўся Пётр Міронавіч Машэраў, вядомы партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер 7 ордэнаў Леніна.

1616 год — інквізіцыя вызваліла Галілео Галілея, які адмовіўся ад сваіх поглядаў, пасля чаго вучоны, паводле легенды, прамовіў: «І ўсё ж яна круціцца».

Цытата дня:

«Многія не губляюць галавы толькі таму, што яе не маюць».

Бальтазар Грасіян (1601—1658), іспанскі пісьменнік.

МАСЛЕНІЧНЫ ТЫДЗЕНЬ

На працягу многіх стагоддзяў існавання Масленіца атрымлівала дэталёвую распрацоўку ў сэнсе напаўнення спецыфічнымі абрадавымі дзеяннямі літаральна кожнага дня святочнага тыдня.

● Масленіца вылучаецца сярод астатніх святаў тым, што час яе правядзення дакладна структурыруецца ў адпаведнасці з логікай разгортвання сямейна-родавых і абшчынна-вясковых падзей. Асабліва выразна гэта заканамернасць праявілася ў этнакультурным асяроддзі рускага народа. Паэтычная назва кожнага дня масленічнага тыдня сфакусіравала ў сабе і накіраванасць абрадавых дзеянняў, і эмацыянальнае стаўленне да іх з боку саміх удзельнікаў. Панядзелак атрымаў назву Сустрэча, аўторак — Зайгрыш, серада — Лакамка, Разгул, Пералом; чацвер — Шырокі, пятніца — Цешчыны вечары; субота — Залоўкіны пасядзелкі, нядзеля — Дараваны дзень (Дараваная нядзеля).

● У асяроддзі беларусаў святкаванне Масленіцы праходзіла больш сціпла, аднак прасторавыя каардынаты абрадавых падзей фактычна не адрозніваліся. У многіх мясцінах фактычнай мяжой распачынання святочных дзеянняў быў чацвер.

● І ўсё ж у нас ёсць усе падставы акрэсліць структурную паслядоўнасць масленічнага тыдня ў беларусаў наступным чынам:

Панядзелак — пачатак свята, выпяканне бліноў, падрыхтоўка ледзяных гор, санак, «коўзанак», выкананне абраду «вазіць маладух», «пахаванне дзеда» (тут і далей улічваюцца рэгіянальныя асаблівасці, калічнасці і час выканання абрадаў, напрыклад, катанне на конях у адной мясцовасці магло быць у чацвер, у другой — у нядзелю).

Аўторак — пачатак гасцяванняў, працяг гулянняў.

Серада — абыход вёскі з мэтай падзякі «наважонам», выкананне абраду «калодка».

Чацвер — «конскае свята» (аб'язджалі маладых коней), выбіралі пастуха, выпякалі блінцы для каровы, дзеці ўшаноўвалі бабку-павітуху.

Пятніца — «хадзілі да цешчы на бліны» — зяці наведвалі цешчаў.

Субота — моладзь на санях ехала за вёску, як мага далей (каб доўгім вырас лён), каталіся з гор, працягваліся гасцяванні-адведкі.

Нядзеля — распальвалі масленічнае вогнішча, выконвалі абрады «пахаванне бабы», «калодка», «гуканне вясны», «рысталішчы» або «прызы», «дараваная нядзеля».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— А вось, памятаю, у нас у дзіцячым садку таксама хлопец адзін быў. Усіх біў. Акрамя мяне. Я дужы, заўсёды рэшты даваў. За гэта мяне і выгналі з садка.

— Чаму?!

— Ну, сказалі, што вартаўнік не павінен з дзецьмі біцца...

☺

Толькі напярэдадні 23 лютага можна ўбачыць у грамадскім транспарце дзяўчыну з усмешкай з толькі што набытым дрылем.

☺

Спартыўны рэпартаж:

— Нам патрэбен гол! Нам патрэбен гол! Нам патрэбен — мы яго і атрымалі!

☺

У прадаўшчыц ёсць некалькі ступеняў нясвежага хлеба: нармальны, сённяшні, учарашні, «з марозу», «у сярэдзіне ён мяккі», «як заўсёды».

Але ні ў якім разе не чэрствы!

— Вяслуй, давай, не азірайся, няма рыбнагляду...



Мінчанін затрыманы з ноўтбукамі

Сталічны жыхар рэспублікі нажыў галаўны боль у выніку ваяжу ў Расію, адкуль ён вяртаўся з ноўтбукамі маркі «Ташыба», «Соні» і «Дэл».

Аўтамабіль мінчаніна, паведамілі карэспандэнту ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, спынілі для праверкі супрацоўнікі Аршанскага міжрайаддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў па Віцебскай вобласці паблізу вёскі Буда Дубровенскага раёна на аўтадарозе «Брэст—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі». А затрымалі яго пасля таго, як высветлілася, што на груз агульным коштам больш за 26 мільёнаў рублёў адсутнічаюць суправаджальныя дакументы.

Ігар ГРЫШЫН.

БТА БАНК

ЗАВЕРЕНО
Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 25 февраля 2009 г.

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательным Советом ЗАО «БТА Банк» «12» января 2009 г. Протокол № 2

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций первого и второго выпусков

Закрытого акционерного общества «БТА Банк» (ЗАО «БТА Банк»)

1. Наименование эмитента:
- на белорусском языке:
полное: Закрытае акцыянернае таварыства «БТА Банк»;
сокращенное: ЗАТ «БТА Банк»;
- на русском языке:
полное: Закрытое акционерное общество «БТА Банк»;
сокращенное: ЗАО «БТА Банк».

2. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего

Закрытое акционерное общество «Астанаэксимбанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 25 июля 2002 года, регистрационный номер 807000071.

14 апреля 2008 года Национальным банком Республики Беларусь было зарегистрировано изменение наименования банка на Закрытое акционерное общество «БТА Банк».

3. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)

Место нахождения: Республика Беларусь, 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20.
Телефон: (017) 289 58 00, телефон/факс: (017) 289 58 22
E-mail: info@btabank.by

4. Номер расчетного и валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций

ЗАО «БТА Банк» имеет следующие основные корсчета:
- корреспондентский счет в белорусских рублях № 3200007040004 в Национальном банке Республики Беларусь, код 042;
- валютный счет в долларах США № 00753418 в Standard Chartered Bank, New York Branch, SWIFT: AEIBUS33.

5. Сумма зарегистрированного уставного фонда

Размер зарегистрированного уставного фонда ЗАО «БТА Банк» составляет: 22.475.400.000,00 (Двадцать два миллиарда четыреста семьдесят пять миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей. Уставный фонд разделен на 141 (Сто сорок одну) простую (обыкновенную) акцию номинальной стоимостью 159.400.000,00 (Сто пятьдесят девять миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей.

6. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством Республики Беларусь, и сроки ее публикации

Бухгалтерский баланс и отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала, отчет о движении денежных средств, аудиторское заключение по бухгалтерской отчетности публикуются в «Национальной экономической газете».

Срок публикации – не позднее 31 марта года, следующего за отчетным.

7. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии).

Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций первого и второго выпусков можно, начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста данной краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу: 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20 с 9.00 до 17.00, а также на Интернет-сайте эмитента: www.btabank.by.

8. Дата принятия решений о первом и втором выпусках облигаций и наименование органа, принявшего это решение

Решения о первом и втором выпусках облигаций Закрытого акционерного общества «БТА Банк» утверждены Наблюдательным советом ЗАО «БТА Банк» «12» января 2009 г. (протокол № 2).

9. Данные о форме выпуска облигаций, объеме эмиссии, количестве и номинальной стоимости облигаций первого и второго выпусков

Параметры \ № выпуска	Первый выпуск	Второй выпуск
Форма выпуска и вид облигаций	Облигации процентные, именные, бездокументарные (в виде записей на счетах), неконвертируемые	
Валюта выпуска	Белорусские рубли	Доллары США
Объем эмиссии (в валюте выпуска)	10.000.000.000,00 (Десять миллиардов)	5.000.000,00 (Пять миллионов)
Количество штук	10.000,00 (Десять тысяч)	500,00(Пятьсот)
Серия и номер облигаций	Серия «БТА1» №№ 000001-010000	Серия «БТА2» №№ 000001-000500
Номинальная стоимость, в валюте выпуска	1.000.000,00 (Один миллион)	10.000,00 (Десять тысяч)

10. Цель выпуска облигаций

Выпуск облигаций ЗАО «БТА Банк» осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств юридических лиц и направления полученных ресурсов на осуществление инвестиционных проектов (кредитование реального сектора экономики, малого и среднего бизнеса).

11. Период проведения открытой продажи облигаций

Дата начала открытой продажи облигаций: 27 февраля 2009 года.
Дата окончания открытой продажи облигаций: 27 мая 2010 года.

12. Место и время проведения открытой продажи облигаций

Продажа облигаций осуществляется в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (по адресу: 200013, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сурганова, 48а) в соответствии с регламентом Биржи и/или на внебиржевом рынке (ЗАО «БТА Банк» по адресу: 220123, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20) с 10.00 до 15.00 в рабочие дни.

Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

Владельцами облигаций могут быть юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

В день начала открытой продажи облигации размещаются по цене, равной номинальной стоимости.

Начиная со второго дня открытой продажи покупатель приобретает облигации по текущей стоимости с уплатой накопленного купонного дохода (НКД) за текущий купонный период. Период начисления купонного дохода исчисляется с даты начала размещения облигаций или с даты выплаты последнего купонного дохода по дату расчета текущей стоимости, при этом день начала размещения облигаций или день выплаты последнего купонного дохода и день расчета текущей стоимости облигаций считаются одним днем.

Накопленный процентный доход по облигациям первого выпуска, номинированным в белорусских рублях, рассчитываемый по следующей формуле:

НКД = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + …. + Kn*H*tn)/36500

где:
НКД – величина накопленного купонного дохода;
K1, K2, Kn – установленная условиями выпуска ставка купонного дохода (в процентах годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 3 (Три) процентных пункта;
H – номинальная стоимость облигации;
t1, t2, tn – количество дней соответствующей части периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней (T) в соответствующем периоде начисления купонного дохода, истекших со дня начала текущего купонного периода.

Накопленный процентный доход по облигациям второго выпуска, номинированным в долларах США, рассчитываемый по следующей формуле:

НКД = ((K*H)/100)*(T/365)

где:
Д – величина купонного дохода;
K – установленная условиями выпуска ставка купонного дохода (в процентах годовых);
H – номинальная стоимость облигации;
T – фактическое количество дней купонного периода, которое исчисляется с даты начала размещения облигаций или с даты выплаты последнего купонного дохода по дату расчета текущей стоимости.

Расчет суммы накопленного купонного дохода по облигациям осуществляется исходя из фактического количества дней в году, проценты начисляются за каждый календарный день года.

Расчет накопленного купонного дохода производится по каждой облигации с округлением в соответствии с Правилами начисления процентов в банках Республики Беларусь, утвержденными постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь 29.12.2000 № 31.3г.

13. Срок обращения облигаций

Срок обращения облигаций первого и второго выпусков ЗАО «БТА Банк»: с 27.02.2009 по 27.08.2010 (546 календарных дней).

14. Дата начала погашения облигаций

Погашение облигаций производится 27.08.2010 на основании реестра владельцев облигаций, который формируется на дату, предшествующую 5(Пяти) рабочим дням дате погашения облигаций.

В случае, если дата погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем.

15. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты

Выплата дохода по облигациям производится владельцам облигаций периодически (один раз в три месяца) в виде купонного дохода на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке суммы купонного дохода на счета владельцев облигаций в белорусских рублях (для владельцев облигаций первого выпуска) или в долларах США (для владельцев облигаций второго выпуска). Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую 5 (Пяти) рабочим дням дате выплаты купонного дохода за соответствующий купонный период.

Начисление купонного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций с 27 февраля 2009 года по 27 августа 2010 года включительно. Со дня истечения срока обращения облигаций купонный доход не начисляется.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций в белорусских рублях, открытых в уполномоченных банках Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счетах ЗАО «БТА Банк» до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

Выплата дохода по облигациям производится:
- за купонный период с 27.02.2009 по 27.05.2009 – 27.05.2009;
- за купонный период с 28.05.2009 по 27.08.2009 – 27.08.2009;
- за купонный период с 28.08.2009 по 27.11.2009 – 27.11.2009;
- за купонный период с 28.11.2009 по 27.02.2010 – 27.02.2010;
- за купонный период с 28.02.2010 по 27.05.2010 – 27.05.2010;
- за купонный период с 28.05.2010 по 27.08.2010 – 27.08.2010.

В случае, если дата выплаты купонного дохода выпадает на нерабочий день, выплата купонного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим.

Купонный доход по облигациям за первый купонный период начисляется со дня, следующего за днем начала размещения облигаций (с 28.02.2009) по день истечения купонного периода включительно (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем), являющийся днем выплаты купонного дохода.

Купонный доход по облигациям за второй и последующие купонные периоды (включая последний) начисляется с даты начала очередного купонного периода (следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период) по день истечения данного купонного периода (день погашения) включительно (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем).

Расчет купонного дохода производится за купонный период, определенный в соответствии с вышеуказанными правилами, путем его начисления на номинал облигации:
- по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения плюс 3(Три) процентных пункта – для облигаций первого выпуска, номинированных в белорусских рублях;
- по ставке 12(Двенадцать) процентов годовых – для облигаций второго выпуска, номинированных в долларах США.

Расчет купонного дохода по облигациям первого выпуска осуществляется по следующей формуле:

Д = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + …. + Kn*H*tn)/36500

где:
Д – величина купонного дохода;
K1, K2, Kn – установленная условиями выпуска ставка купонного дохода (в процентах годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 3(Три) процентных пункта;
H – номинальная стоимость облигации;
t1, t2, tn – количество дней соответствующей части периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней (T) в соответствующем периоде начисления купонного дохода.

Расчет купонного дохода по облигациям второго выпуска, номинированным в долларах США, осуществляется по следующей формуле:

Д = ((K*H)/100)*(T/365)

где:
Д – величина купонного дохода;
K – установленная условиями выпуска ставка купонного дохода в размере 12(Двенадцать) процентов годовых;
H – номинальная стоимость облигации;
T – количество дней купонного периода.

Расчет суммы купонного дохода по облигациям первого и второго выпусков осуществляется исходя из фактического количества дней в году, проценты начисляются за каждый календарный день года.

Расчет купонного дохода производится по каждой облигации с округлением в соответствии с Правилами начисления процентов в банках Республики Беларусь, утвержденными постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь 29.12.2000 № 31.3г.

Выплата части купонного дохода не производится.

16. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения

Владельцы облигаций первого и второго выпусков могут предъявить их к досрочному погашению в период их обращения.

ЗАО «БТА Банк» обязуется осуществлять досрочный выкуп облигаций у любого их владельца одновременно с выплатой дохода за каждый купонный период. Выкуп облигаций осуществляется по цене, равной номинальной стоимости облигации.

В случае, если дата досрочного выкупа выпадает на нерабочий день, досрочный выкуп осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене равной номинальной стоимости. Проценты на сумму досрочного выкупа за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Для осуществления досрочного выкупа владелец облигаций – юридическое лицо должно подать в ЗАО «БТА Банк» не позднее 6 (Шести) рабочих дней до даты наступления досрочного погашения заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
- наименование владельца облигаций;
- наименование ценной бумаги;
- количество облигаций, предложенных к досрочному выкупу;
- наименование профессионального участника рынка ценных бумаг, через которого будет осуществляться продажа ценных бумаг (в случае наличия такового);
- согласие с условиями досрочного выкупа, которые изложены в зарегистрированном Проспекте эмиссии облигаций;
- юридический адрес, банковские реквизиты для зачисления денежных средств и контактные телефоны заявителя;
- подпись уполномоченного лица.

В случае, если досрочный выкуп осуществляется на внебиржевом рынке, владелец облигаций не позднее одного рабочего дня до даты досрочного погашения должен перевести облигации со своего счета «депо» на счет «депо» ЗАО «БТА Банк» в уполномоченном депозитарии.

В случае если для осуществления досрочного выкупа владельцу облигаций необходимо принятие решения соответствующего органа или получение согласования, или получение разрешения, владелец выкупаемых облигаций обязан заблаговременно принять (получить) данное решение (согласование, разрешение).

Подача заявлений осуществляется по факсу с последующим предоставлением оригинала на протяжении трех дней, заказным письмом или непосредственно по адресу: 220123, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20, тел. 289 58 19 (09), факс 289 58 09.

В случае несоблюдения сроков предоставления заявления о намерении осуществить досрочное погашение и/или перевода облигаций на счет «депо» ЗАО «БТА Банк» досрочное погашение облигаций не осуществляется.

ЗАО «БТА Банк» имеет право осуществлять выкуп облигаций на биржевом и внебиржевом рынках в иные сроки по текущей стоимости как для перепродажи, так и для досрочного погашения.

ЗАО «БТА Банк» имеет право осуществлять дальнейшую реализацию выкупленных облигаций по цене, определяемой банком и покупателем облигаций, а также осуществлять с выкупленными облигациями иные действия в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

В случае выкупа всего объема эмиссии облигаций ЗАО «БТА Банк» может принять решение о досрочном погашении облигаций первого и второго выпусков.

17. Порядок погашения облигаций. Дата, на которую формируется реестр владельцев облигаций, для целей погашения облигаций

При погашении облигаций их владельцам выплачивается номинальная стоимость облигаций, а также доход за последний купонный период (иные неполученные купонные доходы – при их наличии) в валюте номинала облигаций.

Погашение облигаций производится 27.08.2010 на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке причитающихся денежных средств на счета владельцев облигаций по реквизитам последнего держателя, указанного в реестре владельцев облигаций на дату формирования реестра.

Реестр владельцев облигаций формируется на дату, предшествующую 5(Пяти) рабочим дням дате погашения облигаций.

В случае, если дата погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене, равной номинальной стоимости. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о реквизитах счета владельцев облигаций, а также в случае, если реестр содержит ошибочные либо неполные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счетах ЗАО «БТА Банк» до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

18. Порядок обращения облигаций

Обращение облигаций первого и второго выпусков осуществляется среди юридических лиц в установленном законодательством Республики Беларусь порядке через торговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (по адресу: 200013, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сурганова, 48а) и/или на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Сделки с облигациями прекращаются за 5 рабочих дней до даты выплаты купонного дохода за каждый купонный период в течение срока обращения облигаций, а также за 5 рабочих дней до даты их погашения.

19. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам

В случае отказа от выпуска облигаций либо при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь ЗАО «БТА Банк» в срок не позднее 30 дней с момента принятия одного из вышеуказанных решений возвращает владельцам облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами по объявленной процентной ставке.

20. Информация об обеспечении облигаций

Выпуск облигаций первого и второго выпусков ЗАО «БТА Банк» (далее – облигации) осуществляется без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала банка (п.1.8. Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).

По состоянию на 01 декабря 2008 года размер нормативного капитала ЗАО «БТА Банк» составил 40 260,9 млн. белорусских рублей, что в эквиваленте 18 673,9 тыс. USD. Объем эмиссий находится в пределах данных ограничений.

21. Дата и номер государственной регистрации облигаций

Облигации первого выпуска, номинированные в белорусских рублях, зарегистрированы в Государственном реестре ценных бумаг Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 25 февраля 2009 г., регистрационный номер 5-200-02-0238.

Облигации второго выпуска, номинированные в долларах США, зарегистрированы в Государственном реестре ценных бумаг Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 25 февраля 2009 г., регистрационный номер 5-200-02-0239.

22. Налогообложение доходов по облигациям

Налогообложение доходов по облигациям осуществляется в соответствии с Законом Республики Беларусь от 22 декабря 1991 г. № 1330-XII «О налогах на доходы и прибыль» с учетом изменений и дополнений.

И.о. Председателя Правления **Ж.К. Алибаева**

Главный бухгалтер **Н.М.Сергиевич**

ЗАО «БТА Банк» Лицензия НБРБ № 17 от 12.06.2008 г., УНП 807000071

БРЫГАДЗІРА СЛУХАЦЦА ТРЭБА!

У нашай вёсцы гэтых дружбакоў ведаюць усе — трактарысты яны і заўзятыя рыбакі.

— Слухай, заўтра нядзеля, — кажа неяк адзін. — Давай сабе свята зробім, на матацыкле на рыбалку зганяем. Мне месца параілі... Кіламетраў дзесяць адсюль.

— Не, — адмаўляецца другі, — мне брыгадзір сказаў лугі абкасіць. А то надта ж вада трымаецца, сенажаборачная тэхніка гразнуць будзе.

— Ды скосіш у іншы дзень... А заўтра — парыбачым, юшкі наварым. Згаджайся, га?

— Не, — уздыхае сябрук, — я слова даў.

Карацей, разышліся яны: Іван у нядзельку раніцай на рыбалку паехаў, Васіль — абкошваць лугі. А трава там высокая, рэдкая, трактар па ёй ледзьве сунецца. Скочыў трактарыст уніз, каб глянуць пад колы і... аслупянеў: ззаду ў калянах уюноў... Аж кішаць.

Сігануў да кабіны, схапіў вядро, назбіраў (паўнюткае) і дадому. Упохапкі перакусіў нечым, узяў мяшок і назад — яшчэ кіль з 20 рыбы налавіў.

— Э-э, — кажа вечарам свайму сябруку, — прыходзь на юшку.

Той у крыўду: маўляў, канчай здзекавацца, без таго моташна. Але ж зайшоў.

А ўбачыў улоў, — і мову адняло. Як тая рыба на беразе паветра хапае, пытае толькі:

— Дзе?.. Калі?!.. А я ж цэлы дзень угробіў і ніч-чога не злавіў...

Ну Васіль і расказаў...

Чым, дарэчы, вельмі засмуціў свайго сябра, бо яго, як высветлілася, брыгадзір таксама прасіў папрацаваць, абкасіць тыя лугі. Але ён не паслухаўся.

Сямён Рыгоравіч РУДНІКАЎ,
в. Агародня, Добрушскі раён

УДАЛЫ ВЫБАР

Наш былы ўчастковы — вялікі арыгінал. Прычым па-свойму ўнікальным усё яго жыццё было. Напрыклад, жаніцьба (і нават не адна), вопыт работы...

Але пра гэта — размова асобная. Цяпер — пра тое, як ён прафесію выбраў.

Значыць, закончыў Міхалыч (цьфу ты... Тады — проста Генка) дзесяцігодку, аддаў абавязак Радзіме, пагуляў, колькі душа прасіла, трэба, думае, і працу шукаць. Паехаў у горад, да дзядзькі. Той немалую пасаду на заводзе займаў — можа ж паспрыяе?

Дзядзька хлопца гасцінна прыняў — павёў у рэстаран. Толькі селі яны, па першай узняць сабраліся, — нейкі міліцыянт у зале з'яўляецца, у чыне капітана. Не цвярозы, як падалося Гену, але дзядзька адразу ўскочыў з крэсла, загукаў яму:

— Гэй, Іванавіч! Просім да нас!

І боўць яму поўную чарку. Падышоў той — глык і... далей падаўся, да суседняга століка, бо і там запрашаюць. Больш за тое — нейкая мадама ўжо на плячы ў яго вісне, у шчочку цалуе.

— Слухайце, а хто гэта? — пытае пляменнік у дзядзькі.

— О-о, — зацягвае той з павагай, — гэта ўчастковы, «шэрыф» наш.

Тут Гену быццам неба адкрылася. Назаўтра (са сваякамі нават не развітаўся) у райцэнтр паехаў, у аддзел унутраных спраў, заяву там напісаў. Маўляў, вазьміце... Хачу... Буду!..

І, пасля заканчэння школы міліцыі, усё тое, што з дзядзькам пабачыў, ён хутка атрымаў: мужыкі наліавалі, дзеўкі на шыю вешаліся, людзі паважалі...

І на пенсію ён пайшоў у сорак з хвосцікам. Што варта ўвагі, дык гэта не даўжыня яго, а памер той пенсіі.

Зрэшты, гэтыя арыгінальнасці ўжо не яго, не Міхайлавіча.

А. ЛІПЕНЬ, *Іўеўскі раён.*

АД СВАЙГО ЗЛОДЗЕЯ...

Памяняліся часы: дзеці цяпер ходзяць на экзамены з куплёнымі кветкамі — і ў асноўным з ружамі. Мы некалі — з тым, што цвіло ў агародчыках. Добра, як дома ці ў якіх сваякоў альбо добрых суседзяў. Але ж былі выпадкі, калі нічагуткі там. А ў нядобрых людзей папросіш, дык цябе і пасарамацяць яшчэ, скажуць: «А чаму твая маці такіх не пасадзіць?»

Што тут адкажаш? Калі табе 16-17... Што маці, мо, не да кветак? Што праца ў кожнай? Што гаспадарка вялікая? Што нас, дзяцей, сямёра па лаўках?..

Зрэшты, гэта, напэўна, і лепей было, бо мы ў той час раслі самастойнымі: з маленства і па гаспадарцы шмат што рабілі, і вучыліся без дапамогі бацькоў (слова рэпетытар нават не чуў ніхто!), і праблемы свае вырашалі. У тым ліку — з кветкамі.

Як? Вы, напэўна, ужо здагадаліся?

«Плывём» мы, значыць, раз па гарадку, глядзім, у каго што расце і цвіце (бо заўтра ж экзамен), чуем (зямельку тады бераглі — хаты ставілі на самым краі, вокнамі адразу на вуліцу) — у адным з дамкоў мужык з жонкай вячэраць селі. І яна яму кажа:

— Ты давай пад'ядай ды ідзі на двор — на лаўцы пасядзі. А то я на базары сёння была, бабы казалі, што экзамен заўтра ў школе. Значыць, шэўрадзь (так у нас падлеткаў называлі) зараз па вуліцах будзе рыскаць, кветак шукаць.

— А няхай шукае, — адказвае ёй гаспадар. — Я ўсе нашы півоні паразаў і ў хаце паставіў.

Мы гэта ўсё пачуўшы, якраз за вугал яе звярнулі, на суседнюю вуліцу. Бачым — і насамрэч на акне ў вазе букет стаіць... Пышны, прыгожы — гатовы. І люфцік адчынены. Хлопцы нашы пераглянуліся толькі, адзін аднаго падсадзілі, кветкі цопнулі і цягу — усёй грамадой...

Страху, зразумела ж хапіла. А ўжо колькі рогату было?!... І ў той дзень, і потым...

Мы тады не ведалі яшчэ, што ў школе, на экзаменах ад нас чакаюць не кветак, а добрых адказаў. Калі нарэшце дайшло, многіх з наставнікаў — вельмі паважаных, любімых, на гэтым свеце ўжо не стала. Але і тым, хто з жыцця пайшоў, і тым, хто сярод нас застаўся, хацелася б нізка пакланіцца за тое, што не дазялілі нас на бедных і багатых, што вучылі нас быць добрымі людзьмі. Вучылі самаддана. І, дзякуючы менавіта гэтаму, мы змаглі паступіць туды, куды хацелі.

І.С., *г. Нясвіж.*

ЧАГО ШКАДАВАЦЬ

Гэты выпадак адбыўся з братам майго гаспадара. Служыў ён прапаршчыкам у адной з прыбалтыйскіх рэспублік. Клімат там вельмі вільготны (побач Балтыйскае мора...), што, аднак, палова бяды. Горай тое, што надвор'е за дзень некалькі разоў мяняецца — то цёпла...

Зрэшты па парадку. У той дзень, з раніцы, адліга была, выпаў снежок. Сваяк наш на веласіпедзе паехаў на працу. Пакуль быў там, мароз на вуліцы выскачыў аж да мінус 10 і вецер узняўся.

А дамоў жа дабірацца трэба...

Ускочыў быў на веласіпед (вядомым месцам), холадам, казаў, як маланкай працяла — злез тут жа! Думае, што ж рабіць? Рукі пацірае... У рукавіцах... З аўчыны. Ага, думае, трэба адну да сядзення прыстроіць.

Прывязаў неяк, паехаў.

Рукам (адлегласць 6 вёрстаў), зразумела ж, таксама хапіла, але ён адной (у рукавіцы) кіраваў (руль проста ледзяны быў), другую — у кішэні грэў...

Так і дабраўся. У хату зайшоў. Жонка глянула на яго і адразу ў гвалт:

— Чаму рукавіца толькі адна? Дзе другую дзеў? Цёплую, дарагую... Згубіў?!. Каб табе...

Мужык ёй:

— Сціхні, баба. Зяпу адкрыла... Рукавіц ёй шкада! Не, каб паглядзець, што збярог я!..

Карацей, паразумеліся неяк. Бо высветлілі, што на месцы ўсё — нічога мужык не страціў.

І нават не згубіў.

Т.І. АЛЯХНОВІЧ, *г. Слуцк.*

БЕЗ БАЦЬКІ...

Той раніцою жонка выдала Васілю паляўнічы білет. Гэта азначала, што яму трэба браць швайку, нож, ісці ў хлеў і забіць кабанчыка. Адказная справа. Раней Васіль рабіў яе з бацькам, і, зразумела ж, быў падсобнікам. Цяпер — ён чалавек жанаты, жыве асобна. Павінен управіцца. Сам... Але ж тады да свежыны жонка можа чаркі не даць... Па суседа схадзіў. Так яно і спрытней, і надзейней. Удваіх яны рушылі ў хлеў.

Аднак, што за ліха там? Няма... парсючка.

Раптам зарохкаў — аднекуль... зверху. Спартоўцам быў: гною ў хляве зашмат — на вышкі заскочыў. Сагналі. «Гэта ж каб затаіўся, то можа пажыў бы яшчэ?» — падумаў кожны з траіх. Двое думалі далей: як жа забіць, каб не спэцкацца? Можа, токам?

Змайстравалі нейкую прычындаліну. Следам паўстала пытанне, куды прыставіць?

Мужыкі думалі, кабанчык, сагнаны з вышак, уважліва на іх пазіраў. Тыцнулі жалезным прутам яму ў нос. Шчацінне на парсючку дыбкі стала, вочы пачырванелі... Ну чыста раз'юшаны вожык. Толькі вялікі.

Паўтарылі спробу яшчэ раз. Не дапамагло.

Тут па вуліцы ішоў Сямён. Яго, як добрага «спеца», многія клікалі біць свіней. Вось і цяпер з халявы ў яго тырчалі швайка з нажом. Ён за гэту работу, відаць, і плату ўжо атрымаў, бо дужа ж вясёлы быў. «Вучыцеся, пакуль я жывы», — сказаў ён хлопцам і зайшоў у хлявок. На імгненне! Бо «вожык» у бок Сямёна толькі рылам павёў, той — ад страху — з капытоў і ў гной. А калі ўстаў, паслаў сваіх «вучняў»... Разам з тым дзікім свінчом... І сам пакульгаў — дахаты.

Але ж праўду кажуць, што на лаўца і звер бяжыць: на вуліцу выйшаў яшчэ адзін вясковец — Максім, запраўскі паляўнічы. «Я, брат, на сваім жыцці і не гэткіх дзікіх біў, — пахваліўся ён. Схадзіў у хату па нож, смела пайшоў у хлеў. Аднак, убачыўшы таго кабанчыка, выскачыў, як падсмалены. «Вы што? — закрычаў, — ён жа шалёны! Яго трэба застрэліць і закапаць»...

Чуткі пра тое, як Васіль «б'е» кабанчыка, мігам праляцела па вёсцы. Завітала і ў хату, дзе жыў Васілёў бацька. Уздыхнуў ён, узяў патрэбны інструмент і прыйшоў да сына. Удвух, звычайным сялянскім спосабам, яны закалолі тое гаротнае свінчо.

Г.С. БАБАРЫКА.
в. Мачуль Столінскага раёна.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	**Здание специализированное связи и право заключения договора аренды земельного участка**
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., Пружанский р-н, д. Поросляны, 158
Продавец недвижимого имущества	РУП «Белпочта», (0162) 20 57 80
Характеристика предмета аукциона	Здание одноэтажное, деревянное, с холодной пристройкой, верандой, 1957 г.п., площадь – 75,9 кв. м Земельный участок площадью 0,1506 га; срок аренды – 49 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	16 359 560
Сумма задатка, руб.	1 635 000
Организатор аукциона	***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by***

Аукцион состоится **31 марта 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538.

3. Юридическими лицами – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

4. Индивидуальными предпринимателями – нотариально заверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранными юридическими лицами – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителями иностранных юридических лиц или иностранных граждан, лиц без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

7. Представителями граждан и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь – нотариально заверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь и представители иностранных юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан:

подписать протокол аукциона;

не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона организатору аукциона, внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 30 марта 2009 года включительно.

Рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь

АБ ТЭРМІНЕ ДЗЕЯННЯ ДАВЕРАНАСЦІ НА АТРЫМАННЕ ГРАШОВЫХ СРОДКАЎ З УКЛАДУ (ДЭПАЗІТУ) ГРАМАДЗЯНІНА, НА ЯКІ ПЕРАЛІЧВАЕЦЦА ЯГО ПЕНСІЯ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Марыскіна А.У., суддзяў Бойка Т.С., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П., Шукліна В.З. на падставе часткі восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў разгледзеў частку трэцюю пункта 98 Інструкцыі аб парадку ўчынення натарыяльных дзеянняў, зацверджанай пастановай Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 23 кастрычніка 2006 г. № 63 (у рэдакцыі пастановы ад 14 лістапада 2008 г. № 67) (далей — Інструкцыя).

У частцы трэцяй пункта 98 Інструкцыі ўстаноўлена, што даверанасць на атрыманне пенсіі не можа быць выдадзена на тэрмін больш як адзін год.

Згодна з часткай чацвёртай артыкула 83 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 красавіка 1992 г. «Аб пенсіённым забеспячэнні» выплата пенсій праводзіцца па выбары пенсіянераў праз арганізацыі паштовай сувязі, банкі, арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па дастаўцы пенсій.

У адпаведнасці з часткай першай артыкула 87 указанага Закона пенсія можа выплачвацца па даверанасці, якая можа быць выдадзена на тэрмін не звыш аднаго года.

Пытанні, звязаныя з асаблівасцямі выплаты пенсіі праз банкі па даверанасці, у тым ліку адносна ўстанаўлення гранічнага тэрміну дзеяння такой даверанасці, былі прадметам разгляду Канстытуцыйнага Суда.

Так, 6 лістапада 2008 г. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь па зваротку адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк» прыняў рашэнне «Аб тэрміне дзеяння даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) фізічнай асобы, адкрытага ў банку, на які пералічваецца пенсія (дапамога)».

Ва ўказаным рашэнні Канстытуцыйны Суд сфармуляваў сваю прававую пазіцыю, якая заключаецца ў тым, што паколькі рэгуляванне адносін, якія датычацца тэрміну дзеяння даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) фізічнай асобы ў банку, на які пералічваецца пенсія, ажыццяўляецца нормамі грамадзянскага, а не пенсіённага заканадаўства, то пры ўстанаўленні ў пенсіённым заканадаўстве і іншых падзаконных актах гранічнага тэрміну дзеяння такой даверанасці павінны ўлічвацца патрабаванні грамадзянскага і банкаўскага заканадаўства. Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным замацаваць у артыкуле 87 Закона «Аб пенсіённым забеспячэнні» палажэнне аб тым, што прадугледжаны ў ім тэрмін дзеяння даверанасці не распаўсюджваецца на выпадкі атрымання грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) грамадзяніна, адкрытага ў банку, на які пералічваецца пенсія (дапамога), прапанаваўшы Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь разгледзець пытанне аб удасканальванні норм пенсіённага заканадаўства з мэтай устаранення няўзгодненасці прававога рэгулявання.

Канстытуцыйны Суд, пацвярджаючы дадзеную прававую пазіцыю, лічыць, што частка трэцяя пункта 98 Інструкцыі, якая прадугледжвае гадавы тэрмін дзеяння даверанасці на атрыманне пенсіі, не можа распаўсюджвацца на выпадкі выдачы даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) грамадзяніна, адкрытага ў банку, на які пералічваецца яго пенсія.

На падставе выкладзенага, кіруючыся артыкуламі 40, часткай першай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкуламі 22, 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Канстытуцыйны Суд

ВЫРАШЫЎ:

1. Прызнаць неабходным у мэтах абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян удакладніць норму часткі трэцяй пункта 98 Інструкцыі аб парадку ўчынення натарыяльных дзеянняў, зацверджанай пастановай Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 23 кастрычніка 2006 г. № 63 (у рэдакцыі пастановы ад 14 лістапада 2008 г. № 67), у частцы, якая датычыцца ўстанаўлення тэрміну дзеяння даверанасці ў прымяненні да выпадкаў атрымання грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) грамадзяніна, адкрытага ў банку, на які пералічваецца яго пенсія.

2. Прапанаваць Міністэрству юстыцыі Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым парадку ўнесці ў пункт 98 указанай Інструкцыі неабходныя змяненні і дапаўненні, узгадніўшы яго з нормамі грамадзянскага і банкаўскага заканадаўства і гэтым рашэннем.

3. Гэта рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

4. Апублікаваць гэта рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П.П. МІКЛАШЭВІЧ.

18 лютага 2009 г., г. Мінск
№ Р-314/2009

АБ РОЎНЫХ УМОВАХ ВЫЗВАЛЕННЯ АД ЗВАРОТУ СРОДКАЎ, ЗАТРАЧАНЫХ ДЗЯРЖАВАЙ НА ПАДРЫХТОЎКУ МАЛАДОГА СПЕЦЫЯЛІСТА

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Марыскіна А.У., суддзяў Бойка Т.С., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П., Шукліна В.З. разгледзеў зварот па пытанні правамернасці патрабавання ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь аб звароце сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста, у сувязі з няўжываннем маладога спецыяліста на работу па размеркаванні.

У звароце адзначаецца, што заканадаўствам Рэспублікі Беларусь устаноўлены няроўныя ўмовы вызвалення маладых спецыялістаў, якія атрымалі за кошт сродкаў бюджэту сяроднюю спецыяльную адукацыю і залічаны ва ўстанову адукацыі на навучанне ў дзённай форме атрымання адукацыі больш высокага ўзроўню, ад выканання абавязку вярнуць у адпаведны бюджэт затрачаныя на іх падрыхтоўку сродкі ў выпадку няўжывання па размеркаванні, у залежнасці ад таго, з'яўляецца гэта ўстанова адукацыі ўстановай Рэспублікі Беларусь або іншай дзяржавы (у прыватнасці, Расійскай Федэрацыі).

Прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, міжнародна-прававых актаў, ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі», «Аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь», Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 лютага 2006 г. № 80 «Аб правілах прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы», Палажэння аб звароце сродкаў у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага (служачага), спецыяліста, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 верасня 2006 г. № 1255, іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, якія адносяцца да даследуемага пытання, Канстытуцыйны Суд устанавіў наступнае.

У артыкуле 22 Канстытуцыі замацаваны роўнасць усіх перад законам і права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў.

Канстытуцыя ўсклала на дзяржаву абавязак прымаць усе даступныя яму меры для стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабодаў грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй (частка першая артыкула 59).

Згодна з артыкулам 49 Канстытуцыі кожны мае права на адукацыю. Гарантуюцца даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі. Сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя даступная для ўсіх у адпаведнасці са здольнасцямі кожнага. Кожны можа на конкурснай аснове бясплатна атрымаць адпаведную адукацыю ў дзяржаўных навучальных установах.

Норма артыкула 49 Канстытуцыі знайшла канкрэтызацыю і развіццё ў Законе «Аб адукацыі» (далей, калі не агаворана іншае, — Закон). Згодна з артыкулам 1 Закона дзяржаўная палітыка ў галіне адукацыі асноўваецца ў тым ліку на прынцыпе даступнасці дашкольнай, прафесіянальна-тэхнічнай і на конкурснай аснове сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. У артыкуле 3 Закона прадугледжана, што кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь мае права на атрыманне адукацыі; абмежаванні правоў на атрыманне адукацыі могуць устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь (частка пятнаццатая артыкула 10 Закона).

Парадак і ўмовы звароту сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага (служачага), спецыяліста, а таксама падставы для вызвалення ад звароту ўказаных сродкаў устанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь (частка пятнаццатая артыкула 10 Закона).

У мэтах выканання вышэйназванага артыкула Закона пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 верасня 2006 г. № 1255 зацверджана Палажэнне аб звароце сродкаў у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага (служачага), спецыяліста (далей — Палажэнне), у пункце 4 якога прадугледжаны падставы вызвалення рабочага (служачага), спецыяліста ад звароту ўказаных сродкаў. Адной з такіх падстаў, устаноўленых абзацам дзесятым падпункта 4.1 пункта 4 Палажэння, з'яўляецца залічэнне асобы, якая атрымала прафесіянальна-тэхнічную або сяроднюю спецыяльную адукацыю (далей — малады спецыяліст), ва ўстанову адукацыі Рэспублікі Беларусь на навучанне ў дзённай форме атрымання адукацыі больш высокага ўзроўню.

Такім чынам, паступленне на дзённую форму навучання вышэйшай навучальнай установы Расійскай Федэрацыі ў сілу абзаца дзесятага падпункта 4.1 пункта 4 Палажэння не з'яўляецца падставай для вызвалення маладога спецыяліста ад звароту сродкаў, затрачаных дзяржавай на яго навучанне ва ўстанове адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя, асноўваючыся на Дагаворы аб Саюзе Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1997 года і развіваючы яго палажэнні ў мэтах далейшага збліжэння сваіх народаў і забеспячэння дзейснай інтэграцыі ў розных сферах дзяржаўнага і грамадскага жыцця, 25 снежня 1998 г. падпісалі Дагавор паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб роўных правах грамадзян, у артыкуле 4 якога абавязаліся забяспечыць даступнасць і роўныя правы грамадзян у атрыманні сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і паслявышэйшай прафесіянальнай адукацыі. Дакументы аб адукацыі, вучоных ступенях і званнях у сілу заключанага раней, 27 лютага 1996 г., Пагаднення паміж урадамі дзвюх краін прызнаюцца ў абедзвюх дзяржавах і эквівалентныя на тэрыторыі Беларусі і Расіі пры прадаўжэнні адукацыі і пры паступленні на работу ў адпаведнасці з указанымі ў іх спецыяльнасцю і кваліфікацыяй.

Аднак у сілу абзаца дзесятага падпункта 4.1 пункта 4 Палажэння паступленне грамадзян Рэспублікі Беларусь у навучальныя ўстановы Расійскай Федэрацыі не з'яўляецца падставай для вызвалення іх ад звароту сродкаў, затрачаных на навучанне ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, і ў сувязі з гэтым даступнасць атрымання адукацыі ва ўстановах адукацыі Расійскай Федэрацыі, а таксама роўнае з іншымі права на атрыманне адпаведнай адукацыі могуць быць не забяспечаны.

Разам з тым, згодна з артыкулам 33 Закона «Аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь», часткамі другой і чацвёртай артыкула 55 Закона «Аб адукацыі», нормы права, якія змяшчаюцца ў міжнародных дагаворах, што ўступілі ў сілу на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца часткай дзеючага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь заканадаўства, падлягаюць добрасумленнаму выкананню Рэспублікай Беларусь у адпаведнасці з міжнародным правам і непасрэднаму прымяненню, акрамя выпадкаў, калі з міжнароднага дагавора вынікае, што для прымянення такіх норм патрабуецца прыняцце (выданне) унутрыдзяржаўнага нарматыўнага прававога акта, і маюць сілу таго нарматыўнага прававога акта, якім выражана згода Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе адпаведнага міжнароднага дагавора. Рэспубліка Беларусь забяспечвае выкананне прынятых абавязацельстваў па міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь у сферы адукацыі.

Прыведзеныя нарматыўныя палажэнні адпавядаюць нормам артыкула 8 Канстытуцыі, якія абвяшчылі прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і неабходнасць забеспячэння адпаведнасці ім заканадаўства, а таксама артыкула 26 Венскай канвенцыі аб праве міжнародных дагавораў ад 23 мая 1969 года, згодна з якім кожны дзеючы дагавор абавязковы для яго ўдзельнікаў і павінен імі добрасумленна выконвацца.

Беручы пад увагу нормы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб роўных правах грамадзян ад 25 снежня 1998 года, іншых міжнародных дагавораў, а таксама законаў Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны Суд лічыць, што ў абзацы дзесятым падпункта 4.1 пункта 4 Палажэння ўстаноўлены няроўныя ўмовы вызвалення маладых спецыялістаў, якія атрымалі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў прафесіянальна-тэхнічную або сярэднюю спецыяльную адукацыю і залічаны ва ўстанову адукацыі на навучанне ў дзённай форме атрымання адукацыі больш высокага ўзроўню, ад выканання прадугледжанага часткай чатырнаццатай артыкула 10 Закона «Аб адукацыі» абавязку вярнуць затрачаныя дзяржавай на навучанне сродкі, у сувязі з тым што ад такога звароту вызваляюцца толькі маладыя спецыялісты, залічаныя ў адпаведную ўстанову адукацыі Рэспублікі Беларусь. Паколькі заканадаўства прадугледжвае неабходнасць забеспячэння даступнасці і роўных правоў грамадзян у атрыманні адукацыі, у тым ліку вышэйшай, то, зыходзячы з прынцыпу роўнасці ўсіх перад законам, гэтыя правы павінны быць у поўнай меры ўлічаны пры рэалізацыі і прадастаўленні гарантый абароны іншых правоў і абавязкаў у сферы адукацыі.

На падставе выкладзенага, кіруючыся артыкулам 40, часткай першай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкуламі 22, 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Канстытуцыйны Суд

ВЫРАШЫЎ:

1. Прызнаць неабходным у мэтах забеспячэння належнай рэалізацыі нормаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь унесці адпаведныя змяненні ў абзац дзесяты падпункта 4.1 пункта 4 Палажэння аб звароце сродкаў у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага (служачага), спецыяліста, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 верасня 2006 г. № 1255, накіраваныя на больш поўную абарону правоў і законных інтарэсаў грамадзян Рэспублікі Беларусь пры ўстанаўленні падставы вызвалення асоб, якія атрымалі прафесіянальна-тэхнічную або сярэднюю спецыяльную адукацыю ў Рэспубліцы Беларусь і залічаны ва ўстанову адукацыі Расійскай Федэрацыі на навучанне ў дзённай форме атрымання адукацыі больш высокага ўзроўню, ад звароту сродкаў, затрачаных дзяржавай на іх навучанне.

2. Прапанаваць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым парадку ўдакладніць рэдакцыю абзаца дзесятага падпункта 4.1 пункта 4 указанага Палажэння.

3. Гэта рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

4. Апублікаваць гэта рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П.П. МІКЛАШЭВІЧ.

18 лютага 2009 г., г. Мінск
№ Р-315/2009

«Аўтарытэт» «засвяціўся» ў Маскве

У цэнтры Масквы супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі крымінальнага «аўтарытэта» па мянушцы Біра, што знаходзіцца ў вышуку па ініцыятыве МУС Беларусі.

45-гадовы жыхар Смаленскай вобласці, «злодзей у законе» Бірукоў, вядомы праваахоўным органам як крымінальны «аўтарытэт», які ажыццяўляў кантроль за Бабруйскам і знаходзіцца ў вышуку за легалізацыю злачынных даходаў, ухіленне ад падаткаў, махлярства і вымаганне. Затрыманы пражываў каля двух месяцаў у расійскай сталіцы па розных адрасах, а ўзялі яго супрацоўнікі крымінальнага вышуку разам з прадстаўнікамі маскоўскага ўпраўлення ФСБ каля кавярні на Новым Арбаце. Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі, пры сабе гэты ўраджэнец Бабруйска меў пашпарт грамадзяніна РФ, законнасць якога высвятляецца. Цяпер пытанне аб прыцягненні «аўтарытэта» да крымінальнай адказнасці вырашаецца на ўзроўні Генпракуратуры нашай краіны і Генпракуратуры Расійскай Федэрацыі.

Ігар ГРЫШЫН.

Пажар за пажарам

За трое апошніх сутак на Гомельшчыне адбылося дзевяць пажараў, і шэсць з іх — з прычыны няспраўнага пячнога ацяплення. Найбольшая колькасць «чырвоных пеўняў» зафіксавана ў Жлобінскім раёне — чатыры. Там у вёсцы Кірава загінуў пенсіянер. А ў населеным пункце Буда-Люшаўская Буда-Кашалёўскага раёна пажар адбыўся з-за падпалу двухкватэрнага дома. Былі знішчаны дахі дома і хлява, пашкоджаны аўтамабіль і частка маёмасці.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» 23 февраля 2009 года провело внеочередное Общее собрание акционеров в форме заочного голосования с повесткой дня:

1. Об оценке стоимости неденежного вклада (зданий банка) в уставный фонд ОАО «БПС-Банк».
2. Об увеличении уставного фонда ОАО «БПС-Банк».
3. О внесении изменений в Устав ОАО «БПС-Банк».
4. Об оказании ОАО «БПС-Банк» безвозмездной (спонсорской) помощи в 2009 году.

Итоги голосования по предложенным проектам решений вопросов повестки дня в вышеуказанной последовательности:

1. «За» — 856 432 931 голос

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



	2	3			2			3		1
						3		1		2	
						4			2		4
4			1		1			4		3	

3	5			6						1	
4		2			5	1	4		2		5
5	3		1	2	6					6	4
			5				6	4	3		
	1		2	5	4		5				2
2	4					6					3

СУДОКУ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ. Прапануем некалькі невялікіх галаваломак для дзяцей. Складзены яны аналагічна тым правілам, што і традыцыйныя (9 на 9) судоку. У адных выкарыстаны лічбы ад 1 да 4 (для малодшых школьнікаў), у іншых — ад 1 да 6 (для крыху старэйшых).

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (21 лютага). Па гарызанталі: Беларусь. Муза. Лёс. Ануй. Выраб. Закон. «Тоска». Экран. Арба. Нэру. Уфа. Папа. Рупар. Аніс. Клір. Кок. Пані. Якар. Алфавіт. Старт. Зала. Указ. Ханок. Поні. Адвакат. **Па вертыкалі:** Хатынь. Паля. Сарданікс. Пірат. Сват. Час. Ратуша. Марэ. Катух. Ласунак. Капа. Зубр. Каланок. Ручай. Зона. Знахар. Кіт. Паз. Куб. Управа. Арфа. Ніл. Скарына. Арбіта.

Ёсць нагода

Цвяразае свята Земляной каровы

Фота Сіньхуа—БелТА.

З Новым годам, з новым шчасцем! Ніякай памылкі няма — гэтае віншаванне цалкам апраўданае. У колах будыстаў, для якіх новы 2009 год наступіў літаральна ўчора. Праўда, з адной агаворкай — па астралагічных разліках розных будысцкіх школ, напрыклад, Кітая, Тыбета і Японіі, новы год прыпадае на розныя даты паміж канцом студзеня і сярэдзінай сакавіка. Паводле тыбецкай школы, чый уплыў распаўсюджаны, акрамя Тыбета, у Манголіі, Кітаі, Калмыкіі, Бураціі, Туве і некаторых іншых рэгіёнах Расіі, год жаўтаваты земляной каровы наступіў сёлета 25 лютага і працягнецца да 14 лютага 2010 года.

Важна: паводле ўсходняй традыцыі, няцотныя гады лічацца жаночымі, таму вітаць трэба менавіта Карову, а не Быка. Яшчэ адна адметнасць — Новы год (па-бурацку — Сагаалган, у тыбецкім варыянце — Шагаа) наступае а пятай гадзіне раніцы.

Многія сучасныя будысты сустракаюць гэтае свята ў храме на ўрачыстым малебне, які завяршаецца абрадам заклікання ўдачы — людзі дастаюць з кашалькоў грашовыя купюры і водзяць імі ў паветры, як быццам прыцягваючы да сябе дабрабыт. Лічыцца, што асвечаныя грошы трэба ўвесь год насіць у кашальку і не траціць, тады грошы не перавядуцца.

Тыя, хто застаецца дома, а пятай раніцы могуць выйсці на вуліцу альбо прывітаць надышоўшы год нават праз расчыненую фортку, паліўшы пару кропель чорнага чаю або малака. На стале таксама павінна быць так званая «белая ежа» — з тварагом, маслам, смятанай ці малаком. Ні ў якім выпадку нельга сустракаць свята з гарэлкай ці іншымі алкагольнымі напоямі — «пітвом чарцей», на іх увечар дазвалялася толькі піва.

Абавязковай часткай святочнага стала з'яўляецца катэгарычная забарона. Новы год у будыстаў, у адрозненне ад заходніх традыцый, увогуле лічыцца самым цвярозым святам.

Акрамя таго, у будыстаў ёсць выдатны звычай: напярэдадні Новага года не толькі прыбіраць у доме, але і ўсіх яго жыхароў ачышчаць ад грахоў і бедаў, якія здарыліся за мінулы год. За два дні да асноўнага свята ладзіцца ачышчальны абрад Сор: у рытуальны касцёр ламы кідаюць так званы сор — спецыяльную прыладу ў выглядзе наканечніка стралы, зробленага з рэек, паперы, цеста і чэрапа. Гэта сімвал грахоў усёй абшчыны. Ачысціцца можа і кожны асобны прыхаджанін: кавалачкам цеста (вада і мука без усякіх дабавак) чалавек абцірае ўсю паверхню цела, пачынаючы з галавы, пры гэтым у думках укладвае ў цеста ўвесь назапашаны негатыў — хваробы, дрэнныя ўчынкі і г.д. Потым гэтыя кавалачкі загортваюцца ў тканіну ці нават проста поліэтыленавы пакет — галоўнае, больш не датыкацца да іх чыстымі рукамі — а пазней таксама спальваюцца. Ці не праўда, нагадвае нашу традыцыю спальвання чучала Масленіцы?

Дарэчы, у навагоднія дні нават жэст вітання ў будыйскай традыцыі асаблівы. Выглядае гэты старажытны абрад наступным чынам: малодшы старэйшаму (або жанчына мужчыну, калі яны аднагодкі) працягвае рукі далонямі ўверх, старэйшы кладзе зверху свае рукі далонямі ўніз, і малодшы падтрымлівае старэйшага пад локці. У гэтым жэсце выказваецца павага і абяцанне ў выпадку неабходнасці дапамагчы, падтрымаць блізкага чалавека.

А ў наступныя 15 дзён пасля свята ў храмах адбываецца яшчэ адзін абрад — запуск «коней ветру ўдачы». Гэта асаблівыя сцяжкі, спецыяльна асвечаныя, прыхаджане з малітвамі прывязваюць на дрэва альбо размяшчаюць на даху дома такім чынам, каб сцяжок развяваўся на ветры. Лічыцца, што «конь ветру ўдачы» — гэта магутная абарона ад няшчасцяў і хваробаў, а разам з тым пажаданне здароўя і шчасця ўсім жывым істотам.

Што да астралагічных прагнозаў на будучы год, якія публікуюцца ў самых розных варыянтах, то кіраўнік будыстаў Расіі Пандзіта Хамбо-лама Дамба Аюшэеў, напрыклад, лічыць, што большасць іх хітруе. Бо сапраўдны гараскоп Зурхай будыйскія астролагі заўжды складаюць для аднаго канкрэтнага чалавека. **«Скажу адно: год будзе складаным. Гэта было накананавана задоўга да пачатку сусветнага фінансавага крызісу. Таму нам трэба запасціся цярпеннем, аптымізмам і мудрасцю, берагчы здароўе — уласнае і родных, і быць гатовым многа працаваць, бо Земляная карова не дапаможа тым, хто схільны да ляноты», — адзначыў кіраўнік расійскіх будыстаў.**

Тым не менш, агульны прагноз на 2009 год (альбо 2136, у адпаведнасці з тыбецкім будыйскім календаром) расійскі Інстытут тыбецкай медыцыны і астралогіі ўсё ж зрабіў. Цяперашні год у 60-гадовым тыбецкім цыкле належыць да групы «Шасці гадоў, якія прыносяць мала добрага». Галоўнае, з чым давядзецца сутыкнуцца, папярэджваюць астролагі — гэта не толькі крызіс, выйсце з якога кожнаму давядзецца шукаць самастойна, але таксама рост злачыннасці і магчымыя лакальныя канфлікты паміж насельніцтвам і ўрадавымі войскамі ў розных краінах свету. Прычым залежнасць гэту можна будзе прасачыць з ростам тэмператур: чым цяплей будзе надвор'е, тым больш будзе праяўляцца стыхія Агню, узмацняючы ўсе негатыўныя якасці года. Але гэта сувязь будзе дзейнічаць і ў адваротным парадку, так што ў другой палове года можна спадзявацца на адносны спакой і стабільнасць.

Шукаючы спосаб захаваць свой асабісты дабрабыт, як лічаць тыбецкія астролагі, трэба звярнуцца да стыхіі года — зямлі, і набываць участак (дом, кватэру), развіваць сельскую і лясную гаспадаркі, надаваць больш увагі натуральным прадуктам.

Але пры гэтым варта памятаць, што стыхія зямлі таксама можа быць небяспечнай, асабліва ў цяперашнім выпадку: Бык, Карова — самі па сабе знакі зямлі, а сёлета яны яшчэ земляныя, гэта значыць, зямля ўздзейнічае на зямлю, і лішак гэтай энергіі можа выклікаць землятрусы, абвалы і апоўзні, пэўныя цяжкасці ў апрацоўцы глебы (што можа адбіцца на ўраджаі і адпаведна ў цэнах на харчовыя тавары). Фундаменты і сцены дамоў, асабліва калі гэта старыя збудаванні, могуць атрымаць мацныя пашкоджанні. У грамадстве таксама, калі не весці пастаянную прафілактычную работу, будуць цярпець асновы, традыцыі, устоі.

Каб змякчыць і задобрыць гаспадара года, тыбецкі гараскоп раіць свядома перайсці на вегетарыянства — калі не цалкам, то хоць бы ў большай ступені. Што ж датычыцца прыняцця важных рашэнняў і адказных учынкаў, то ў іх галоўнае — не спяшацца, але затое потым, зрабіўшы першы крок, не збочваць з абранага шляху, толькі тады атрымаецца дасягнуць поспеху.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

БУДЗЬЦЕ Ў КУРСЕ

Не верыце прадказанням тыбецкіх астролагаў і ўвогуле не любіце быкоў? Тады сустракайце новы год па іншых календарах:

Зораастрыйскі (авестыйскі) — наступіць 21 сакавіка і будзе Годам бабра;

Яўрэйскі — новы 5770 год па календары Рош Ха-Шана пачнецца толькі 18 верасня 2009 года і працягнецца да 8 верасня 2010 года;

Ісламскі — 1431 год (летавызначэнне вядзецца ад даты перасялення прарока Мухамеда з Меккі ў Медзіну) наступіць 18 снежня;

Каляндар мая — 2017 год, або 4-ы год да абнаўлення чалавецтва прыйдзе 21 снежня 2012 года. У гэты дзень Зямля і сонца ўпершыню акажуцца на адной лініі з цэнтрам нашай галактыкі.

Это ваш шанс!!!
БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИНСТИТУТ ЖУРНАЛИСТИКИ
Факультет повышения квалификации журналистских кадров объявляет набор на двухгодичную переподготовку слушателей с непрофильным высшим образованием по специальности «Средства массовой информации».
По окончании обучения выдается диплом государственного образца о присвоении квалификации «Журналист».
Зачисление по результатам собеседования.
Обучение платное заочное.
Документы принимаются до 26.03.2009 г.
Контактные телефоны: 209 57 45, 209 57 46, факс: 209 57 40, e-mail: jorn_fpk@bsu.bu

Жывая зямля

Лясная госця

На сядзібе дзеда Станіслава ў вёсцы Красоўшчына Шаркоўшчынскага раёна «прапісалася» казуля. Вяскоўцам весялей з незвычайным суседам, а жывёле — спакойна, бо вакол населенага пункта нярэдка сустракаюцца ваўчыныя сляды, а гэта сведчыць пра небяспеку. Жывёлу напачатку лета прынеслі пастухі — статак кароў гналі ў поле і напалохалі казулю-маці. А толькі што народжаная казулька ў дадатак стала ахвярай — на яе наступіла адна з рагуль. Станіслаў Іванавіч Байкоўскі, колішні ветэрынар, узяўся выходжваць небараку, падняў на ногі. За гэта казуля моцна прывязалася да свайго выратавальніка, даверліва глядзіць у вочы, адгукаецца на покліч. Як ні шкада дзеду Станіславу развітацца з лясною госцяй, ён згодны аддаць яе на догляд у заапарк.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вой, ну замучылі яны сваім крызісам! Тэлевізар уключыш — там толькі пра яго, знаёмыя ўсе пра яго гавораць, у аўтобусе нават бабулькі абмяркоўваюць курсы валют. Як учора цудоўна сказаў мой сябар — крызіс перш за ўсё ў галовах. Сёння, дарагія нашы чытачы, прапаноўваю вам сваю антыкрызісную праграму. Будзем гатаваць не для каго-небудзь, а для сябе — любімых. Усе стравы чыста хатнія, найсмачнейшыя і зусім недарагія. Паспрабуйце прыгатуйце, накрыйце вечарам стол, наліце сабе па чарачцы хатняй налівачкі і згадзіцеся, што ўсё не так ужо дрэнна. Галоўнае, каб вы, усе вашы блізкія і родныя былі здаровенькімі. Не паддадзімся біржавым спекулянтам, будзем усміхацца і радавацца жыццю! Прыемнага апетыту!

БУЛЬБЯНЫ РУЛЕТ З ГРЫБАМІ І ГАРОДНІНАЙ

Рулет атрымліваецца вельмі сочны. Каштоўным з'яўляецца тое, што ён вельмі лёгка гатуецца, посны і недарагі.

Для бульбянога цеста вазьміце: 700 г бульбянога пюрэ, 3 сталовыя лыжкі без горкі крухмалу.

Для начынкі: 250 г цыбулі, 250 г морквы, 250 г грыбоў, 1 чайная лыжка солі.

Цыбулю дробна парэзаць, моркву надзерці на сярэдняй тарцы. У патэльні разагрэць алей і пакласці цыбулю. Абсмажваць на вялікім агні пры пастаянным памешванні да лёгкай празрыстасці і пачатку размякчэння цыбулі. Усыпаць надзёртую моркву. Перамяшаць, агонь паменшыць да ніжэй за сярэдні і абсмажваць пры перыядычным памешванні да мяккасці. Грыбы дробна парэзаць або надзерці на буйной тарцы. Усыпаць грыбы ў патэльню з гародніной. Агонь прыбавіць. Перамяшаць. Смажыць прыкладна 3 хвіліны пры памешванні. Пасаліць на смак. Бульбяное пюрэ падагрэць да цёплага. Калі пюрэ вельмі жорсткае, дадаць некалькі лыжак кіпеню і добра перамяшаць, каб не было камякоў. Умяшаць крухмал. Бляху засласць паперай для выпечкі. Выкласці бульбяную масу прамавугольнікам 30х25 см. Паставіць у разагрэтую да тэмпературы 200—220 °С духоўку на 15—20 хвілін — да лёгкага зарумянвання. Бляху дастаць і па бульбяным пласце размеркаваць начынку з агародніны. Пласт асцярожна скруціць у рулет, адначасова аддзяляючы паперу. Верх рулета змазаць алеем або моцным чаем. Паставіць у духоўку на 15 хвілін.

САЛАТА «ДАНІЭЛЬ»

Нам спатрэбіцца: чвэрць сярэдняга качана капусты, 1 бляшанка кукурузы, 1 цыбуліна (лепш салодкая), 2—3 зубкі часнаку, 1 яблык (кісла-салодкі), маянэз.

Капусту нашаткаваць, памяць з соллю, заліць воцатам (6 працэнтаў) на 20 хвілін. Капуста павінна быць цалкам пакрыта вадкасцю, можна паставіць пад гнёт. На буйной тарцы надзерці вялікі яблык, нарэзаць цыбулю, пацерці або нарэзаць часнок, дадаць кукурузу. Воцат з капусты зліць, калі атрымалася вельмі кісла, можна крыху прамыць вадой. Добра адціснуць вадкасць, каб салата не атрымалася вадзяністай. Усё перамяшаць з маянэзам, дадаць соль, спецыі на смак.

ПУДЫНГ З ВАРАНЫМ МЯСАМ І СЫРАМ

Смачная і сытная хатняя страва. Калі яшчэ гарачая, то вельмі сочная. Пасля астывання соки ўсмоктваюцца ў хлеб і страва становіцца маналітнай — яе можна рэзаць на кавалкі і яна не развальваецца, хоць застаецца мяккай і не сухой.

Вазьміце: 3—4 лустачкі чорнага або белага хлеба, 150 г варанага мяса, 100 г цыбулі, 4 яйкі, 0,5 шклянкі малака ці вяршкоў, каля 70 г сыру, 1/3 — 1/4 ч. лыжкі солі, перац, пры жаданні — 1 зубок часнаку.

Форму добра змазаць маслам. З хлеба зрэзаць скарыначкі і выкласці на дно формы. Скарыначкі парэзаць маленькімі кубікамі. Цыбулю нарэзаць буйнымі паўколцамі і абсмажыць на алеі да мяккасці і вельмі лёгкага зарумянвання. Цыбулю дастаць, а ў патэльню пакласці кубікі хлеба і крыху (літаральна хвілінку) яго абсмажыць. Мяса і цыбулю прапусціць праз мясарубку. Сыр дробна нарэзаць. Змяшаць фарш, сыр і кубікі хлеба. Усё пакласці ў форму. Яйкі ўзбіць з малаком або вяршкамі, пасаліць і паперчыць. Пры жаданні для водару і вастрыні можна палажыць зубок часнаку, праціснуты праз прэс. Яечную масу роўна выліць у форму.

Паставіць запякацца пры тэмпературы 200—220 °С на 25—30 хвілін. Не дапускаць прыгарвання верху — у гэтым выпадку зацягнуць форму фольгай.

ЯДОМЫ АНЕКДОТ:

— Тата, нам у школе казалі, што ў ваенныя гады хлеб выдавалі па картках.

— Ну?

— Тата, а як яны хлеб у банкаматы запіхвалі?

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка Травой заросшая крынічка». Якуб КОЛАС.
Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 6 (295)

Якую прышчэпку выбраць?

«Хачу на слівовае дрэва зрабіць прышчэпку, калі і якім спосабам гэта зрабіць?»

М. ІВАНОЎ, *Карэліцкі раён.*

Як кажуць спрактыкаваныя садаводы, спосаб прышчэпкі залежыць ад пастаўленай мэты, пары года і стану дрэваў. Найбольш практычныя акуліроўкі ў крону пры актыўным росце дрэваў, веснавыя чаранковыя прышчэпкі ў крону спосабамі палепшанай капуліроўкі і ў бакавы зарэз, калі таўшчыня галін, на якія прышчэпліваюць, не перавышае 1 см. Калі таўшчыня іх большая, то робяцца прышчэпкі ў прыклад і ў расчэп. Падыдуць тарцовыя прышчэпкі чаранкамі за кару касым зрэзам і за кару сядлом, лепшыя ўмовы для якіх — пачатак сокаруху і добрае аддзяленне кары. Усе тарцовыя прышчэпкі за кару прыжываюцца добра, аднак, каб летам у час інтэнсіўнага росту яны не зламаліся, іх трэба падвязваць да палкі, замацаванай на прышчэпленай галіне.

Лепш за ўсё прышчэпліваць дрэвы, не старэйшыя за 5-6 гадоў — невялікая колькасць прышчэпак у іх кронах не нанясе значных траўмаў. У такіх выпадках падыдзе акуліроўка, палепшаная капуліроўка і прышчыпка ў бакавы зарэз. Апошнія два спосабы можна сумясціць, размяшчаючы прышчэпкі капуліроўкай на канцах галін, а прышчэпкі ў бакавы зарэз — крыху ніжэй. Гэтыя два спосабы можна выкарыстаць да пачатку сокаруху і адставання кары (канец сакавіка — пачатак красавіка).

Калі ж даводзіцца перапрышчэпліваць дрэвы больш старэйшага ўзросту, дзе трэба моцна ўкарочваць галіны, можна выкарыстаць спосаб прышчэпкі за кару — у тарцы зрэзаў. Робіцца гэта пасля сокаруху. Пры гэтым выкарыстоўваюць таксама спосаб акуліроўкі, капуліроўкі і ў бакавы зарэз.

Вельмі ўважліва трэба паставіцца да чаранкоў, якія выкарыстоўваюцца для веснавой прышчэпкі. Лепш браць чаранкі, нарыхтаваныя ўвосень (толькі каб не было сярод іх падапрэлых). Чаранкі зрэзаныя вясной, асабліва пасля суровых зімаў, бываюць падмерзлыя. У такім выпадку іх трэба патрымаць у цяпле да абуджэння ў іх пупышак і з'яўлення «зялёнага конуса».

Правільна выкананыя прышчэпкі добра прыжываюцца, моцна растуць і за вегетацыйны перыяд могуць дасягаць росту 0,7—1 м і больш. Парасткі перыядычна прышчыпваюць альбо выломліваюць, каб не перашкаджалі росту прышчэпленых чаранкоў. Каб пазбегнуць празмернага росту прышчэпак, дрэвы не падкормліваюць азотнымі ўгнаеннямі і не вельмі шчодра паліваюць, за выключэннем маладых дрэваў, перапрышчэпленых у год пасадкі. У працэсе росту прышчэпак дрэвы рэгулярна апрацоўваюць супраць шкоднікаў і хваробаў, а таксама перыядычна паслабляюць абвязку. Калі прышчэпка аказалася няўдалай, але паблізу яе з'явіўся добра развіты ваўчок, то яго акуліруюць летам. Калі такой магчымасці няма, то прышчэпленне паўтараюць вясной наступнага года на 5—8 см ніжэй, чым першая.

ПРАВІЛЫ ПРЫШЧЭПЛІВАННЯ:

Нажы павінны быць завостраны нібы лязо брытвы.

Усе папярочныя зрэзы галін на прышчэпе (подвоі), зробленыя сякатарам ці нажоўкай, зачысціць нажом.

Усе зрэзы на чаранках і прышчэпах выконваюцца рухам нажа на сябе.

Любы зрэз робяць адным плаўным рухам нажа, пажадана без дадатковай праўкі.

Нельга дакранацца зрэзаў на прышчэпе і прышчэпцы (подвоі і прывоі) рукамі, таму што потавыя выдзяленні з пальцаў і рэшткі садовага вару дрэнна ўплываюць на прыжывальнасць чаранкоў.

Працягласць у часе паміж устаўкай прышчэпкі і абвязкай павінна быць мінімальнай і не перавышаць 2-3 хвіліны, асабліва ў гарачы час.

Абмазку садовым варам праводзяць адразу пасля заканчэння абвязкі прышчэпкі.



1. Прышчэпка спосабам палепшанай капуліроўкі. 2. Прышчэпка спосабам у бакавы зарэз. 3. Прышчэпка спосабам акуліроўкі. 4. Прышчэпка спосабам за кару сядлом. 5. Прышчэпка спосабам за кару касым зрэзам. 6. Прышчэпка ў расчэп.

Антыстрэсавы прэпарат

Расліны, гэтак жа як і людзі, пастаянна зведваюць стрэсы. Зімой мароз рэзка змяняецца адлігай, а вясной раптам удараць замаразкі — гэта вельмі адмоўна адбіваецца на раслінах і як вынік — на ўраджаі. Эпін як стымулятар росту, і як антыстрэсавы прэпарат дапамажа раслінам перажыць рэзкія ваганні тэмпературы, а апрацаваныя ім расліны, кажуць, растуць як на дражджах.

Прымяняць эпін можна на ўсіх стадыях развіцця раслін, але спрактыкаваныя агароднікі раяць пачынаць з насення. Апрацаванае эпінам насенне хутчэй прарастае, павышаецца яго ўсходжасць. Не забудзьцеся набыць гэты прэпарат, хай ён будзе вашым памочнікам.

Пра расаду закінем слова

Каб вырасціць добры і ранні ўраджай памідораў, агуркоў, капусты і іншай агародніны, расаду выганяюць, калі на вуліцы яшчэ ляжыць снег. Практыкі кажуць, што расадным спосабам можна вырошчваць практычна ўсе агародныя культуры: капусту, памідоры, агуркі, кабачкі, патысоны, сельдэрэй, качанную салату, баклажаны, большасць шматгадовых культур.

Спачатку насенне высяваюць як звычайна ў расадныя скрынкі, напоўненыя торфаперагнойнай глебай. Пікіруюць сеянцы ў гаршочкі ці малочныя пакеты праз адзін-два тыдні пасля з'яўлення ўсходаў, калі на раслінах сфарміруецца першы сапраўдны лісцік. Без пікіроўкі можна вырошчваць расаду сельдэрэя, цыбулі і некаторых іншых культур. Поспех атрымання ранняга ўраджаю залежыць ад таго, калі высаджваць расаду на пастаяннае месца. Расаду холадаўстойлівых культур — ранняй капусты, салаты, сельдэрэю — высаджваюць у адкрыты грунт, калі глеба прагрэецца да 8—12 градусаў. Расаду цеплалюбівых культур — таматаў, перцаў, агуркоў, кабачкоў і г.д. высаджваюць пасля таго, як глеба добра прагрэецца і мінуе пагроза веснавых замаразкаў.

Расада павінна быць здаровай, прысадзістай, з добра развітымі каранямі і цёмна-зялёнымі лістамі, і абавязкова свежай. Нават нязначнае падвяданне надоўга затрымлівае рост раслін пасля высадкі, а калі расліны моцна падвянуць, напрыклад, у таматаў ападаюць першыя кветкі — гэта значыць страта ранняга ўраджаю. Глебу каля кожнай высаджанай расліны крыху ўтоптваюць, адразу ж паліваюць.

Невысокую кампактную расаду тамату саджаюць вертыкальна (прама), перарослую — нахілена.

ШТО ТРЭБА ПАМЯТАЦЬ ПРЫ ВЫРОШЧВАННІ РАСАДЫ:

- Не выкарыстоўвайце для сяўбы насення ёмістасці з дрэнным дрэнажом, ад чаго застой вады ў іх прыводзіць да гібелі насення.
- Не высявайце насенне ў шчыльную, цяжкую глебу.
- Не забывайце перад сяўбой спачатку паліць зямлю ў скрынках, інакш насенне з вадой будзе ўцягнута ў глебу і ўсходы з'явяцца неадначасова.
- Не загушчайце пасевы насення, інакш расліны будуць доўгімі, слабымі, могуць паражацца «чорнай ножкай».
- Святло і цяпло — асноўныя складнікі паспяховага вырошчвання расады. Дадаткова асвятляць расліны так, каб светлавы дзень складаў 12—14 гадзін.
- Не спазняйцеся з пікіроўкай расады. Пасля пікіроўкі расліны паліваюць і прыцяняюць на дзень-два.
- Не пакідайце расаду пасля пікіроўкі без увагі. Праз чатырыпяць дзён пасля пікіроўкі праводзяць першую падкормку. Чаргуючы мінеральныя і арганічныя ўгнаенні падкормліваюць расліны раз у дзесяць дзён.
- Не забывайцеся загартоўваць расаду перад пасадкай яе на пастаяннае месца. Саджаюць расаду вечарам альбо ў пахмурнае надвор'е.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1040. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12